

Абмяркоўваючы праект Дзяржаўнай інвестпраграмы, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што сёння экспарт становіцца найважнейшым элементам нашай эканомікі. Праз некалькі дзён гэта пытанне ўзнялі больш прадметна — у пятніцу кіраўнік дзяржавы правёў нараду па пытаннях знешнегандлёвай дзейнасці ў 2025 годзе.

# «У АСНОВЕ ПАВІННЫ ЛЯЖАЦЬ ІНТАРЭСЫ НАШАЙ ДЗЯРЖАВЫ»

## Якія кірункі супрацоўніцтва найбольш выгадныя

«У сувязі з тым, што Захад быццам бы не хоча з намі супрацоўнічаць у галіне эканомікі, мы ім абсалютна не патрэбныя са сваёй прадукцыяй, мы гэта цудоўна разумеем. Лішняя канкурэнцыя ў галіне аўтамабілебудавання, іншых галінах не ўваходзіць у павестку заходніх дзяржаў, якія падганяюцца Злучанымі Штатамі Амерыкі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, ні для каго не сакрэт, што мы больш гандлюем на ўсходнім напрамку. Пры гэтым, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, ад Захаду мы не адыходзім, там, дзе гэта выгадна, гандлюем і прадаём. Але гэта не тыя аб'ёмы і не тыя грошы. Таму пакуль перавага за ўсходнім напрамкам — Расійская Федэрацыя, Кітайская Народная Рэспубліка. Таксама, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, у гандлі з Беларуссю зацікаўлены іншыя ўсходнія дзяржавы: Пакістан, Інданезія, Паўночная Карэя... Шэраг дзяржаў выступае з прапановай сустрэцца на найвышэйшым узроўні і абмеркаваць супрацоўніцтва. «Ёсць прынцыповыя пытанні, па якіх трэба прымаць рашэнні. Гэта датычыцца ўзаемаразлікаў, паставак нашай ваеннай прадукцыі, прадукцыі для барацьбы з пажарамі. Таму я запрасіў вас для таго, каб абмеркаваць гэты спектр і кірункі нашага супрацоўніцтва. Тое, што цікавіць нашых партнёраў, найперш на Усходзе. Хоць мы ж не скажам, што Венесуэла на Захадзе не хоча з намі супрацоўнічаць. Вядома, хоча», — адзначыў Прэзідэнт. Ён расказаў, што цікавасць да нашай дзяржавы ёсць нават у прадстаўнікоў бізнес-колаў у ЗША. «Пачакаем... Мы вядзём з імі дыялог, перагаворы з Захадам па кірунках, якія нас цікавяць. Дамовімся — будзем супрацоўнічаць. Але ў аснове павінны ляжаць інтарэсы нашай дзяржавы і прыярытэты, якія мы вызначылі», — заявіў беларускі лідар.

СТАР. 2

# У КРАІНЕ — ПЯЦІГОДКА ЯКАСЦІ

## Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 17 студзеня падпісаў Указ № 31, якім 2025—2029 гады аб'яўлены пяцігодкай якасці

Яна ахоплівае ўсе сферы жыццядзейнасці дзяржавы і грамадства. Прыярытэтныя мэты пяцігодкі — далейшае павышэнне якасці жыцця людзей, канкурэнтаздольнасці беларускай эканомікі, удасканаленне грамадскіх адносін, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Пяцігодка якасці прадугледжвае ўсебаковыя пераўтварэнні, накіраваныя на дасягненне высокіх стандартаў якасці жыцця, рост дабрабыту грамадства, павышэнне эфектыўнасці эканомікі і кіраўніцкай дзейнасці, аптымізацыю вытворчых працэсаў, паляпшэнне характарыстык тавараў (работ, паслуг).

Указ вызначыў стратэгічныя задачы пяцігодкі якасці ў эканоміцы, арганізацыі жыццядзейнасці людзей, сацыяльных адносінах і ў галіне права. Гэта тыя стаўпы, якія складаюць асновы функцыянавання дзяржавы.

Сярод такіх задач — стварэнне новых сучасных прадпрыемстваў, лічбавая трансфармацыя, забеспячэнне тэхналагічнага суверэнітэту, далейшы рост даходаў насельніцтва, прымяненне справядлівай сістэмы цэнаўтварэння, павышэнне нараджальнасці і паляпшэнне дэмаграфічнага патэнцыялу.

Павінны быць забяспечаны даступнасць і высокія стандарты адукацыі, медыцынскай і сацыяльнай дапамогі, развіццё жыллёва-камунальнай, транспартнай інфраструктуры, тэлекамунікацый.

Паляпшэнню якасці жыцця людзей будзе садзейнічаць таксама далейшая дэбюракратызацыя, зніжэнне адміністрацыйнай нагрузкі на грамадзян і бізнес. Сярод задач — пашырэнне прынцыпаў здаровага ладу жыцця.

У прыярытэце пяцігодкі падтрыманне агульнанацыянальнага дыялогу, умацаванне інстытута сям'і, традыцыйных маральных каштоўнасцей, патрыятызму, павышэнне палітычнай і прававой культуры, забеспячэнне стабільнасці прававога рэгулявання.

Рэалізаваць задачы пяцігодкі якасці, зрабіць яе эфектыўнай і рэзультатыўнай можна толькі сумеснымі намаганнямі дзяржаўных органаў, арганізацый усіх форм уласнасці і грамадзян. У сувязі з гэтым будзе прадоўжана фарміраванне разумення асабістай адказнасці грамадзян за агульны вынік, за захаванне незалежнасці краіны.

Прэзідэнтам даручана ўраду сумесна з аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам прадугледзець мерапрыемствы па дасягненні задач пяцігодкі якасці ў праграмах (планах) развіцця Беларусі, галін эканомікі, рэгіёна.

Працяг тэмы на 2 СТАР.




СВЯТА МУЗЫКІ І СЯБРОЎСТВА 4



ПАСЯЎНЫ КАЛЯНДАР НА 2025-Ы 12



РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

18 СТУДЗЕНЯ 2025 г. СУБОТА № 11 (30399)


# Дом з краявідам на будучыню

## Учора ў Мінску адбылося ўрачыстае адкрыццё новага інтэрната

Свой часовы камфартабельны дом падзеляць студэнты двух універсітэтаў — БНТУ і БДТУ. Новы, з іголачкі, будынак на архітэктуры пераклікаецца са знакамітым навучальным корпусам БНТУ, які знаходзіцца побач, а ўнутры проста «дыхае» камфортам. Блокі з пакоямі на 2 або 3 месцы, у кожным — асобныя кухня, санвузел і душавы пакой. Ёсць у інтэрнаце спартыўная і трэнажорная залы, пральня, кафэ і іншыя сучасныя выгоды, якія можна пералічваць вельмі доўга, як, зрэшты, і апісваць эмоцыі студэнтаў, якія толькі ўсяліліся ў новае жыллё.









Фота Лізаветы ГОЛАД.

...У дзень адкрыцця інтэрната свой настрой маладыя людзі перанеслі на пляцоўку каля ўвахода ў іх агульны дом. Падзяліць радасць студэнтаў прыбылі высокія госці — **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА, міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ**, прафесарска-выкладчыцкі склад БНТУ і БДТУ, іншыя афіцыйныя асобы.

— Адукацыя ў жыцці кожнага чалавека займае асаблівае месца, — звярнуўся да ўдзельнікаў цырымоніі Ігар Петрышэнка. — Таму сфера адукацыі заўсёды знаходзіцца ў цэнтры ўвагі кіраўніка нашай дзяржавы і ўрада Беларусі. І менавіта таму Аляксандр Лукашэнка ў 2020 годзе прыняў рашэнне аб будаўніцтве трох інтэрнатаў і вучэбна-лабараторнага корпуса Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. Мы гэтую задачу выканалі і сёння адкрываем ужо трэці інтэрнат для Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта і Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, падзяліўшы пароўну і па-сумленнаму колькасць месцаў паміж студэнтамі дзвюх ВНУ.

Намеснік прэм'ер-міністра выказаў надзею, што ў гэтым цудоўным доме студэнцкая дружная сям'я атрымае новы зарад бадзёрасці і аптымізму, які дапаможа стаць студэнтам добрымі спецыялістамі.

— На працягу ўсёй нашай суверэннай гісторыі мы стараліся, стараемся і будзем далей развіваць і ўдасканальваць матэрыяльна-тэхнічную базу кафедраў нашых ВНУ, — працягнуў Ігар Петрышэнка. — Мы будзем адкрываць новыя спецыяльнасці і спецыялізацыі для таго, каб наша краіна з'яўлялася перадавой ва ўсіх сферах, і нам гэта вельмі важна для падрыхтоўкі магутных інжынерных кадраў. Мы стварылі належныя ўмовы для вашай вучобы, падрыхтоўкі да заняткаў — зрабілі ўсё, што дазволіць вам якасна асвойваць тую спецыяльнасць, на якую вы паступілі ў вышэйшую навучальную ўстанову.

Ён падкрэсліў, што вельмі важна, каб у гэтым сучасным і ў той жа час утульным студэнцкім доме панавалі спакой і сапраўднае студэнцкае сяброўства. Ігар Петрышэнка шчыра падзякаваў будаўнікам, якія ў рэкордныя тэрміны здалі годны будынак з добрымі абсталяванымі пакоямі, а таксама студэнтам, якія прымалі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да адкрыцця інтэрната.

— Я хачу пажадаць вам знайсці ў гэтых сценах сапраўдных сяброў, — сказаў віцэ- прэм'ер, — якія будуць ісці з вамі па жыцці, хачу пажадаць, каб вы сталі сапраўднымі грамадзянамі сваёй краіны і сапраўднымі спецыялістамі ў сваёй галіне.

Пасля перадачы сімвалічнага ключа і традыцыйнага перарэзвання чырвонай стужкі віцэ-прэм'ер, міністр адукацыі, рэктары БНТУ і БДТУ разам з запрошанымі на святочнае мерапрыемства гасцямі азнаёміліся з памяшканнямі ўнутры інтэрната — наведалі залу для аэробікі, трэнажорную залу, блок для пражывання, медыцынскі пункт, буфет.

— Умовы, якія створаны ў новым інтэрнаце, блізкія да ідэальных, — падзяліўся ўражаннямі Андрэй Іванец. — У студэнтаў ёсць усе магчымасці: асобная кухня ў кожным блоку, канферэнц-залы... Сёння вялікая ўвага ўдзяляецца здароўю нашай моладзі, таму ёсць трэнажорная зала, зала аэробікі. Гэта таксама вельмі важна для творчых і знаходлівых.

Кіраўнік адукацыйнага ведамства канстатаваў, што сёння забяспечанасць інтэрнатамі студэнтаў у Беларусі складае больш за 90 %. Што датычыцца зноў адкрытага і падобных яму інтэрнатаў, то, па словах міністра, у іх будуць засяляцца ў першую чаргу тыя, хто праявіў сябе ў вучобе, у студэнцкіх атрадах, конкурсах і іншых карысных актыўнасцях.

РАЗАМ

# САБРАНЫ МІЛЬЁНЫ РУБЛЁЎ, АЛЕ САМАЕ ВАЖНАЕ — УВАГА І КЛОПАТ

## Падведзены вынікі акцый «Нашы дзеці» і «Ад усёй душы»



Акцыя «Нашы дзеці» ахапіла больш за мільён дзяцей. Матэрыяльная дапамога ўстановам, дзе яны выхоўваюцца, вучацца ці лечацца, склала 8 мільёнаў рублёў. Больш за 550 тысяч чалавек прынялі ўдзел у акцыі «Ад усёй душы». Падчас мерапрыемстваў сабрана больш за два мільёны рублёў, якія накіраваны на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы сацыяльных пансіянатаў і бальніц сястрынскага догляду, дапамогу і падтрымку пажылых грамадзян.

СТАР. 4

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

СПЕЦЫЯЛЬНЫ РЭПАРТАЖ

# АКЦЫЯ, ЯКАЯ ДОРЫЦЬ ЭМОЦЫІ

## У Гродне стартаваў «Марафон адзінства»

Унікальная па змесце і фармаце рэспубліканская грамадска-культурная акцыя ўпэўнена крочыць па горадзе над Нёманам. Тут разгарнулася звыш 20 лакацый, у ліку якіх цікавыя выстаўкі, знакавыя сустрэчы, канцэрты, выступленні ў працоўных калектывах. Новы фармат вельмі горача вітаецца гараджанамі. А для мясцовых улад гэта своеасаблівы экзамен, да якога вельмі сур'ёзна ўсе рыхтаваліся.



**Старшыня Гродзенскага гарвыканкама Андрэй ХМЕЛЬ** падчас кароткага брыфінгу адзначыў, што горад вельмі доўга чакаў гэта свята, і вось дзень настаў. «Наш горад — гэта жамчужына Беларусі, таму мы не маглі неяк не выдзеліцца, дзякуй усім арганізатарам!» — падкрэсліў мэр. Ён таксама акцэнтаваў увагу на тым, што жыццё ў горадзе мяняецца ў адпаведнасці з усёй краінай. «Усе мы памятаем, як пачыналася станаўленне суверэннай Беларусі, з якімі цяжкасцямі мы сутыкнуліся. Дзякуючы моцнаму лідару, вакол якога згуртаваўся народ, мы зрабілі крок далёка наперад. Гэта відавочна па развіцці прадпрыемстваў, сацыяльнай сферы, і сёння Гродна ў многіх пазіцыях трымае лідарства. А гэта немагчыма без агульнай працы, адзінства нацыі», — выказаў меркаванне Андрэй Хмель. Таксама журналісты даведаліся і аб найбліжэйшых планах па будаўніцтве знакавых аб'ектаў і дарог. Праз тры гады Гродна адзначыць 900-гадовы юбілей, і будаўніцтва пашырыцца.

Незвычайна і яскрава пачаўся працоўны дзень на ААТ «Белкард». Тут у рамках «Марафону адзінства» сустракалі праект «Разам працуем, разам спяваем». Па словах **дырэктара прадпрыемства Андрэя ЯНАЧКІНА**, наўрад ці хто памятае, каб артысты выступалі ў цэху, сярод станкоў: «Гэта падзея аб'ядноўвае нас, працоўныя калектывы, прадпрыемствы, гарады, а ў цэлым — нашу любімую Беларусь».

СТАР. 4

# «У аснове павінны ляжаць інтарэсы нашай дзяржавы»



Фота БелТА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Такое кола пытанняў са спасылкай на канкрэтныя дзяржавы і сталі тэмай нарады. «Чаго тут скрываць, Сірыя прапануе нам супрацоўніцтва, просіць, каб нашы службовыя асобы прыехалі перагаварыць, вызначыцца. Афганістан таксама зацікаўлены ў нашай прадукцыі. Няпростая сітуацыя ў абедзвюх дзяржавах. Я не называю іншыя афрыканскія дзяржавы, каб нашы «сокалы» не наляцелі на іх і не пачалі ціснуць. Але з дзясятак дзяржаў, якія гатовы з намі супрацоўнічаць. Нам гэта трэба? Трэба. Ці зможам мы задаволіць іх запыты? Цяжка сказаць, не такая ў нас гіганцкая эканоміка. Але будзем рухацца», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## У тэму

У размове з журналістамі **прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА** расказаў, што на нарадзе ішла размова ў асноўным аб тактыцы работы па асобных напрамках знешнеэканамічнай дзейнасці. «Не сакрэт, і Прэзідэнт аб гэтым сказаў, што ёсць пул краін, якія, як і мы, зацікаўлены ў развіцці адносін ва ўсіх галінах ад ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва да інвестыцыйнага, банкаўскага і гэтак далей. Паміж гэтымі пазіцыямі ляжыць вялікі пласт гандлю, інвестыцый, сумесных праектаў. Многія з іх носяць даволі комплексны і стратэгічны характар. Таму тут далучаюцца ўсе структуры дзяржаўнай улады і кіравання, пачынаючы ад сілавікоў і заканчваючы фінансістамі», — сказаў ён. Паводле слоў Рамана Галоўчанкі, на нарадзе абмяркоўвалася супрацоўніцтва з партнёрамі ў Афрыканскім, Азіяцкім рэгіёнах і канкрэтныя тактычныя задачы, якія трэба будзе вырашыць і грамадзянскаму, і сілавому блоку ў найбліжэйшы час, каб атрымаць ад гэтага значны эфект.

Журналісты спыталі, якой бачыцца работа на заходнім вектары. «Прэзідэнт неаднаразова гаварыў, што мы гатовы рэанімаваць або аднавіць паўнацэннае эканамічнае супрацоўніцтва з Захадам у любы момант. Не трэба ім гэта цяпер, хочуць яны пераплачваць на шкоду сваёй эканоміцы за нейкія міфічныя каштоўнасці — няхай будзе так. Гандлёвы абарот з Захадам ідзе па тых пазіцыях, якія не знаходзяцца ў сферы санкцыйнага ўздзеяння, — адзначыў Раман Галоўчанка. — Еўрапейскі бізнес у рабоце з намі зацікаўлены. І мы атрымліваем не проста сігналы, а пэўныя прапановы па рабоце там, дзе гэта для нас выгадна. І магчыма мы іх рэалізуем».

> **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА:**
>
> *— Я ўжо неаднойчы казаў: будучы 2025 год будзе няпростым. Не толькі таму, што разам з Расіяй нас пачалі ціснуць і душыць з усіх бакоў. Пакуль тыя тактыка і стратэгія, якія мы вызначылі, дапамагаюць нам не толькі ўтрымацца на плаву, але і жыць годна.*
>
> **7 студзеня 2025 г., падчас наведвання храма Мікалая Цудатворца ў Лагойску.**

ЗАДАЧЫ І РАШЭННІ

# СТАЎКА — НА РАЗВІЦЦЁ

## Прэм'ер-міністр падвёў вынікі работы эканомікі за 2024 год

Кіраўнік беларускага ўрада Раман Галоўчанка расказаў аб ключавых паказчыках, устаноўленых Кіраўніком дзяржавы. Спойлер — вынікі вельмі нават станоўчыя.

### НАПРУЖАНАЕ, АЛЕ ЦАЛКАМ ВЫКАНАЛЬНАЕ ЗАДАННЕ

Па росце ВУП, напрыклад, пры заданні 103,8 % спрацавалі на 104 %.

— Мы цяпер ужо можам падвесці некаторыя вынікі. Больш глыбока мы іх, вядома, разгледзім крыху пазней, калі прыйдзе інфармацыя з усіх узроўняў. Але ключавыя макраэканамічныя лічбы ўжо вядомыя — Белстат іх падвёў, — пазначыў у пачатку пасяджэння Раман Галоўчанка.

Ён нагадаў, што ў 2024 год эканамічны блок краіны ўваходзіў з досыць напружаным заданнем, якое было ўстаноўлена ўказам Прэзідэнта:

— Кіраўнік дзяржавы падкрэсліваў, што гэта напружанае, але цалкам выканальнае заданне. І, зыходзячы з гэтых установак, мы, як вы памятаеце, ва ўрадзе сфарміравалі своеасаблівы мабілізацыйны план, які быў накіраваны на выкананне гэтых задач і каскадзіраваўся фактычна па ўсіх галінах эканомікі, спускаючыся да кожнага асобнага прадпрыемства.

Прэм'ер-міністр растлумачыў:

— Гэта значыць, сістэма агульнадзяржаўных паказчыкаў разбівалася на больш дробныя фрагменты і кожны кіраўнік (ад прамысловага гіганта да невялікага камунальнага прадпрыемства) ведаў, якая перад ім стаіць задача. Адпаведна, урад забяспечваў штотыднёвы маніторынг выканання гэтых задач. Прымаліся шматлікія тактычныя рашэнні (дзесьці бачылі — неабходна было падтрымаць, дзесьці, наадварот, напружыць).

Раман Галоўчанка падкрэсліў: дзякуючы гэтай працы і ўстаноўкам Прэзідэнта, які пастаянна трымаў у фокусе ўвагі сітуацыю ў эканоміцы краіны, былі атрыманы пэўныя вынікі, якія, на яго думку, можна назваць дастаткова нядрэннымі:

— Такім чынам, ключавы паказчык ступені развіцця эканомікі ў краіне — валавы ўнутраны прадукт. Заданне па ім было 103,8 %. Па факце мы спрацавалі на 104 % роўна.

### РОСТ РЭАЛЬНЫХ НАЯЎНЫХ ДАХОДАЎ — 9,5 %

Таксама Раман Галоўчанка расказаў аб напружанай задачы па інфляцыі:

— Задача была пастаўлена, каб інфляцыя не выйшла за 6-працэнтны ўзровень. Гэта было досыць нялёгка, таму што праінфляцыйны ціск, асабліва ў перыметры вакол нас, захоўваўся досыць моцна. Плюс мы забяспечылі істотную дабаўку ў заробках, у даходзе насельніцтва, што, па вядомых эканамічных законах, таксама аказвае ўплыў на інфляцыю. Аднак пры задачы 6 % фактычна інфляцыя склала 5,2 %.

Прэм'ер-міністр адзначыў, што ва ўмовах цэнавай стабільнасці і адносна нізкай інфляцыі эканамічны рост дазваляе вырашаць ключавую задачу — павышэння даходаў насельніцтва.

— Рэальныя наяўныя даходы насельніцтва — гэта не толькі заработная плата, гэта і пенсіі, і стыпендыі, і дапамогі, усе іншыя віды сацыяльных выплат. Таму план быў 3,5 %, па факце — 9,5 % — гэта найлепшы паказчык за ўсю пяцігодку. Пры гэтым рэальная заработная плата (гэта значыць, калі мы бяром толькі заработную плату без пенсій і дапамог) вырасла яшчэ больш — на 12 працэнтных пунктаў. І па выніках студзеня — лістапада ўзровень заработнай платы склаў больш за 2200 рублёў, — агучыў даныя Раман Галоўчанка.

Акрамя таго, ён нагадаў, што ў 2024 годзе двойчы павышаліся працоўныя пенсіі для пенсіянераў: з 1 лютага — на 10 %, з 1 кастрычніка — яшчэ на 5 %.

— Такім чынам, рэальны рост пенсій па ўзросце (толькі пенсій) склаў 109,6 %, — акцэнтаваў увагу кіраўнік урада.

### ПЛАН ПА РОСЦЕ ІНВЕСТЫЦЫЙ ПЕРАВЫКАНАНЫ АМАЛЬ У ТРЫ РАЗЫ

Ён таксама звярнуў увагу на тое, што вельмі важным, акрамя ВУП, з'яўляецца паказчык якаснага росту эканомікі — гэта інвестыцыі і іх структура.

— Калі казаць у цэлым па інвестыцыях, то пры заданні ў 103,9 % інвестыцыі склалі 108 %. Гэта значыць, фактычна ў тры разы перавысілі план, — падкрэсліў Раман Галоўчанка.

Прэм'ер-міністр таксама спыніўся на структуры інвестыцый:

— Гэта вельмі важны паказчык, які дэманструе, куды ідуць грошы, якія інвестуюцца ў эканоміку (тут і бюджэтныя інвестыцыі, і прамыя замежныя інвестыцыі, і інвестыцыі прыватных асоб і арганізацый). Можна з упэўненасцю сказаць, што структура інвестыцый палепшылася. Большая частка іх накіроўваецца ў абсталяванне і тэхналогіі (гэта значыць, у актыўную частку вытворчых фондаў) — рост долі інвестыцый у машыны і абсталяванне перавысіў 40 %.

Прэм'ер-міністр растлумачыў, што ў цяперашні час у краіне актыўна развіваецца больш за восем сотняў камерцыйных праектаў на суму больш за восем мільярдаў рублёў.

— Гэта толькі тое, што алічбавана і знаходзіцца на кантролі ва ўрадзе, — дапоўніў ён. — Цэнтрам прыцягнення інвестыцый сталі як традыцыйныя для нас зоны (як беларуска-кітайскі індустрыяльны парк «Вялікі камень», дзе штогод рэгіструюцца новыя рэзідэнты; свабодныя эканамічныя зоны, якія з'яўляюцца традыцыйна інвестыцыйна прывабнымі), так і спрацоўвае наша стаўка на развіццё тэхнапаркаў. Днямі Прэзідэнт пра гэта гаварыў пры наведванні Мінскага мотавелазавода.

Кіраўнік урада нагадаў: яшчэ два гады таму ў краіне было прынята рашэнне, што тэхнапаркі неабходна развіваць не толькі ў Мінску, але і ў рэгіёнах.

— У прыватнасці, у Пінску і ў Баранавічах цяпер актыўна ідзе будаўніцтва інфраструктуры для новых тэхнапаркаў. Адпаведна, гэта цягне за сабой павелічэнне дабаўленай вартасці прадукцыі, што выпускаецца, і колькасці працоўных месцаў, — пракаментаваў ён.

### ЧАРГОВЫ РЭКОРД: ЭКСПАРТ — КАЛЯ 50 МЛРД ДОЛАРАЎ

Падводзячы вынік выканання мэтавых паказчыкаў, ён адзначыў, што чатыры паказчыкі выкананы і перавыкананы, а адзін паказчык, хутчэй за ўсё, будзе недавыкананы:

— Гаворка ідзе пра экспарт, — патлумачыў Раман Галоўчанка і дадаў, што лічбы па ім статыстыка дае крыху пазней. Цяпер мы ведаем статыстыку за 11 месяцаў, гэта 103,8 %. Мяркуем, што прыкладна на гэтай жа лічбе складзецца і год. Гэта крыху менш, чым план. Але, тым не менш, гэта рэкордная лічба ў абсалюце: практычна мы выйдзем на 50 мільярдаў долараў экспарту ў бягучым годзе.

Прэм'ер-міністр акцэнтаваў увагу, што яшчэ адзін важны фактар, які спрыяў падтрыманню попыту на беларускую прадукцыю, — актыўная дзейнасць на знешніх рынках.

— Паводле вынікаў 11 месяцаў краіна экспартавала тавараў больш чым на 45 мільярдаў долараў ЗША, што з'яўляецца рэкордным значэннем за апошнія 12 гадоў. Гэта, нагадаю, ва ўмовах санкцый, вар'яцкай лагістыкі, росту выдаткаў і гэтак далей, — пракаментаваў Раман Галоўчанка.

Ён адзначыў, што да ўзроўню 11 месяцаў мінулага года экспарт вырас на 3,8 %, або на 1,7 мільярда долараў.

— Ёсць пэўная тэндэнцыя, якая звязана з невялікім павелічэннем дэфіцыту гандлёвага балансу. Звязана гэта ў першую чаргу з тым, што цэны на сыравіну і матэрыялы растуць значна хутчэй, чым цэны на гатовую прадукцыю, — расказаў ён, патлумачыўшы, што цяпер сітуацыя выпраўляецца. — Гэта значыць, мы бачым, што гэтыя нажніцы сціскаюцца. Гэта дазволіць нам, думаю, сёлета праблему зняць. Тым не менш мы яе бачым і аналізуем.

Кіраўнік урада нагадаў, што беларуская прадукцыя экспартавалася ў 154 краіны свету:

— Гэта значыць, практычна наша татальная прысутнасць ёсць у сусветным гандлі. Пры гэтым у 2024 годзе ўпершыню была пастаўлена прадукцыя ў 14 новых дзяржаў. У асноўным гэта краіны Афрыкі і так званага глабальнага Поўдня. Прычым пастаўкі ў некаторыя краіны Афрыкі выраслі ў разы.

Ён таксама нагадаў аб адной з выразных установак Прэзідэнта — павялічваць гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва і развіваць яго з краінамі глабальнага Поўдня, уключаючы Афрыканскі кантынент.

— Нядрэнна спрацавалі на рынках нашых традыцыйных партнёраў — краін Еўразійскага эканамічнага саюза, дадаўшы некалькі працэнтных пунктаў у пастаўцы ў ЕАЭС.

### АБ ЗАДАЧАХ НА 2025 ГОД

Што датычыцца задач, вызначаных адпаведным указам Прэзідэнта, Раман Галоўчанка падкрэсліў:

— Кіраўнік дзяржавы глыбока валодае сітуацыяй у эканоміцы (як у нас у краіне, так і ў свеце), таму мы падзяляем, безумоўна, ацэнку. Яна аб'ектыўная. Тое, што год будзе складаны, няпросты, звязана не толькі з нашымі асноўнымі эканамічнымі партнёрамі, але і з агульнай сітуацыяй у сусветнай эканоміцы, якая застаецца складанай.

Ён растлумачыў, што ва ўрадзе свядома ідуць на напружаныя лічбы задання, якія стаяць у бягучым годзе.

— Але яны рэалістычныя. Дасягаць іх будзем такімі ж метадамі, якія пацвердзілі сваю эфектыўнасць у бягучым годзе, — гэта эканамічная мабілізацыя ў першую чаргу. Таму будзем працаваць напружана над выкананнем гэтай задачы. У нас іншага шляху няма, — адзначыў прэм'ер-міністр.

МЕРКАВАННІ

# «ЯКАСЦЬ ПАВІННА СТАЦЬ РУХАВІКОМ УСІХ ПРАЦЭСАЎ»

Абвешчаная ўказам Прэзідэнта пяцігодка якасці стане лагічным працягам таго, над чым беларусы разам са сваім лідарам працуюць ужо трыццаць гадоў — каб жыць у нашай любімай краіне было мірна, спакойна, зручна і прыгожа. Падпісаны ўчора Аляксандрам Лукашэнкам дакумент можна назваць без перабольшвання дэкларацыяй жыцця беларусаў на найбліжэйшыя пяць гадоў. Прыярытэтнымі мэтамі найбліжэйшых пяці гадоў названы далейшае павышэнне якасці жыцця людзей, канкурэнтаздольнасці беларускай эканомікі, удасканаленне грамадскіх адносін. Самыя важныя рэчы для дабрабыту грамадзян і захавання незалежнасці. Указ, несумненна, рэзанансны, указ і для органаў улады, і для кожнага жыхара Беларусі — кіраўніцтва да дзеяння. Трэба выконваць, трэба працаваць, трэба старацца. Як жа інакш? Для саміх сябе старацца, для сваіх дзяцей, для іх будучыні, для краіны, у якой жывём мы і будуць жыць наступныя пакаленні. Самы моцны стымул, праўда?

### «БЕЛАРУСЫ — ЛЮДЗІ СА ЗНАКАМ ЯКАСЦІ»



**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры Валерый МАЛАШКА** лічыць, што па-іншаму і быць не можа: «Неаднаразова тэма якасці ў той ці іншай меры гучала ў выступленнях Прэзідэнта на кожным Усебеларускім народным сходзе, прапісвалася ў праграмах сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі, але, напэўна, менавіта сёння мы ўжо выйшлі на той узровень развіцця і грамадскіх адносін, калі гэта павінна стаць рухавіком працэсаў, якія адбываюцца і ў грамадскім жыцці, і ў рэальным сектары эканомікі».

Парламентарый прызнаецца: для яго гэта такі ключавы момант у частцы таго, што якасць асабістага ўдзелу ва ўсіх працэсах, у тым ліку ў парламенцкай дзейнасці, ужо не проста лозунг. «Гэта генетыка, якой мы сілкуемся, — гаворыць Валерый Малашка. — Па-іншаму і быць не можа. Павінна быць толькі якасць. Трэба, каб гэтаму садзейнічала не толькі асабістая работа, але і работа калег, якія працуюць у гэтым жа кірунку. Вельмі важна, што мы, дэпутаты восьмага склікання, вельмі арыентаваныя на сваіх выбаршчыкаў».

Як адзначыў дэпутат, Беларусь сёння — краіна высокаінтэлектуальная, развітая, вядомая ва ўсім свеце. Нас пазнаюць праз тую прадукцыю, якую мы выпускаем, праз усе тыя міждзяржаўныя працэсы, у якіх мы ўдзельнічаем. Што датычыцца міждзяржаўных грамадскіх працэсаў, то мы заўсёды канкрэтна выказваем свой пункт гледжання. І, што важна, гэта таксама пра якасць, мы ніколі не здраджваем першапачаткова абраным арыенцірам. «І прыклад у гэтым паказвае наш Прэзідэнт. Лічу, што гэта таксама якасць нашага пастаянства, — гаворыць Валерый Малашка. — Пастаянства сяброў, вернасці ў адносінах і абавязацельствах, узятых на сябе. Гэта, на мой погляд, важныя складнікі, якія характарызуюць і Прэзідэнта, і нашу краіну».

Як урач-прафесіянал згадаў парламентарый і сферу аховы здароўя: «Мадэрнізуючы сёння ўстановы медыцынскага профілю, укараняючы сучасныя тэхналогіі ў аказанні медыцынскай дапамогі насельніцтву, як на пярвічным этапе, так і на базе высокатэхналагічных цэнтраў, мы выразна канстатуем, і статыстыка пра гэта кажа, — сёння мы не проста якасна, а высокаэфектыўна аказваем медыцынскую дапамогу жыхарам краіны. Зразумела, што пакуль пра ідэал казаць рана, але мы ведаем, над чым трэба працаваць. Напрыклад, над інфарматызацыяй: ёсць такі раздзел у сістэме аховы здароўя, які сёння пакуль не ў поўнай меры адпавядае запытам медыцынскай суполкі».

На яшчэ адну важную тэму ў сацыяльнай сферы варта таксама паглядзець праз прызму якасці, лічыць Валерый Малашка: «Гэта позні шлюбы, нізкія паказчыкі нараджальнасці. Сёння мы павінны ў гэтай частцы скарэкціраваць і нашу сацыяльную палітыку, і маладзёжную, у тым ліку ідэалагічны і духоўны складнікі беларускага грамадства, зрабіць перанастройку гэтых арыенціраў, якія прыйшлі з заходніх ідэалогій. Мы павінны ўспомніць якасць беларусаў, якія заўсёды ўсе пытанні вырашалі ў сям'і, талакой. А тое, што беларусы — людзі са знакам якасці, — гэтую высокую планку Прэзідэнт задаў нам яшчэ ў 1990-я гады. І нам усім трэба ёй адпавядаць».

### ГАЛОЎНАЕ — НЕ ЗБАЎЛЯЦЬ НАБРАНЫЯ ТЭМПЫ



Зрабіўшы якасць неад'емнай часткай іміджу Беларусі як краіны, займацца ёй неабходна пастаянна і ва ўсіх напрамках, лічыць **Алена МАРГУНОВА, старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі.**

«Для нашай экспартна арыентаванай эканомікі якасць з'яўляецца яе асновай, драйверам росту, іміджавым складнікам і сацыяльнай адказнасцю, — лічыць яна. — Таму аб'яўленне пяцігодкі якасці — вельмі правільны працяг Года якасці.

> **Самае галоўнае сёння — не змяншаць набраныя тэмпы, працягваць шлях да ўдасканалення якасці і паляпшэнняў, ставіць новыя арыенціры».**

Алена Маргунова паведаміла, што новыя задачы, накіраваныя на садзейнічанне рэальнаму сектару ў гэтай сферы, знойдуць адлюстраванне ў стратэгіі дзейнасці Дзяржстандарта да 2030 года, работа над якой цяпер актыўна праводзіцца. Дакумент будзе ўключаць тыя глабальныя напрамкі, якія дадуць магчымасць забяспечыць удасканаленне арганізацыйнай сістэмы Дзяржстандарта, пашырэнне міжгаліновага ўзаемадзеяння ў пытаннях абароны ўнутранага рынку (у тым ліку беларускіх брэндаў ад фальсіфікацый), зняцця тэхнічных бар'ераў пры экспартных пастаўках айчыннай прадукцыі, а таксама далейшае развіццё інфраструктуры якасці. Адначасова пачнецца напрацоўка прыярытэтаў дзейнасці ў рамках праграмы «Якасць» на наступны часавы перыяд (2026—2030 гг.).

Сёння выкананне прадпрыемствамі сучасных стандартаў, удзел у іх распрацоўцы, развіццё вымяральнай і выпрабавальнай базы — тыя базавыя складнікі, без якіх дасягнуць высокай якасці і яе прызнання немагчыма, падкрэсліла кіраўнік Дзяржстандарта.

### НЕ ТОЛЬКІ АДУКАЦЫЯ, АЛЕ І ВЫХАВАННЕ



Сярод асноўных пасылаў указа аб пяцігодцы якасці асобна прапісана падтрыманне традыцыйных маральных каштоўнасцей. **Міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Андрэй ІВАНЕЦ** лічыць, што тут важная роля адведзена педагогам:

— Аб'яўленая Прэзідэнтам Беларусі пяцігодка якасці вызначае для ўсіх нас прыярытэты далейшага развіцця краіны, у тым ліку і ў такой найважнейшай сферы, як адукацыя. Менавіта ва ўстановах адукацыі, пачынаючы ад дзіцячых садкоў, фарміруецца грамадская самасвядомасць юных беларусаў, прывіваюцца такія каштоўнасці, як любоў да Радзімы і да сваёй сям'і, патрыятызм і павага да гістарычнай памяці. Таму ў сваёй штодзённай дзейнасці Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь задачай нумар адзін, як і раней, вызначае павышэнне якасці адукацыі як у працэсе навучання, так і ў выхаваўчым аспекце.

Міністр падкрэслівае, што дзяржаўная палітыка ў галіне адукацыі знаходзіць асаблівую падтрымку кіраўніцтва краіны: «Асноўныя кірункі ўдасканалення нацыянальнай сістэмы адукацыі разглядаюцца на Рэспубліканскім педагагічным савеце з удзелам Прэзідэнта. Сярод іх — даступнасць, павышэнне якасці, практыкаарыентаванасць, укараненне інавацыйных тэхналогій і методык, распаўсюджванне прынцыпу інклюзіі».

«Краіна ступіла з Года якасці ў пяцігодку якасці. Гэта значыць, абраны кіраўніцтвам дзяржавы шлях далейшага нарошчвання якасных паказальнікаў па ўсіх галінах эканомікі краіны, сацыяльнай і іншых сфер жыцця нашага грамадства будзе працягвацца», — рэзюмуе Андрэй Іванец.

### МАГЧЫМАСЦЬ ДЛЯ КОЖНАГА ПРАЯВІЦЬ СЯБЕ



«Павышэнне эфектыўнасці, прадукцыйнасці і канкурэнтаздольнасці прадукцыі і паслуг, — гэта і ёсць паляпшэнне якасці. І менавіта гэта спрыяе развіццю эканомікі і грамадства ў цэлым», — адзначае **намеснік міністра прамысловасці Андрэй КУЗНЯЦОЎ.**

Але якасць нават для прамысловых прадпрыемстваў ляжыць не толькі ў плоскасці эканомікі, лічыць ён. «Гэта не толькі надзейнасць, эксплуатацыйныя і спажывецкія ўласцівасці прадукцыі, — гаворыць Андрэй Кузняцоў. — Канешне, перад прадпрыемствамі стаіць задача павышаць прадукцыйнасць працы, скарачаць выдаткі, удасканальваць сістэму кіравання і карпаратыўную культуру. Але не менш важна і развіваць кадравы і творчы патэнцыял, эфектыўна матываваць работнікаў, ствараць спрыяльны сацыяльна-псіхалагічны клімат у працоўных калектывах».

Рэалізацыя ініцыятыў пяцігодкі якасці залежыць ад актыўнай пазіцыі кожнага чалавека, кожнага работніка. «Прэзідэнт Беларусі пастаянна падкрэслівае, што ў сваёй дзяржаве мы — адна вялікая сям'я, у якой ад працы кожнага грамадзяніна, яго ведаў, адказнасці залежаць сіла і росквіт усіх. Беларусы — працавіты народ, і ў яго адзінстве — вялізная перавага. Сваю адказнасць за росквіт роднай зямлі кожны павінен праяўляць у канкрэтных справах. І пяцігодка якасці — найлепшая магчымасць для кожнага праявіць сябе, паказаць свае здольнасці», — лічыць намеснік міністра прамысловасці.

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# ШЧЫРАЯ РАЗМОВА Ў АДКАЗНЫ ПЕРЫЯД

**Ігар СЕРГЯЕНКА з рабочым візітам наведаў Браслаўшчыну**

Старшыня Палаты прадстаўнікоў сустрэўся з дэпутатамі Браслаўскага райсавета. Галоўнай тэмай размовы стала будучая электаральная кампанія. Ігар Сергяенка засяродзіў увагу на тым, што тэма інфармацыйнай бяспекі сёння з'яўляецца адной з самых важных.

«Для генерацыі фэйкаў у некаторых краінах існуюць спецыяльныя інфармацыйныя цэнтры, якія для распальвання сітуацыі ў свеце рыхтуюць пастановачныя фотаматэрыялы, відэаролікі, у якія вераць людзі. З гэтага можна зрабіць выснову, што ў цяперашні час ваенныя дзеянні спалучаюцца з вайной у інфармацыйным полі», — сказаў спікер.

На пасяджэнні Браслаўскага райвыканкама з удзелам Ігара Сергяенкі былі разгледжаны пытанні эфектыўнасці функцыянавання сістэмы аховы здароўя на аснове даступнасці і якасці аказання медыцынскай дапамогі для шырокіх слаёў насельніцтва Браслаўскага раёна, выдзялення зямельных участкаў і садзейнічання занятасці насельніцтва.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў падкрэсліў, што правальных пазіцый у сферы аховы здароўя Браслаўшчыны няма. «Усё знаходзіцца ў прывабным стане, тут працуюць выдатныя актыўныя спецыялісты. За гэты ўчастак работы ў Браслаўскім раёне я магу быць спакойны», — сказаў спікер.

Павышэнню якасці медыцынскіх паслуг кіраўніцтва краіны ўдзяляе шмат увагі. У планах на 2025 год — працягнуць будаўніцтва дзіцячага анкагематалагічнага цэнтра ў Бараўлянах, узвесці там жа новы корпус дзіцячай хірургіі, а таксама пабудаваць новы корпус рэабілітацыі спецыялізаванай бальніцы ў Аксакаўшчыне. Усяго за 30 апошніх гадоў у Беларусі пабудавана 923 аб'екты аховы здароўя.

Фінальным мерапрыемствам рабочай паездкі на Браслаўшчыну стала дыялогавая пляцоўка «Час тваіх магчымасцяў», у якой узялі ўдзел члены Савета працоўнай моладзі раёна і члены патрыятычнага клуба «Сокал» Відзаўскага дзяржаўнага каледжа. Падчас адкрытага дыялогу з моладдзю Ігар Сергяенка расказаў аб сітуацыі ў краіне і важнасці будучых выбараў Прэзідэнта. Спікер заўважыў, што ў бягучым годзе на 17 % будуць павялічаны расходы на сістэму адукацыі. Адной з цэнтральных тэм гутаркі стала размова пра захаванне гістарычнай памяці, якая нас аб'ядноўвае.

«Перапісаць праўду аб тых складаных гераічных часах, аб Вялікай Айчыннай вайне вельмі лёгка. Паглядзіце, што цяпер адбываецца ў суседняй Польшчы: там завяршаецца дэмантаж помнікаў героям-вызваліцелям Савецкай Арміі, якая разграміла фашызм і выратавала народы ад зняволення. Там забылі, што 600 тысяч савецкіх салдат загінулі за вызваленне Польшчы. Таму наша задача, усіх прагрэсіўных грамадзян Беларусі, — абараніць і захаваць гістарычную праўду», — заключыў Старшыня Палаты прадстаўнікоў.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

САЦЫЯЛЬНЫ КЛОПАТ

# МАЛЕНЬКІМ БЕЛАРУСАМ — АСАБЛІВАЯ ЎВАГА

**У Клінічным радзільным доме Мінскай вобласці абнавілі педыятрычны корпус**

Да рэканструкцыі ў будынку размяшчаўся корпус рэабілітацыі. Працавала дзіцячая рэанімацыя, але знаходзілася яна ў непрыстасаваных умовах, займала толькі палову паверха. Цяпер, калі гэта ўжо педыятрычны комплекс, пад дзіцячую рэанімацыю адведзены ўвесь паверх. «Гэта дазволіла павялічыць ложкавую магутнасць рэанімацыі і ўзяць на сябе 80—90 % усіх заўчасных родаў у Мінскай вобласці», — расказаў галоўны ўрач установы Пётр Масько.

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый КРУТОЙ,** азнаёміўшыся з работай абноўленага корпуса, адзначыў: «Днямі, разглядаючы дзяржаўную інвестыцыйную праграму, наш Прэзідэнт звярнуў увагу на аб'екты аховы здароўя і ў прыватнасці на рэканструкцыю нашага асноўнага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця». Установам, у якіх з'яўляюцца на свет маленькія беларусы, — асаблівая ўвага дзяржавы. «Беларусь займае лідарскія сусветныя пазіцыі па нізкім узроўні дзіцячай смяротнасці, — заўважыў Дзмітрый Крутой. — Наш Прэзідэнт кожнае дзіця, кожны складаны выпадак з паталогіямі разглядае індывідуальна. Таму, вядома, ва ўрачоў падобных устаноў асаблівая адказнасць, у тым ліку перад лідарам краіны». Па словах кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, увага да выходжвання неданошаных дзяцей, да праблем, звязаных з гэтай складанай тэмай, застанецца сярод сацыяльных прыярытэтаў. Дзмітрый Крутой дадаў, што апошнія пяць гадоў дзяржава істотным чынам перакроіла бюджэт і выдзеліла вялікія грошы на медыцыну: яны ідуць на высокатэхналагічнае абсталяванне, рэканструкцыю і развіццё ФАПаў, перасоўных медыцынскіх цэнтраў, міжраённых клінік. Плюс рэканструкцыя, будаўніцтва класічных медыцынскіх устаноў і іх абсталяванне. «Людзі ўдзячныя, урачы ўдзячныя. І, вядома, гэтая палітыка будзе працягвацца і далей, але эфектыўнасць выкарыстання гэтых рэсурсаў цяпер выходзіць на першы план», — сказаў Дзмітрый Крутой. Ён дадаў, што Клінічны радзільны дом Мінскай вобласці — гэта, без перабольшання, цэнтр сусветнага ўзроўню, які, як пацвярджаюць урачы, і далей працягне выконваць свае важныя функцыі.

**Старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН** адзначыў, што да рэканструкцыі іншых будынкаў абласнога радзільнага дома будзе прымяняцца дыферэнцыраваны падыход: дзе можна нешта выканаць без праекта, а дзе патрэбен складаны рамонт. «Будзем рухацца, самае важнае — прыняць правільнае рашэнне», — сказаў ён, паведаміўшы, што ў бягучы і капітальны рамонты ўстаноў аховы здароўя вобласці ў апошнія два гады ўкладзена 100 мільёнаў рублёў.

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

26 студзеня 2025
ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# ПРАЗРЫСТА І Ў АДПАВЕДНАСЦІ З ЗАКАНАДАЎСТВАМ

**Хутка пачне работу Цэнтр грамадскага назірання за выбарамі**

З першага дня датэрміновага галасавання — 21 студзеня — пачне работу Цэнтр грамадскага назірання за выбарамі, дзе будзе акумулявацца інфармацыя ад назіральнікаў аб ходзе галасавання і магчымых пазаштатных сітуацыях. Прадстаўнікі найбуйнейшых грамадскіх аб'яднанняў, палітычных партый краіны зноў аб'ядноўваюць намаганні для сумеснай работы па назіранні за ходам галасавання.

Ад грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый ужо вылучана каля 30 тысяч назіральнікаў. Яны акрэдытаваны практычна на ўсіх участках у кожным рэгіёне Беларусі. Дарэчы, працэс акрэдытацыі нацыянальных назіральнікаў працягнецца яшчэ да 20 студзеня.

— Работа цэнтра выбудавана такім чынам, каб на кожным участку працаваў наш нацыянальны назіральнік. Гэта чалавек з неабходным узроўнем падрыхтоўкі, які дакладна разумее свае абавязкі і тую адказнасць, што на яго ўскладзена. Нацыянальныя назіральнікі ведаюць усе асноўныя заканадаўчыя аспекты арганізацыі работы камісій, парадак галасавання і назірання. Аб ходзе галасавання, магчымых праблемных пытаннях назіральнікі будуць аператыўна інфармаваць цэнтр. Такая форма работы дазваляе не толькі мець аб'ектыўную інфармацыю з участкаў, але і выключае магчымасць скажэння даных, — расказалі ў прэс-службе Федэрацыі прафсаюзаў.

У сваю чаргу ў аператыўным рэжыме цэнтр будзе інфармаваць СМІ і грамадскасць аб усім, што адбываецца на ўчастках. Акрамя таго, з першага дня датэрміновага галасавання для выбаршчыкаў у цэнтры будзе арганізавана работа тэлефоннай «гарачай лініі». Кожны ахвотны можа задаць сваё пытанне аб ходзе электаральнай кампаніі, парадку галасавання, паведаміць аб спрэчнай сітуацыі на ўчастку, унесці прапановы па нумары +375 17 371 07 76. Час работы «гарачай лініі» ў перыяд датэрміновага галасавання (аўторак — субота) з 12.00 да 19.00, у асноўны дзень галасавання (нядзеля) — з 8.00 да 20.00. Кожны зварот будзе дэталёва адпрацаваны.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ЗРАБІЦЬ ВЫБАР НА КАРЫСЦЬ МІРУ

Аб тым, наколькі важна праяўляць электаральную актыўнасць, ішла гаворка падчас сустрэчы члена Прэзідыума Савета Рэспублікі Уладзіслава ТАТАРЫНОВІЧА з працоўным калектывам ААТ «Белрэсурсы» ўчора.

Асноўная тэма размовы была прысвечана найважнейшай грамадска-палітычнай падзеі пяцігоддзя — выбарам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Падчас дыялогу з калектывам сенатар агучыў асноўныя прынцыпы выбарчай сістэмы Рэспублікі Беларусь і этапы электаральнай кампаніі, адзначыўшы, што ключавая задача, пастаўленая кіраўніком дзяржавы, — правесці электаральную кампанію на высокім арганізацыйным узроўні ў інтарэсах беларускага народа.

Парламентарый нагадаў, як у 2020 годзе краіны «калектыўнага Захаду» паспрабавалі ажыццявіць у Беларусі дзяржаўны пераварот. Калі планы бліцкрыгу праваліліся, супраць нас была разгорнута самая сапраўдная гібрыдная вайна.

— Беларускі адказ для заходніх палітыкаў аказаўся, мякка кажучы, нечаканым — мы ўвялі бязвізавы рэжым для грамадзян 38 еўрапейскіх дзяржаў. Складана знайсці сёння ў Еўропе палітыка, які б часцей і настойлівей заклікаў да міру і супрацоўніцтва, чым беларускі лідар. Іншай пазіцыі ў краіны, якая страціла ў гады Вялікай Айчыннай вайны кожнага трэцяга, быць не можа. Таму прыйсці на выбары — значыць зрабіць выбар на карысць міру, — падкрэсліў Уладзіслаў Татарыновіч.

# РЭВАЛЮЦЫЯ НАРМАТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

**Якасць жыцця ў краіне вызначаецца ў тым ліку і якасным заканадаўствам, яго лагічнасцю, сістэмнасцю і зручнасцю ва ўжыванні**



У ліпені 2024 года кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка даручыў Адміністрацыі Прэзідэнта арганізаваць правядзенне маштабнай рэвізіі заканадаўства. Прэзідэнт заўважыў, што на сёння ў Беларусі дзейнічае 175 тысяч актаў. Некаторыя з іх цяжка чытаюцца і ўспрымаюцца, перагружаныя, асобныя пытанні зарэгуляваныя. Кіраўнік дзяржавы назваў гэта катастрофай і паставіў задачу прыбраць усё лішняе. «Гэта будзе рэвалюцыя не толькі нарматворчай дзейнасці, гэта будзе рэвалюцыя ў краіне», — ацаніў Аляксандр Лукашэнка маштабы задач.
Арганізацыяй гэтай работы занялася намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Вольга ЧУПРЫС. Каб правесці сапраўды маштабную рэвізію заканадаўства, было створана дзевяць экспертных груп, якія працавалі ў звязку з профільнымі міністэрствамі. Да гэтага працэсу падключыліся дзяржаўныя органы, парламентарыі, судзейскі корпус, вучоныя, установы адукацыі, незалежныя адвакаты і натарыусы, а таксама звычайныя грамадзяне. У выніку ў Адміністрацыю Прэзідэнта паступіла каля 1,5 тысячы прапаноў. У цэлым жа праведзеную рэвізію юрысты назвалі тытанічнай працай. Пра яе падрабязнасці і вынікі Вольга Чупрыс расказала ў эфіры навін «Першага інфармацыйнага».

## КОЛЬКІ НАРМАТЫЎНЫХ АКТАЎ ШТОГОД ПРЫМАЕЦЦА Ў БЕЛАРУСІ

Вольга Чупрыс адзначыла, што за гады незалежнасці Беларусь прайшла бурнае развіццё ва ўсіх сферах і назапасіла значны прававы масіў. Паводле яе слоў, урадам штогод прымаецца каля 900 прававых актаў, а на ведамасным узроўні — каля 1,5 тысячы. Вядома, такі вялікі масіў непазбежна спараджае і шэраг складанасцяў.

«Ёсць і недахопы, няўзгодненасці, супярэчнасці, і зарэгуляванасць, на што неаднаразова звяртаў увагу кіраўнік дзяржавы і цалкам абгрунтавана прад'яўляў прэтэнзіі да органаў выканаўчай улады. Патрабавалася прыняць дастаткова сур'ёзныя сістэмныя меры. Вось чаму ў Год якасці кіраўнік дзяржавы прыняў рашэнне аб неабходнасці правядзення глабальнага аналізу заканадаўства», — распавяла Вольга Чупрыс.

Яна заўважыла, што якасць жыцця ў краіне вызначаецца ў тым ліку і якасным заканадаўствам, яго лагічнасцю, сістэмнасцю і зручнасцю ва ўжыванні.

## ШТО ВЫЯВІЛІ ПАДЧАС РЭВІЗІІ ЗАКАНАДАЎСТВА

З чаго ж пачалася гэта работа? Калі мы адкрыем Нацыянальны рэестр прававых актаў, то выявім тут больш за 170 тысяч дакументаў, прычым трэцяй часткай з іх будуць пастановы ўрада і рэспубліканскіх органаў дзяржкіравання (усяго такіх актаў каля 55 тысяч). Менавіта з іх аналізу і вырашылі пачаць рэвізію.

«Дэталёваму аналізу былі падвергнуты 15 тысяч дакументаў, якія вынікаюць з 27 кодэксаў, 221 закон і 55 дэкрэтаў і ўказаў кіраўніка дзяржавы», — расказала намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

У выніку, паводле яе слоў, было знойдзена каля 8 тысяч даволі сур'ёзных недахопаў. Так, 1 тысяча актаў фактычна ўжо страціла сваю сілу, каля 2,3 тысячы дакументаў з'яўляліся хутчэй тэхнічнымі і па сваёй сутнасці не маглі мець статус нарматыўнага акта. Гэта былі, напрыклад, навучальныя праграмы ў сістэме адукацыі.

Амаль паўтысячы дакументаў мелі патрэбу ў актуалізацыі, гэта значыць у прывядзенні ў адпаведнасць з цяперашнім заканадаўствам. Асобныя акты, як аказалася, прымаліся ў парушэнне кампетэнцый.

«Каля 570 актаў рэгулююць падобныя праваадносіны, значыць, тут ёсць варыянты для роздумаў. Частка з іх можа быць аб'яднана адна з адной. Прыкладна 400 актаў не суадносяцца паміж сабой. Дублююць нормы іншых нарматыўна-правых актаў звыш двухсот часта карэктавальных, прычым гэта як правіла акты ўрада. У сістэме ўрада былі такія акты, якія карэктуюцца каля сотні разоў у год», — прывяла яшчэ шэраг лічбаў Вольга Чупрыс.

Камісія таксама выявіла дакументы аб'ёмам больш за 100 старонак. Былі нават акты пад тысячу старонак. «Гэта значыць, гэта не тое што цяжкарэалізавальныя, гэта нечытэльныя прававыя акты. Калі мы іх спрабавалі выгрузіць у Word з прававой базы, то камп'ютар падвісаў», — падзялілася намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

## ДА ЯКІХ ВЫСНОЎ ПРЫЙШЛА КАМІСІЯ

Больш за ўсё недахопаў аказалася ў сацыяльнай сферы. «Вылучыліся» адукацыя, ахова здароўя, культура, далучыліся да іх і транспартнікі. А гэта ж тыя сферы, якія якраз бліжэй за ўсё да насельніцтва. Менш за ўсё нараканняў было да сілавога блока.

Для параўнання ў сярэднім кожнае міністэрства штогод прымае каля 50 актаў. Аднак ваганні сур'ёзныя — ад пяці дакументаў у Дзяржпагранкамітэце да 308 у Міністэрстве адукацыі. Па 100 актаў за год выдаецца ў сістэме Міністэрства аховы здароўя і Мінкульта.

> **«Кіраўнік дзяржавы нацэльвае нас, каб пры распрацоўцы нарматыўна-прававых актаў, якія закранаюць правы і свабоды грамадзян мы абавязкова вывучалі грамадскую думку і ўлічвалі яе пры прыняцці актаў. Таму абмеркаванне Кодэкса аб ахове здароўя працягнута да 1 лютага: была асаблівая цікавасць грамадзян да гэтага дакумента»**

Адкуль такая вялікая колькасць дакументаў? Камісія прыйшла да высновы, што ў сацыяльнай сферы вялікая колькасць так званых тэхнічных дакументаў, у якіх выкладзены, напрыклад, методыкі адукацыі ці лячэння.

«Але што яшчэ цікава: вызначыліся (па так бы мовіць аб'ектыўных прычынах) міністэрствы, якія выдаюць вялікую колькасць актаў з лічбавымі паказчыкамі. Напрыклад, наперадзе многіх тут Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю. У яго 40 % актаў па пытаннях цэнаўтварэння. Такая ж колькасць актаў прыблізна ў Мінэканоміцы. Вялікая іх колькасць у Мінспорту, Мінсельгасхарчы. Гэта ўсё цэны, тарыфы і іншыя лічбы. Гэта загрувашчвае наш прававы масіў. Але калі мы кажам, што гэта нарматыўныя акты, то, адпаведна, як і тэхнічныя акты, яны падвяргаюцца складанай працэдуры прыняцця. І вось узнікае пытанне: а ці трэба нам гэтым займацца, ці павінны мы гэтыя акты праводзіць праз гэтыя складаныя працэдуры?» — адзначыла Вольга Чупрыс.

Паводле яе слоў, было прынята рашэнне выдаць адзіны рэестр лічбавых паказчыкаў і ў цэлым спрасціць працэс прыняцця такіх актаў. «У нашай тэхнічнай базе нарматыўна-прававых актаў з'явіцца лічбавы рэестр, у які можна будзе ўвайсці і паглядзець тыя лічбавыя паказчыкі, якія табе цікавыя ў той ці іншы перыяд», — растлумачыла намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Падчас рэвізіі заканадаўства камісія зрабіла для сябе яшчэ адно нечаканае адкрыццё. Аказалася, што некаторыя міністэрствы злоўжываюць сваімі кампетэнцыямі. Такіх выпадкаў няшмат, але іх наяўнасць сама па сабе ўжо трывожны званок і сур'ёзнае парушэнне.

«Напрыклад, Міністэрства аховы здароўя злоўжывае дадзеным яму правам на выданне актаў і ўразрэз з дэкрэтам Прэзідэнта аб развіцці прадпрымальніцтва прымае акты па санітарных нормах, якія прадпісана прымаць Савету Міністраў», — расказала Вольга Чупрыс.

## КОЛЬКІ ПРЫМАЛІ АКТАЎ У БССР, І ЧАМУ ІХ СЁННЯ ТАК ШМАТ

Дарэчы, у савецкія гады ўрад БССР прымаў каля 300 актаў за год — у тры разы менш, чым сёння. Ведамасная нарматворчасць таксама не была распаўсюджаная. Аднак трэба ўлічваць, што ў той час і не было абавязковага правіла аб апублікаванні дакументаў.

«Сучасная гіпернарматворчасць абумоўлена той акалічнасцю, што мы ў законах даём даволі вялікія магчымасці для выдання падзаконных актаў, гэта значыць уключаем туды адсылачныя нормы. Характэрным будзе прыклад Кодэкса аб адукацыі. У ім змяшчаецца 90 адсылачных норм, якія даюць магчымасць ураду прымаць у развіццё кодэкса акты, і 260 адсылачных норм, якія даюць магчымасць ведамствам (пераважна Міністэрству адукацыі) прымаць акты ў развіцці кодэкса. Такім чынам па факце рэалізацыі гэтага кодэкса на сённяшні дзень мы маем каля адной тысячы ведамасных актаў і сямі тысяч тэхнічных нарматыўна-прававых актаў», — прывяла яшчэ некалькі цікавых лічбаў Вольга Чупрыс.

## РЭВІЗІЯ ПРАВЕДЗЕНА. ШТО ЦЯПЕР?

Па словах Вольгі Чупрыс, усе матэрыялы накіраваныя ва ўрад. Падрыхтавана ўжо пастанова, якой прызнаюцца страціўшымі сілу 1,5 тысячы нарматыўна-прававых актаў. У Адміністрацыі Прэзідэнта лічаць, што гэта ўжо добры вынік.

На гэтым работа, вядома, не спыніцца. Прэзідэнт даручыў такія рэвізіі праводзіць на пастаяннай аснове. Кіраўнік дзяржавы падтрымаў комплекс мер па дэбюракратызацыі працэсу нарматворчасці, павышэнні якасці нарматыўна-прававых актаў і ўзмацненні юрыдычнага значэння Міністэрства юстыцыі і ўсіх юрыдычных службаў.

«Яшчэ адно вельмі важнае рашэнне. Для таго каб рэалізаваць комплекс пастаўленых задач (а гэта некалькі старонак задач), давядзецца ўнесці змяненні ў закон аб нарматыўна-прававых актах і ў шэраг іншых заканадаўчых актаў, якія рэгулююць названыя пытанні. Гэта ўказы Прэзідэнта перш за ўсё», — распавяла Вольга Чупрыс.

Змены закрануць і базы даных — усё ж хочацца, каб яны былі зручнымі для карыстальнікаў.

## ЯКУЮ РОЛЮ Ў НАРМАТВОРЧАСЦІ МОЖА АДЫГРАЦЬ ШТУЧНЫ ІНТЭЛЕКТ

«Мы жывём у лічбавым грамадстве, якое імкнецца выкарыстоўваць штучны інтэлект. Таму Прэзідэнт падтрымаў ідэю аб тым, каб у АІС «Нарматворчасць», якая распрацоўваецца ўжо сёлета, уключаўся ў тым ліку штучны інтэлект. Гэту задачу давядзецца НЦЗПІ выканаць», — падкрэсліла намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Паводле яе слоў, штучны інтэлект можа дапамагчы сістэматызаваць дакументы, а пры распрацоўцы новага акта вызначыць, ці не будуць дубліравацца ўжо выдадзеныя дакументы.

«Ён можа адказаць на пытанне, а ці трэба ўвогуле прымаць гэты акт у тым выглядзе, у якім мы плануем яго прыняць, паколькі многія пытанні ўжо вырашаны, — дадала Вольга Чупрыс. — Таму тут нам трэба прыдумаць алгарытмы і пытанні, якія мы будзем задаваць штучнаму інтэлекту і далей з яго дапамогай спрашчаць нашу нарматворчасць і павышаць якасць нашых нарматыўна-прававых актаў».

## ЦІ АДЧУЮЦЬ РЭВІЗІЮ ЗАКАНАДАЎСТВА ГРАМАДЗЯНЕ

Вольга Чупрыс пераканана, што якасная нарматворчасць і якаснае заканадаўства карысны ўсім.

«Калі будуць простыя і зручныя прававыя рашэнні ў сістэме адукацыі і аховы здароўя, то гэта пойдзе на карысць не толькі настаўнікам і ўрачам. Гэта пойдзе на карысць у тым ліку бацькам і дзецям. Або калі мы спросцім працэс тэхнічнага выдання нарматыўна-прававых актаў, ад гэтага выйграюць тыя нарматворцы, якія ўдзельнічаюць у гэтым працэсе. Гэта ўсе дзяржаўныя органы, усе дзяржаўныя служачыя, — звярнула ўвагу намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. — У ходзе рэалізацыі даручэння кіраўніка дзяржавы Савет Міністраў даў даручэнне ў сваёй сістэме аб неабходнасці дэрэгулявання сферы эканомікі. Гэта вельмі важная задача, спадзяёмся, яны яе вырашаць».

У час маніторынгу таксама выявілася, што некаторыя моманты ў сацыяльнай сферы патрабуюць рэгулявання. Напрыклад, пытанні арэнды жылля і дадатковай абароны правоў непаўналетніх, у тым ліку на прыналежныя ім долі ў кватэрах, пабудаваных з дзяржаўнай падтрымкай. Гэта, заявілі ў Адміністрацыі Прэзідэнта, таксама будзе вырашацца найбліжэйшым часам.

«Кіраўнік дзяржавы нацэльвае нас, каб пры распрацоўцы нарматыўна-прававых актаў, якія закранаюць правы і свабоды грамадзян мы абавязкова вывучалі грамадскую думку і ўлічвалі яе пры прыняцці актаў. Таму абмеркаванне Кодэкса аб ахове здароўя працягнута да 1 лютага: была асаблівая цікавасць грамадзян да гэтага дакумента», — адзначыла Вольга Чупрыс.

# САБРАНЫ МІЛЬЁНЫ РУБЛЁЎ, АЛЕ САМАЕ ВАЖНАЕ — УВАГА І КЛОПАТ

## Салодкія падарункі, абсталяванне, бытавая тэхніка

Рэспубліканскай навагодняй дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» споўнілася ўжо 30 гадоў. Гэтым разам яна прайшла з 16 снежня 2024 года да 15 студзеня 2025 года. Як паведаміла **галоўны спецыяліст упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі Алена ВАЙЦЯХОВІЧ**, вышэйшыя службовыя асобы дзяржавы, кіраўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, дзяржаўных і іншых арганізацый наведалі больш за 130 устаноў, сярод якіх дзіцячыя інтэрнатныя ўстановы, арганізацыі аховы здароўя, цэнтры карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі, установы адукацыі, дзіцячыя дамы сямейнага тыпу.

Акрамя прадстаўнікоў органаў дзяржаўнага кіравання, дзяржарганізацый, да акцыі штогод актыўна далучаюцца і грамадскія аб'яднанні — Беларускі дзіцячы фонд, які з'яўляецца актыўным пастаянным партнёрам, Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя, БСЖ, якія ўдзельнічалі ў наведваннях і віншаваннях дзяцей.

— Падчас акцыі дзеці атрымлівалі не толькі салодкія падарункі, але і абсталяванне, калі мы гаворым аб установах, якія неабходны для лячэння дзяцей, навучання, арганізацыі камфортнага пражывання. Таксама гэта бытавая тэхніка, якая падорана дзіцячым дамам сямейнага тыпу, — расказала Алена Вайцяховіч. — Аднак самае важнае, што атрымліваюць дзеці, — гэта ўвага і клопат. Падчас акцыі ў многіх устаноў сфарміраваліся шэфскія сувязі, якія актыўна падтрымліваюцца і за рамкамі акцыі.

З мінулага года акцыя «Нашы дзеці» праходзіць у новым фармаце — адкрыццё кожны год праводзіцца ў новым рэгіёне. Гэтым разам старт прайшоў у Віцебскай вобласці 16 снежня ў загарадным комплексе «Верасы». На свята запрасілі больш за 220 дзяцей. Старт акцыі быў дадзены адначасова ва ўсіх рэгіёнах краіны, з арганізацыяй тэлемоста з Віцебскай вобласцю.

Цэнтральнай падзеяй акцыі стала навагодняе свята з удзелам кіраўніка дзяржавы. Галоўная ёлка краіны сабрала ў Палацы Рэспублікі 2370 дзяцей ад 8 да 14 гадоў з усіх рэгіёнаў краіны. На навагодні баль для навучэнцаў і студэнтаў таксама з удзелам кіраўніка дзяржавы ў Палац Незалежнасці запрасілі тры сотні найлепшых прадстаўнікоў ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. У навагодніх мерапрыемствах у Палацы Рэспублікі і Палацы Незалежнасці прынялі ўдзел дэлегацыі з Расіі, Латвіі і Літвы.

## У фармаце адзіных дзён

Больш як 550 тысяч чалавек прынялі ўдзел у навагодняй акцыі «Ад усёй душы». Сёлета яна праходзіла з 26 снежня да 15 студзеня. Традыцыйна мэтавай аўдыторыяй, для якой арганізаваны ўсе віншавальныя мерапрыемствы, сталі адзінокія грамадзяне, ветэраны вайны, доўгажыхары, людзі, якія перажылі вайну, ветэраны працы.

Як расказала **начальнік галоўнага ўпраўлення сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай дапамогі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Кацярына КАЛЯДА**, у гэтым годзе дзейнічаў прапанаваны летась фармат акцыі. Мерапрыемствы праходзілі ў рамках адзіных дзён для таго, каб ахапіць як мага больш людзей па ўсёй краіне. Навацыяй акцыі стала мерапрыемства 26 снежня па ўрачыстым старце ва ўсіх рэгіёнах краіны, у ім прынялі ўдзел больш за 25 тысяч чалавек: гэта і пажылыя грамадзяне, і моладзь, і прадстаўнікі органаў улады, і грамадскіх аб'яднанняў.

Акцыя праходзіла ў два этапы. Падрыхтоўчы быў накіраваны на стварэнне святочнага настрою і падрыхтоўку да сустрэчы Новага года, а з 3 студзеня пачаліся ўласна віншавальныя мерапрыемствы. Такім чынам, 30 снежня прайшоў адзіны дзень «Гірлянда добрых спраў», калі моладзь наведала пажылых людзей, каб дапамагчы прыбраць і ўпрыгожыць дом, набыць прадукты да святочнага стала. У ім паўдзельнічала каля 45 тысяч чалавек. Трэцяга студзеня Вялікі тэатр Беларусі арганізаваў вялікі віншавальны вечар з паказам балета «Шчаўкунчык», на які сабралася каля тысячы чалавек.

Самае чаканае мерапрыемства — балі «Калядная сімфонія», якія прайшлі не толькі ва ўсіх абласных цэнтрах, але і ў раёнах, у іх прынялі ўдзел каля 9 тысяч чалавек, прычым актыўнічала і моладзь. Яшчэ адзін тэматычны дзень — 14 студзеня: прайшлі мерапрыемствы з удзелам валанцёраў пад назвай «Сустрэнем дружна стары Новы год», у ім узялі ўдзел каля 20 тысяч чалавек.

У рамках акцыі абавязковым стала ўшанаванне доўгажыхароў. Кацярына Каляда нагадала, што ў краіне жыве каля 40 тысяч чалавек, старэйшых за 90 гадоў, і больш за 600 чалавек, якія перасягнулі 100-гадовы рубеж. Падчас акцыі 1400 чалавек з ліку доўгажыхароў адсвяткавалі свае дні нараджэння.

Яркай падзеяй акцыі стала і наведванне выстаўкі «Мая Беларусь». Сярод пажылых людзей яна выклікала вялікую цікавасць, утварылася нават пэўная чарга з ахвотных наведаць экспазіцыю.

**Алена КРАВЕЦ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



26 студзеня 2025
ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# «ГАЛОЎНАЯ КАШТОЎНАСЦЬ — ВЫБАРШЧЫК»

## Карэспандэнты «Звязды» пабывалі на мерапрыемствах, на якіх абмяркоўвалася электаральная кампанія

У атрыуме гандлёвага цэнтра «Сталіца» праходзіць унікальны інфармацыйна-асветніцкі праект «Адкрытае веданне». У якасці спікераў выступаюць аўтарытэтныя эксперты, расказваюць пра асаблівасці сённяшняй электаральнай кампаніі і пра тое, чаму так важна прыйсці на выбары.

«У Мінску выбарчая кампанія заўсёды мае асаблівы статус, — адзначыў **старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Арцём ЦУРАН.** — Гэта звязана з тым, што заўсёды ўсе самыя гарачыя палітычныя баталіі адбываюцца ў сталіцы. У Мінску асаблівая ўвага аддаецца кожнаму выбарчаму працэсу і кожнай выбарчай кампаніі. Кожны раз вызначаюцца новыя падыходы для таго, каб наш выбаршчык, наш жыхар горада Мінска разумеў, што асноўнай каштоўнасцю ў адпаведнасці з Канстытуцыяй нашай краіны з'яўляецца чалавек. Такім чынам, уся сацыяльная палітыка, якую рэалізуюць і кіраўнік дзяржавы, і ўсе дзяржорганы, так ці інакш накіравана на тое, каб нашы людзі адчувалі сябе ў бяспецы, пачувалі сябе абароненымі і былі ўпэўненыя ў сённяшнім і заўтрашнім дні. Таму і выбарчая кампанія праходзіць у такім жа ключы — асноўнай каштоўнасцю ў ёй з'яўляецца выбаршчык»...

Паводле яго слоў, свабода выбару — гэта па вялікім рахунку адна з галоўных каштоўнасцяў, якія ёсць і ў дзяржаве, і ў чалавека: «І калі мы гаворым пра выбары, якія праходзяць у той ці іншай краіне, то маем на ўвазе, што людзі выбіраюць пэўны кірунак, палітычны курс сваёй краіны. У нас у краіне сфарміраваны баланс, у тым ліку з дапамогай нашага новага канстытуцыйнага органа, Усебеларускага народнага сходу, і гэты баланс прадугледжвае пэўнае захаванне канстытуцыйнага ладу. Тым не менш роля Прэзідэнта ў гэтай структуры вызначальная. Таму мы разумеем, што сумесна з нашым насельніцтвам выбудоўваем палітычны вектар як мінімум на найбліжэйшае пяцігоддзе, можа быць, і на значна больш. І робім гэта, захоўваючы і прымнажаючы тое, што ёсць у нас у краіне».

**Журналіст RT Канстанцін ПРЫДЫБАЙЛА** пажадаў маладому пакаленню зрабіць правільны выбар: «Важна думаць пра будучыню, пра тое, якой яна будзе. Не бывае такога, што вы «па-за палітыкай». Яна ўсюды. Мы знаходзімся ў цэнтры Мінска, бачым, што горад выдатны — гэта палітыка. Чалавек забыўся закрыць машыну, а яна стаіць, яе ніхто не кранае — гэта палітыка. Мы спакойна заходзім у метро, трымаем тэлефон, і яго ніхто не крадзе — гэта палітыка. Палітыка ўсюды, а таму ад таго, як мы робім свой выбар, залежыць у цэлым усё наша жыццё. Хочацца пажадаць маладым беларусам зрабіць свой правільны выбар».

Прысутных на праекце чакаў яшчэ і канцэрт. Акрамя таго, ахвотныя змаглі паўдзельнічаць у рабоце інтэрактыўных пляцовак, а таксама азнаёміцца з інфармацыйна-асветніцкай пляцоўкай «Выбірай.ВУ».



Рэспубліканскі форум «Маладзёжнае лідарства — сучасны погляд» прайшоў у Мінску. Гэта насычаная адукацыйная і культурная праграма, у якой узялі ўдзел 345 пераможцаў і прызёраў рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў, фестываляў і праектаў. Цэнтральнай падзеяй першага дня стала шоу-праграма «Час выбраў нас!», на якой абмеркаванне важных і цікавых тэм чаргавалася з яркімі творчымі нумарамі.



Падчас мерапрыемства **міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ** адзначыў, што сёння наша краіна знаходзіцца на вельмі важным адказным грамадска-палітычным этапе.



— Мы хацелі паглядзець на найлепшых прадстаўнікоў моладзі, каб абмеркаваць, якія ёсць прапановы і ініцыятывы па далейшым развіцці нашай краіны, таму што менавіта ад моладзі і яе выбару залежыць не толькі сённяшні, але і заўтрашні дзень, — заявіў ён.

У сваю чаргу **старшыня Цэнтрвыбаркама Ігар КАРПЕНКА** адзначыў, што ў сёлетняй электаральнай кампаніі налічваецца больш як 88 тысяч маладых грамадзян, якія галасуюць упершыню.

— Можна адзначыць вялікую зацікаўленасць, якую праяўляюць да гэтых выбараў маладыя людзі. Мы гэта бачым па дзейнасці нашага Маладзёжнага савета пры Цэнтральнай выбарчай камісіі, выбарчых клубаў, якія створаныя ва ўстановах адукацыі, па іншых мерапрыемствах, да якіх актыўна далучаецца моладзь. Толькі пры ЦВК працуе каля 30 валанцёраў, — сказаў старшыня ЦВК. — Галоўнае — каб моладзь рабіла свой свядомы выбар, супастаўляла яго не з адмаўленнем таго, што рабілі папярэднія пакаленні, а выбудоўвала пазіцыю развіцця нашай краіны, яе эканамічнага і творчага патэнцыялу.

Завяршыўся першы дзень форуму праглядам спектакля «Радавыя» і канцэртнай праграмай «Краіна шчаслівых людзей» заслужанага калектыву Беларусі «Песняры». У другі дзень удзельнікі форуму наведалі экспазіцыі Мінскага міжнароднага выставачнага цэнтра, дзе іх чакала фінальнае мерапрыемства: інтэрактыўная пляцоўка «Глядзім. Слухаем. Абмяркоўваем».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ, Лізавета ГОЛАД.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД і Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

# ЛЮБІМЫЯ ПЕСНІ І ПАПУЛЯРНЫЯ АРТЫСТЫ

## Як прайшоў вялікі святочны канцэрт у Палацы Рэспублікі

Яркае свята музыкі і сяброўства. Менавіта такія асацыяцыі ўзнікаюць з вялікім канцэртам «Нашы любімыя песні», які прайшоў у Палацы Рэспублікі для прадстаўнікоў працоўных калектываў Мінска.

У канцэртнай праграме прынялі ўдзел папулярныя беларускія і расійскія артысты, сярод якіх Руслан Аляхно, Аляксандр Саладуха, Вікторыя Алешка, Ганна Благава, Грыгорый Лепс, гурт «Лесапавал», Рада Рай, Яраслаў Сумішэўскі і іншыя.

— Гэта падарунак для нашых працоўных калектываў, якія сабраліся ў гэтай зале, каб праспяваць самыя вядомыя песні, — адзначыў **дырэктар Палаца Рэспублікі Максім ПРЫХАДОЎСКІ.** — Чаму мы павінны ўвесь час шукаць нейкую нагоду? Сярод гледачоў самыя звычайныя людзі — тыя, якія стаяць за касавым апаратам у магазіне; тыя, якія прыбіраюць памяшканні. Магчыма, некаторыя з іх не могуць дазволіць сабе купіць той ці іншы білет. Таму вельмі важна зрабіць для іх гэтае свята. Мы стараемся, каб людзі атрымлівалі максімум задавальнення.

Сапраўды, зала была напоўнена зараджанымі пазітывам людзьмі розных узростаў і прафесій. Напрыклад, малады спецыяліст універмага «Беларусь» Лізавета Базыльчык з задавальненнем ухапілася за магчымасць трапіць на гэты канцэрт.

— Для людзей важна рабіць такія падарункі. Калі ты ў працы і цалкам у яе пагружаны, адпачыць ад гэтых думак увечары на канцэрце — вельмі добрая ідэя, — падзялілася яна.

Нам удалося паразмаўляць і з калектывам кандытарскай фабрыкі «Камунарка».

— Вялікі дзякуй за такую арганізацыю і за тое, што далі магчымасць трапіць сюды і паглядзець на такіх вядомых спевакоў. Толькі станоўчыя эмоцыі: радасць і задавальненне, — распавяла загадчык сталовай Ала Давыдка.

У сваю чаргу яе калега загадчык канцылярыі Ала Пясецкая дадала, што такія мерапрыемствы адназначна аб'ядноўваюць калектывы, зараджаюць станоўчай энергіяй і накіроўваюць да дасягнення мэты.

Адкрыў канцэрт **заслужаны артыст Беларусі Аляксандр САЛАДУХА**, якога гледачы сустрэлі громам авацый.

— З вялікай радасцю прыняў прапанову арганізатараў, тым больш упершыню ў сваім жыцці адкрываю канцэрт у Палацы Рэспублікі, — падзяліўся артыст.

Паводле яго слоў, публіка ў Палацы Рэспублікі проста фантастычная:

— Неверагодныя эмоцыі. Столькі падпявалі — гэта проста казка.

Велізарную аддачу публікі адзначыла і расійская спявачка Рада Рай:

— Я заўсёды пасля паездкі ў Беларусь расказваю сваім калегам, які тут глядач. Яны ведаюць пра гэта, мы заўсёды абменьваемся ўражаннямі, таму што такую гасціннасць, такую любоў рэдка можна сустрэць. Я лічу, што галоўнае ў Беларусі — гэта, вядома, людзі. Вы цудоўныя!

Выхад на сцэну Грыгорыя Лепса выклікаў сапраўдныя авацыі.

— Сяброўства паміж нашымі народамі непарушнае, мы любім адно аднаго, мы паважаем культуру адно аднаго, і гэта назаўжды, — адзначыў артыст, звяртаючыся да гледачоў.

Усмешкі, гучныя апладысменты... З упэўненасцю можна сказаць адно: яркія эмоцыі ад гэтага вечара застануцца ў памяці гледачоў надоўга.

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**

*У хуткім часе тэлеверсію канцэрта пакажуць па тэлебачанні. Сачыце за праграмай!*







# АКЦЫЯ, ЯКАЯ ДОРЫЦЬ ЭМОЦЫІ









*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дырэктар падкрэсліў, што за 70-гадовую гісторыю ў завода былі розныя перыяды, у тым ліку і вельмі складаныя. Але завод выстаяў і ўпэўнена рухаецца далей. Інвестыцыі ўкладваюцца ў новае абсталяванне, тэхналогіі, інфраструктуру. На пляцоўцы, дзе выступаюць артысты, у хуткім часе будуць стаяць новыя лініі, а гэта значыць, будуць расці аб'ёмы вытворчасці, экспартны патэнцыял.

Знаёмімся з **інжынерам-элетронікам Ільёй СУЗДАЛЕВЫМ.** Ён разам з прадстаўнікамі завода прыйшоў на сустрэчу з беларускімі артыстамі. Малады чалавек расказаў, што работа на прадпрыемстве стабільная, заказаў хапае, усе накіраваны на тое, каб выканаць іх у тэрмін. Таксама зазначыў, што калектыў вельмі дружны, адчуваецца пастаянная падтрымка вопытных спецыялістаў. Ілья прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці, у тым ліку ахвотна падключыўся да падрыхтоўкі акцыі «Марафон адзінства». Лічыць, што мерапрыемства вельмі знакавае для кожнага беларуса, бо дае магчымасць падзяліцца радасцю.

Дарэчы, у эмоцыях не было недахопу. Завадчане не толькі актыўна падпявалі беларускім артыстам, але і зладзілі карагод каля імправізаванай сцэны. Тут цёпла прымалі спявачку Уладу, салістку Вялікага тэатра Беларусі Марту Данусевіч, групу «Брэнд.Бай», Тараса Прысяжнюка, а таксама шоу-балет «Феерыя».

Тэматыка марафону выклікала вялікі інтарэс сярод гараджан. Нямала лакацый разгарнулася ў гандлёвых цэнтрах горада. Многіх зацікавіла выстаўка, прысвечаная 100-годдзю беларускага кіно, якую прадставіў Нацыянальны гістарычны музей Беларусі. Яго **дырэктар Аляксандр ХРАМОЙ** расказаў, што ў экспазіцыі сабраны толькі сапраўдныя экспанаты, якія былі задзейнічаны ў такіх фільмах, як «Чырвонае лісце», «Прыгоды Бураціна» і іншых. Тут можна ўбачыць касцюм, пашыты спецыяльны для акцёра Мікалая Карачанцава з кінафільма «Белыя росы», яго гармонік, фотаздымак трох сыноў старога Хвядоса. Дарэчы, фільм, які здымалі ў тым ліку ў Гродне, стаў адным з самых касавых у гісторыі кінастудыі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара і БелТА.**



# Мы разам — Беларусь!

## Краіна моцная рэгіёнамі: Лунінецкі раён



МЯСЦОВЫ ЧАС

# ВЫТВОРЧЫЯ ГІГАНТЫ, ІНВЕСТЫЦЫЙНЫЯ ПРАЕКТЫ І ПРАМЫСЛОВЫ ТУРЫЗМ

## Чым сёння ўражвае палеская Лунінеччына?

Лунінецкі раён — гэта самабытны і гасцінны край у самым сэрцы беларускага Палесся. Размешчаны за 228 кіламетраў ад Брэста, горад Лунінец трывала асацыіруецца з клубніцамі. А яшчэ гэта ціхае месца, дзе шмат зеляніны і заўсёды пануе прыемная атмасфера. У розны час тут жылі і працавалі многія вядомыя людзі, а старадаўнія пабудовы захоўваюць памяць аб гісторыі. Горад таксама служыць зручным адпраўным пунктам для агляду прыродных славутасцяў, якімі багаты Лунінецкі раён. Але чым яшчэ вабіць рэгіён? Чаму гасцінная Лунінеччына заўсёды застаецца на слыху? Адказы на гэтыя пытанні карэспандэнтам «Звязды» даў **старшыня Лунінецкага райвыканкама Аляксандр САВІНА**.



Фота Лізаветы ГОЛАД.

— Аляксандр Іванавіч, не так даўно горад Мікашэвічы Лунінецкага раёна прымаў абласныя «Дажынкі». Вядома, што за перыяд падрыхтоўкі да свята працаўнікоў сяла горад істотна змяніўся. Раскажыце, калі ласка, што было зроблена.

— Абласныя «Дажынкі» далі сур'ёзны стымул для развіцця горада Мікашэвічы. За гэта мы ўдзячныя кіраўніцтву вобласці і намесніку прэм'ер-міністра Юрыю Вітольдавічу Шулейку. Падчас падрыхтоўкі горада да «Дажынак» моцна была падцягнута сацыяльная сфера. Адрамантаваны ўсе сацыяльныя аб'екты па бягучым або капітальным рамонце. Праведзены бягучы рамонт дзіцячай і дарослай паліклінік, а таксама капітальны рамонт гарадской бальніцы. Таксама былі адрамантаваны ўсе ўстановы адукацыі. Толькі на капітальны рамонт дзвюх дзіцячых дашкольных устаноў было выдзелена больш за пяць мільёнаў рублёў. На бягучы рамонт Мікашэвіцкай сярэдняй школы № 2 было выдзелена каля 850 тысяч рублёў.

Многае зроблена і па дарожнай сетцы. Мы адрамантавалі каля дзевяці вялікіх вуліц горада. Сярод іх — Першамайская, Ленінская, Чыгуначная і Цэнтральная вуліца, якая перасякае ўсе Мікашэвічы. Былі фактычна зроблены дзве вуліцы — Мядзведскага і Францыска Скарыны. Па апошняй работы яшчэ працягваюцца. Што датычыцца жыллёвага фонду, па бягучым рамонце адрамантавалі больш за 27 дамоў, зрабілі капітальны рамонт чатырох дамоў, а таксама рамонт больш чым 12 дахаў.

У цэлым, актыўная работа праводзілася па ўсіх кірунках. Адчувальную дапамогу ў добраўпарадкаванні аказалі нашы спонсары. РУВП «Граніт» падарыла гораду прыгожы сучасны парк. Хацелася б адзначыць усе прадпрыемствы раёна. Яны малайцы, кожны на сваім месцы выдатна разумеў, што трэба падцягваць аб'екты, актыўна ўдзельнічаў у навядзенні парадку. Хтосьці дапамагаў па бягучым рамонце, а Мікашэвіцкі ўчастак ВУ «Пінскгаз» правёў у сябе капітальны рамонт. У выніку былі створаны выдатныя ўмовы як для работнікаў прадпрыемства, так і для наведвальнікаў. Хацелася б падкрэсліць, што менавіта нашы прадпрыемствы далі імпульс развіццю горада. Думаю, людзі захочуць звязаць сваё жыццё з Мікашэвічамі, застануцца тут, а гэта сёння вельмі важна.

**— Гаворачы аб правядзенні ўборачнай, наколькі ўдалося рэалізаваць намечанае?**

— У цэлым, год быў вельмі складаным для нас. На жаль, урагану, які разбушаваўся ўлетку, не ўдалося нас абмінуць. 14 ліпеня 2024 года ён прайшоўся па нашых землях. Тым не менш мы атрымалі нядрэнны ўраджай, уключаючы збожжавыя культуры. Аднак моцна былі пашкоджаны нашы плошчы, з-за чаго мы недабралі прыкладна 7-8 % да агульнага вала збожжа. Вялікі ўпор зрабілі на кукурузу і, нават нягледзячы на стыхію, усё роўна атрымалі нядрэнныя вынікі.

Дарэчы, мы правялі аналіз па ўборцы ўраджаяў за апошнія 10 гадоў. Зыходзячы з гэтага, 2024 год аказаўся на другім месцы па вале збожжа. Калі б яшчэ не тыя ўмовы надвор'я, то год атрымаўся б досыць паспяховым. Таксама ў 2024-м на нас была ўскладзена адказная задача — мы прымалі абласныя «Дажынкі». Гэта накладвала не толькі пытанні па добраўпарадкаванні горада. Мы разумелі, што падысці да «Дажынак» павінны з годнымі вынікамі, каб апраўдаць той давер, які быў аказаны раёну. Таму ўсе нашы прадпрыемствы імкнуліся паказаць найлепшыя рэзультаты. Хацелася б вылучыць флагманы сельскай гаспадаркі раёна. Гэта ААТ «Вулькаўскі світанак», ААТ «Лунінскі» і СУП «Міжлескае». На працягу многіх гадоў сваёй карпатлівай працай работнікі гэтых гаспадарак паказваюць найлепшыя вынікі. Кіраўнікі «Вулькаўскага світанку» і «Лунінскага» нават атрымалі дзяржаўную ўзнагароду — медаль за працоўныя заслугі.

**— Кіраўнік дзяржавы ставіць задачу актыўна развіваць унікальную праграму «Адзін раён — адзін праект». Раскажыце аб вашых інвестыцыйных праектах у рамках гэтай ініцыятывы.**

— У нашым раёне рэалізоўваецца два праекты. На ААТ «Спецжалезабетон» устаноўлена новая лінія па вытворчасці тратуарнай пліткі. Гэты праект ужо рэалізаваны і дае добрыя вынікі. Другі праект рэалізоўваецца на базе ААТ «Лунінецкі малочны завод». Там займаемся будаўніцтвам цэха па вытворчасці сухіх малочных прадуктаў. Сёння распрацоўваецца ўся перадпраектная дакументацыя. Асноўныя моманты па будаўніцтве і праектаванні выпадаюць на 2025-ы. Мінулы год быў падрыхтоўчым: мы вывучалі рынак, распрацоўвалі адпаведны бізнес-план, каб абгрунтаваць выдзяленне крэдытных рэсурсаў, распрацоўвалася і перадпраектная дакументацыя.



Мурал у Мікашэвічах да «Дажынак».

Фота Алены ДАЎЖАНОК.

**— Развіццё любога рэгіёна немагчыма без будаўніцтва жылля. Як працуеце ў гэтым кірунку?**

— У 2024 годзе было даведзена заданне па будаўніцтве 19,5 тысячы квадратных метраў жылля. Гэта сярэдні штогадовы аб'ём, які мы ўводзім у раёне на працягу апошніх 5-6 гадоў. План быў перавыкананы, і за 2024 год мы ўвялі больш за 21 тысячу квадратных метраў жылля. На 2025 год ставім для сябе прыкладна такія ж задачы — каля 20 тысячы квадратных метраў. Плануем увесці два шматкватэрныя дамы, трэці дом пакуль яшчэ пад пытаннем. Усё астатняе — гэта індывідуальнае жылое будаўніцтва.

Лунінецкі раён лічыцца прамысловым. У нас ёсць такія гіганты, як РУВП «Граніт», ААТ «Спецжалезабетон», ААТ «Лунінецкі малочны завод», прыватнае прадпрыемства «Вікторыя», ААТ «Палессеэлектрамаш» і іншыя прамысловыя прадпрыемствы. Пры гэтым актыўна развіваецца і сельская гаспадарка. Сёння ў горадзе Лунінцы пражывае каля 24 тысяч чалавек, больш як 12 тысяч жывуць у Мікашэвічах, а каля 26 тысяч чалавек пражывае ў сельскай мясцовасці.

**— Моладзь — гэта, без перабольшання, будучыня нашай краіны. Як замацоўваеце маладых спецыялістаў?**

— Да пытання замацавання моладзі падыходзім комплексна, ствараем адпаведныя ўмовы для таго, каб маладыя людзі хацелі заставацца тут. Мы будуем жыллё, імкнёмся падтрымліваць маладыя сем'і. Шукаем і новыя формы замацавання моладзі, асабліва на вёсцы. Нашы сельскагаспадарчыя арганізацыі будуюць дамы для сваіх работнікаў. Добры таму прыклад — ААТ «Вулькаўскі світанак» і РУВП «Граніт». Прадпрыемствы забяспечваюць сваіх спецыялістаў не толькі добрым жыллём, але і выдатнымі ўмовамі працы.

Стараемся прыцягваць маладых людзей у спорт, у розныя грамадскія арганізацыі, рабіць так, каб у нас ім было цікава. Даём і магчымасці для далейшага кар'ернага росту. Маладыя людзі актыўна праяўляюць сябе і ў нашым Маладзёжным парламенце. Развітая інфраструктура таксама дазваляе людзям заняць сябе чымсьці, адпачыць. У горадзе Лунінцы ёсць басейн, свая лядовая арэна. Нашы Мікашэвічы — невялікі горад, але і там ёсць басейн на базе РУВП «Граніт». Любы ахвотны можа туды прыйсці, каб паплаваць і адпачыць. На нашым стадыёне ёсць спартыўныя пляцоўкі, дзе можна пазаймацца лёгкай атлетыкай, валейболам, міні-футболам, футболам і іншымі відамі спорту. У цэлым, што датычыцца спорту, мы заўсёды падтрымліваем любыя ініцыятывы.

Акрамя таго, маладыя людзі могуць знайсці сябе і ў культуры. У нашым раёне ёсць добрая школа мастацтваў. Праводзяцца таксама розныя экскурсіі, развіты і прамысловы турызм. Асноўны гігант у апошнім — РУВП «Граніт». Наведванне кар'ера, музея, вадаспадаў, паездкі на «БелАЗе» — кожны знойдзе тое, што яму цікава. У рамках прамысловага турызму арганізоўваюцца экскурсіі і на Лунінецкі малочны завод. Можна азнаёміцца з вытворчасцю прадукцыі гэтага перадавога прадпрыемства. Арганізоўваюцца наведванні нашага прыватнага прадпрыемства «Вікторыя», што займаецца выпускам літога алюмініевага посуду. На базе нашай сельскагаспадарчай арганізацыі «Гарадоцкі» функцыянуе конеферма, дзе разводзяць палескую папуляцыю коней. На абласных «Дажынках» у Мікашэвічах два кані палескай папуляцыі былі падораны кіраўніку дзяржавы. Яны якраз з нашага «Гарадоцкага».

Многія людзі прыязджаюць у санаторый «Світанак». Днямі дырэктар санаторыя сказаў, што ўсе месцы на найбліжэйшы час ужо выкуплены. Аднак тут аздараўляюцца не толькі работнікі нашых прадпрыемстваў. Санаторый часта прымае гасцей з Расійскай Федэрацыі. Наведваюць наш рэгіён і з-за маляўнічай прыроды. З захаду на ўсход увесь раён перасякае чароўная рака Прыпяць. Адкрываюцца выдатныя віды, асабліва вясной. На тэрыторыі раёна пралягае легендарнае «мора Герадота». Гэта ўнікальны тур па разлівах Прыпяці. Для нашых гасцей арганізоўваюць вялікія сплавы на байдарках. Такое вы больш нідзе не ўбачыце! Гэта наша беларуская Амазонка. Таму з задавальненнем чакаем усіх на нашай прыгожай, старажытнай, гасціннай Лунінеччыне!

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**



Уласны канцэнтратар кіслароду цалкам закрывае патрэбы бальніцы.

ЧАС ЗДАРОЎЯ

# ЛУНІНЕЦКАЯ ЦРБ: СУЧАСНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ДЫЯГНОСТЫКІ І ЛЯЧЭННЯ

Ужо добрай традыцыяй для Лунінецкай ЦРБ стала штогод уводзіць новыя аб'екты, якія робяць працэсы дыягностыкі і лячэння яшчэ больш эфектыўнымі. Мы наведалі гэту ўстанову, каб даведацца, як там ідуць справы і з якімі навінкамі яны завяршылі 2024 год.

Сёння ў склад Лунінецкай ЦРБ уваходзіць шэсць бальніц на 501 ложак. Да таго ж яе амбулаторна-паліклінічная служба прадстаўлена Лунінецкай і Мікашэвіцкай паліклінікамі, 15 амбулаторыямі ўрача агульнай практыкі і 24 фельчарска-акушэрскімі пунктамі.

На працягу многіх гадоў установа неаднаразова адзначалася ўзнагародамі як абласнога, так і рэспубліканскага ўзроўню. Сакрэт поспеху — як у дастойных супрацоўніках, так і ў своечасовым абнаўленні матэрыяльна-тэхнічнай базы.

— Самым сучасным абсталяваннем аснашчаны аддзяленне рэанімацыі, аперацыйныя залы, радзільнае і хірургічнае аддзяленні. Таксама ў нас ёсць асабістае аддзяленне гемадыялізу. Гэтым можа пахваліцца далёка не кожная бальніца, — падзялілася **галоўны ўрач Святлана ХЛЕБУС.** — Непасрэдна ў 2024 годзе была праведзена мадэрнізацыя рэнтгенаўскіх кабінетаў пад устаноўку новых апаратаў у Лунінецкай паліклініцы, уведзены ў эксплуатацыю новыя рэнтген-апараты — мамограф і флюарограф.



Рэнтгенлабарант Святлана ЯЦУКЕВІЧ аглядае рэнтгендыягнастычны кабінет перад прыёмам пацыентаў.



Урач-рэнтгенолаг Ганна ЧАРНЯКОВІЧ укладвае пацыента на рэнтгенаграфію.

Усе гэтыя навінкі мы змаглі ўбачыць на свае вочы. **Загадчык кабінета рэнтгенакамп'ютарнай дыягностыкі Кацярына АРЭШКА** падзялілася, што новы мамограф пад назвай «Мамаскан» быў вельмі жаданым набыццём.

— У нас такі апарат адзін на ўвесь раён. Больш за 1200 чалавек ужо абследавана за паўгода, — адзначыла яна.

Таксама сёлета ў Лунінецкай ЦРБ была ўведзена ў эксплуатацыю кіслародна-размеркавальная станцыя з устаноўкай кіслароднага канцэнтратара.

— Апарат разлічаны на 1 тыс. літраў прадукцыйнасці. Дзякуючы яму мы не залежым больш ні ад каго ў плане вытворчасці кіслароду. Абсталяванне само выпрацоўвае кісларод, і мы можам беспрабойна працаваць. У тым ліку гэта дазваляе запраўляць з яго балоны, якія патрэбны для інфекцыйнага аддзялення і для Мікашэвіцкай бальніцы, — распавёў **намеснік галоўнага ўрача па медыцынскім абслугоўванні насельніцтва Эдуард КАНАПАЦКІ.**

З вялікай увагай тут адносяцца і да жыхароў аддаленых населеных пунктаў. Так, у лістападзе 2024 года пачаў сваю работу мабільны ФАП, закуплены за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

— Мабільны ФАП абсталяваны ўсім неабходным для аказання медыцынскай дапамогі. Вяскоўцы могуць прайсці дыспансерызацыю, ёсць магчымасць зрабіць прышчэпкі і набыць медыкаменты, — падзяліўся Эдуард Канапацкі.

Па яго словах, графік выезду ў сельскія населеныя пункты папярэдне размяшчаецца на сайце бальніцы і ў мясцовай раённай газеце.

Пасля наведвання Лунінецкай ЦРБ не застаецца сумненняў, что гэта месца, дзе па-сапраўднаму клапоцяцца аб здароўі жыхароў раёна. І кожнае новае набыццё робіць гэты працэс яшчэ больш эфектыўным.

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**



Загадчык кабінета рэнтгенакамп'ютарнай дыягностыкі Кацярына АРЭШКА і рэнтгенлабарант Таццяна ВЯЧОРКА вывучаюць мамаграмы, зробленыя на новым апараце «Мамаскан».





Камунальнае сельскагаспадарчае ўнітарнае прадпрыемства «Велута» — сельгаспрадпрыемства Лунінецкага раёна, у цэнтры ўвагі якога заўсёды знаходзіцца чалавек. Тут цэняць любоў да зямлі, імкненне развівацца і самарэалізоўвацца. Сельгаспрадпрыемства спецыялізуецца на развіцці галін мяса-малочнай жывёлагадоўлі і раслінаводства. Размешчаная за 30 кіламетраў ад райцэнтра гаспадарка вырошчвае буйную рагатую жывёлу і рэалізоўвае мяса-малочную прадукцыю. Менавіта тут якасны падыход да справы дапамагае аграрыям атрымліваць высокія ўраджаі, а ў аснове ўсяго — людзі, якія не складаючы рук працуюць на хлебнай ніве, забяспечваючы харчовую бяспеку нашай краіны. Але чым яшчэ багата гэта прадпрыемства? Чаму людзі, якія аднойчы трапілі на работу ў КСУП «Велута», не імкнучыся потым пакінуць гаспадарку, застаюцца тут амаль на ўсё жыццё? На гэтыя пытанні карэспандэнты «Звязды» пастараліся знайсці адказы з **дырэктарам гаспадаркі Мікалаем Мікалаевічам ШЭЎЧЫКАМ**.

# ДЗЕЛЯ ХАРЧОВАЙ БЯСПЕКІ КРАІНЫ



Трактарыст-машыніст Аляксандр ЯСЕНЯ рамантуе каробку перадач.

Загадчык рамонтных майстэрняў Васіль АРЭХВА з падоранай на абласных «Дажынках» тэхнікай.

Трактарыст-машыніст Вадзім ПАРТУС рамантуе агрэгат для падрыхтоўкі глебы.

## КСУП «Велута» — невялікая гаспадарка з вялікімі магчымасцямі



Дырэктар Мікалай ШЭЎЧЫК.

Мікалай Мікалаевіч родам з Лунінецкага раёна. У 2006 годзе па размеркаванні трапіў у ААТ «Вулькаўскі світанак». «Тады кіраўнік гэтай гаспадаркі Уладзімір Іванавіч Соц прызначыў мяне на пасаду памочніка брыгадзіра. У студзені 2007 года я стаў аграномам-аграхімікам. На гэтай пасадзе прапрацаваў каля трох гадоў. Затым вырашыў паспрабаваць сябе ў іншай сферы, пайшоў працаваць гандлёвым прадстаўніком, але праз чатыры месяцы зразумеў, што гэта не маё, і вярнуўся назад у ААТ «Вулькаўскі світанак». Уладзімір Іванавіч прызначыў мяне на пасаду агранома-агародніка, на якой я прапрацаваў да 2018 года. Затым быў пераведзены на пасаду галоўнага агранома. У чэрвені 2022-га трапіў на новую гаспадарку — у КСУП «Велута», якая з тых часоў стала для мяне другім домам. Узначаліў сельгаспрадпрыемства я не адразу — спачатку папрацаваў на пасадзе намесніка дырэктара. 23 верасня 2022 года мяне зацвердзілі на пасаду дырэктара. З тых часоў і ўзначальваю гаспадарку», — успамінае Мікалай Шэўчык.

### У аснове — мяса-малочная галіна і раслінаводства

Дырэктар КСУП «Велута» падкрэсліў, што асноўная спецыялізацыя гаспадаркі — мяса-малочная галіна і раслінаводства. Ад раслінаводства сельгаспрадпрыемства атрымлівае пэўную прадукцыю, цалкам забяспечваючы сябе кармавымі запасамі. «Гэта і сілас, і сянаж, і вырошчванне збожжавых ды зернебабовых культур, а таксама малако і мяса. Сёння ў гаспадарцы налічваецца 1000 галоў дойнага статка. З усяго пагалоўя



на сённяшні дзень маецца 2511 адзінак буйной рагатай жывёлы, чатыры тысячы гектараў сельгасугоддзяў. Бал раллі — 24,1. Яго стараемся павялічыць, укараняем новыя тэхналогіі, працуем над павышэннем ураджайнасці, на падтрыманне ўрадлівасці глебы па нашай гаспадарцы. Сярэднеспісачная колькасць работнікаў — 168 чалавек», — расказаў Мікалай Шэўчык.

Нягледзячы на засушлівае надвор'е, КСУП «Велута» атрымала добрыя вынікі па ўборачнай кампаніі. «Гаворачы аб уборачнай, мы атрымалі ўраджайнасць 27 цэнтнераў на гектар, — адзначыў дырэктар гаспадаркі. — Гэта нядрэнна для нашага раёна, але, вядома, можна і лепш. Лунінецкі раён разам з нашай гаспадаркай трапляе ў няўстойлівую зону земляробства. Тут праходзяць вялікія засухі, нас або залівае, або засушвае. Аднак, нягледзячы ні на што, на гэты год мы цалкам забяспечаны кармавой базай».

Дарэчы, гаспадарка была адзначана на раённых і абласных «Дажынках». «Нам вельмі прыемна, што нас заўважылі. Прадпрыемства «Гомсельмаш» падарыла нашай гаспадарцы новы камбайн! — падзяліўся Мікалай Шэўчык. — А на раённых «Дажынках» наша сельгаспрадпрыемства атрымала дыплом трэцяй ступені».

Гаворачы аб вытворчасці мясной прадукцыі, Мікалай Шэўчык падкрэсліў, што галоўны акцэнт робіцца на адкорме быкоў і іх утрыманні. Фермай па дагадоўванні кіруе Ірына Коваль.

Здароўе жывёл — найважнейшы этап паспяховага вырошчвання статка. За гэтым сочыць зааветэрынарная служба. У гаспадарцы працуе галоўны ветэрынарны ўрач Юлія Кавальчук. Яна курыруе двух сваіх падначаленых: гэта ветфельчар па гінекалагічным абследаванні Сяргей Максімчык і ветфельчар Лілія Клімчук. Па ўзнаўленні статка працуюць тры аператары па штучным асемяненні жывёл.

### Ісці ў нагу з часам

Адным з важных складнікаў жыцця любога прадпрыемства з'яўляецца мадэрнізацыя. «Сёння распрацоўваецца праект на 720 галоў дойнага статка плюс 280 галоў сухастою. У хуткім часе ў нас з'явяцца тры будынкі з даільна-малочным блокам. Акрамя таго, нядаўна была набыта сушылка і новае абсталяванне. Мадэрнізацыя адбылася і на машынна-трактарным парку, дзе мы абнавілі тэхніку і агрэгаты. Гаспадарка імкнецца ісці ў нагу з часам. Наша новая ферма пад чулым кіраўніцтвам Таццяны Шыйч дазваляе даіць 20 літраў малака на галаву ў суткі. Раней мы даілі не больш за 14 літраў. Павялічыць надоі на шэсць літраў — гэта добры вынік. Пад кіраўніцтвам Вольгі Жук паспяхова працуе і старая ферма на 450 галоў, якая дае 17 літраў малака на карову за суткі. Мы і далей будзем распрацоўваць новыя праекты і, па даручэнні нашага Прэзідэнта, пераходзіць на новыя тэхналогіі», — падкрэсліў Мікалай Мікалаевіч.

Гаспадарка дынамічна развіваецца, а людзі з упэўненасцю глядзяць у будучыню, і, што немалаважна, моладзь застаецца ў вёсцы. Сярэдні ўзрост спецыялістаў у КСУП «Велута» — 35 гадоў. Гэта адказныя аграномы, эканамісты, ветэрынары, заатэхнікі і прадстаўнікі іншых прафесій, без якіх работа на зямлі неймаверная. Мікалай Мікалаевіч адзначае, што ў гаспадарцы заўсёды рады маладым і ініцыятыўным. Тут створаны ўсе ўмовы, ёсць утульнае добраўпарадкаванае жыллё, добры заробак з поўным сацыяльным пакетам і выдатны калектыў, які заўсёды падтрымае ў цяжкую хвіліну.



Юрысконсульт, спецыяліст па закупках Святлана ГРЫЦКЕВІЧ і інспектар па кадрах Тамара САЦКЕВІЧ.

«Мы заўсёды рады, калі да нас прыходзяць маладыя спецыялісты, — запэўніў Мікалай Шэўчык. — Аднак дзяўчаты часцей застаюцца пасля адпрацоўкі. Калі прыходзяць маладыя хлопцы, іх часта прызываюць на тэрміновую службу. Пасля арміі, як правіла, ніхто не вяртаецца, бо хлопцы застаюцца на кантракт. Гэтай вясной, напрыкалад, да нас прыйшлі на адпрацоўку тры маладыя механікі. Папрацаваўшы трохі, іх прызвалі на службу. Сёння вядома, што ўсе трое застаюцца на кантракт. Такім чынам, на жаль, мы страцілі трох маладых спецыялістаў па прычынах, якія ад нас не залежаць».

Калектыў бухгалтэрыі. Злева направа: бухгалтары Ніна ДРАБОВІЧ, Людміла ДРАБОВІЧ, галоўны бухгалтар Алена КАХОВІЧ, бухгалтары Таццяна РАДЧАНКА, Таццяна ХЛУД.



### На мехдвары — вопытныя спецыялісты і айчынная тэхніка

Як расказаў дырэктар КСУП «Велута» Мікалай Шэўчык, у гаспадарцы маецца чатыры камбайны. «Тры камбайны цалкам ужо падрыхтаваны да наступнага сезона. Яны пастаўлены на захоўванне. Сёння завяршаецца рамонт апошняга. Таму магу смела заявіць, што мы ўжо гатовы да наступнай уборачнай кампаніі. Акрамя таго, у гаспадарцы маюцца энерганасычаныя трактары і іншая неабходная тэхніка — прычэпы, культыватары, прэсы і гэтак далей. Імпартнай тэхнікі тут няма. Мы заўсёды падтрымліваем свайго вытворцу».

**Загадчык рамонтных майстэрняў КСУП «Велута» Васіль АРЭХВА** — спецыяліст з шматгадовым вопытам. У сельскай гаспадарцы Васіль Паўлавіч з 1985 года, у КСУП «Велута» — з 2014-га. Сёння яго галоўная задача — падтрыманне сельгастэхнікі ў рабочым стане. Раней мужчына працаваў тэхнікам-механікам і займаўся дакументацыяй. «Цяпер я сачу за рамонтам, пастаўкай новых запчастак для рамонту і за тым, каб наша тэхніка своечасова выходзіла на палявыя і іншыя работы».

Па яго словах, сельскагаспадарчая тэхніка ў гаспадарцы добрая. «Пастаянна стараемся абнаўляць нашу тэхніку, старых трактароў становіцца менш, а новых — больш. Штогод атрымліваем па новым трактары, камбайне, пагрузчыку. Так, напрыклад, зусім нядаўна атрымалі новы камбайн».

Акрамя загадчыка рамонтных майстэрняў на мехдвары працуюць зваршчык, два слесары і механізатары, якія падтрымліваюць у спраўным стане замацаваную за сабой тэхніку. «Нам усім трэба зладжана працаваць, выконваць пастаўленыя задачы, даваць добрыя ўраджаі, забяспечваючы харчовую бяспеку нашай краіны», — падагульніў Васіль Арэхва.

### Сэрца сельгаспрадпрыемства — людзі

Зусім нядаўна **бухгалтар-дыспетчар КСУП «Велута» Таццяна ХЛУД** лічылася маладым спецыялістам. Дзяўчына скончыла Столінскі дзяржаўны аграрна-эканамічны каледж. «На нашу гаспадарку я прыйшла працаваць у верасні 2022 года. Першапачаткова трапіла на адпрацоўку ў іншую гаспадарку, але мне заўсёды хацелася быць бліжэй да сваіх родных. Пазнаёмілася з Мікалаем Мікалаевічам, і ён дапамог вырашыць пытанне з пераразмеркаваннем, за што яму вельмі ўдзячная. Мне адразу спадабалася тут працаваць, таму і вырашыла застацца. Я заўсёды знаходжу агульную мову і з моладдзю, і з больш дарослымі ды дасведчанымі супрацоўнікамі, так што сумаваць не даводзіцца». Дарэчы, пытанне з жыллём было вырашана практычна адразу. Таццяна жыве ў арэндным доме ў пяці хвілінах ад работы.

**Спецыяліст па ідэалагічнай рабоце, старшыня прафсаюзнага камітэта КСУП «Велута» Галіна КАЛІНОЎСКАЯ** працуе на сельгаспрадпрыемстве з 2011 года. «Наша галоўная задача — абараняць інтарэсы людзей, — адзначыла Галіна Васільеўна. — Дарэчы, сёння 100 % супрацоўнікаў прадпрыемства з'яўляюцца членамі прафсаюза. Сёлета мы ўдзельнічалі ў сямейным сельскагаспадарчым праекце «Уладар сяла». Спачатку паказалі годны вынік на раённым этапе, а затым — на абласным, які праходзіў у Іванаўскім




Спецыяліст па ідэалагічнай рабоце, старшыня прафкама Галіна КАЛІНОЎСКАЯ.

раёне. Акрамя гэтага, стараемся ўдзельнічаць ва ўсіх раённых і абласных мерапрыемствах. Рыхтуем навагоднія падарункі для нашых супрацоўнікаў і іх дзяцей, дапамагаем з пуцёўкамі на аздараўленне».

Па яе словах, уборачная кампанія і нарыхтоўка кармоў — гэта цяжкі і важны час, калі асабліва неабходна падтрымаць супрацоўнікаў: «Арганізоўваем конкурсы па перавозцы і ўборцы сельгаскультур, заахвочваем і матывуем сваіх работнікаў. Не забываем і пра нашых пенсіянераў. Запрашаем іх на розныя мерапрыемствы, віншуем па святах і дорым каштоўныя падарункі, стараемся аказаць належную ўвагу кожнаму».

### Арэнднае жыллё, годная зарплата і поўны сацпакет

Жыллёвае пытанне ў КСУП «Велута» цалкам вырашана. Маладым спецыялістам сельгаспрадпрыемства выдзяляе добраўпарадкаваны дом. «Сёння паралельна займаемся рамонтам яшчэ аднаго дома, — дадаў Мікалай Мікалаевіч. — Маладым спецыялістам мы даём цалкам абсталяванае жыллё з капітальным рамонтам. Нават, можна сказаць, з еўрарамонтам, паколькі ў доме ўсё заменена. Такім чынам, наша гаспадарка вырашае не толькі жыллёвае пытанне, але і пытанне па замацаванні моладзі».

Працягласць водпуску ў КСУП «Велута» залежыць ад характару работы і спецыяльнасці. Па словах дырэктара гаспадаркі, для галоўных спецыялістаў прадугледжана дадаткова пяць дзён да асноўнага водпуску. Калі казаць пра спецыялістаў сярэдняга звяна, то гэта дадаткова чатыры дні. Да дзяржаўных і прафесійных свят для супрацоўнікаў КСУП «Велута» прадугледжана грашовае ўзнагароджанне да дзвюх базавых велічынь, а таксама прадуктовы набор. Ёсць тут і матэрыяльная дапамога на аздараўленне.

Камунальнае сельскагаспадарчае ўнітарнае прадпрыемства «Велута» забяспечвае сваіх супрацоўнікаў не толькі добрымі ўмовамі працы, але і годнай заработнай платай. «Сярэдняя заработная плата па гаспадарцы складае 1511 беларускіх рублёў. Вядома, ёсць і больш буйныя гаспадаркі, аднак я лічу, што мы таксама не стаім на месцы і рухаемся ў гэтым напрамку. Выходзім на 40 % ад выручкі за мяса-малочную прадукцыю. Пэўную частку выручкі накіроўваем на развіццё гаспадаркі, закупку паліва і медыкаментаў, а таксама на пагашэнне крэдытаў. Падчас уборкі і нарыхтоўкі кармоў выходзім на 50 % ад выручкі. Стараемся падтрымаць нашых работнікаў, паколькі існуюць жорсткія тэрміны як па нарыхтоўцы кармоў, так і па ўборцы. Тады мы, можна сказаць, працуем у кругласутачным рэжыме, таму асабліва важна падтрымаць нашых людзей у такі складаны час», — адзначыў дырэктар гаспадаркі.

Важным складнікам работы з'яўляецца ахова працы. КСУП «Велута» забяспечвае сваіх супрацоўнікаў спецвопраткай, абуткам, пальчаткамі і ўсім неабходным.



Брыгадзір малочнатаварнай фермы № 3 Таццяна ШЫЙЧ.

### Новая ферма — новыя дасягненні

У 2020 годзе ў КСУП «Велута» была ўведзена ў эксплуатацыю адрэстаўраваная ферма. «Па сутнасці, у нас з'явілася новая сучасная ферма з даільна-малочным блокам і залай раздою, дзе ўтрымліваецца 550 галоў дойнага статка, — расказаў Мікалай Шэўчык. — Тут утрымліваюцца цяляты ад нуля да двух і ад двух да шасці месяцаў. Калектыў новай фермы складаецца з 28 чалавек. Гэта качагары, прыёмшчыкі, вартаўнікі, даглядчыкі і іншыя работнікі».

**Брыгадзір малочнатаварнай фермы № 3 Таццяна ШЫЙЧ** працуе ў КСУП «Велута» чатыры гады. «На малочнатаварнай ферме мы займаемся кармленнем, утрыманнем і надоем нашых жывёл. Таксама забяспечваем належны догляд за імі. Перамясціўшы жывёл у новыя камфортныя ўмовы, мы атрымалі дадатковы надой каля 20 літраў на галаву за суткі».

Жанчына адзначыла і згуртаваны калектыў. З такімі людзьмі — любыя задачы па плячы. Супрацоўнікі КСУП «Велута» не стаяць на месцы. Людзі развіваюцца, самарэалізоўваюцца, з кожным годам выводзячы гаспадарку на новы ўзровень, прыносячы сельгаспрадпрыемству новыя вынікі.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ, Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

УНП 200172895



МТФ-3.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Лунінецкі малочны завод» — прадпрыемства з больш чым паўвекавым вопытам і ўнікальнымі традыцыямі ў вытворчасці малака і натуральных малочных прадуктаў. Першую прадукцыю Лунінецкі малочны завод выпусціў у снежні 1969 года. Сёння масла, сухое абястлушчанае малако, сухое цэльнае малако і натуральнамалочная прадукцыя вытворчасці ААТ «Лунінецкі малочны завод» па праве карыстаюцца народнай любоўю. Іх вылучаюць натуральнасць, высокая якасць і далікатны смак. Сакрэт поспеху даволі просты. Гэта людзі, якія не складаючы рук працуюць на карысць свайго роднага прадпрыемства і краіны ў цэлым. Больш падрабязна аб тым, чым сёння жыве Лунінецкі малочны завод, а таксама аб планах на будучыню карэспандэнтам «Звязды» расказаў яго **кіраўнік Мікалай БАХАНЮК**. Але размова, вядома, пачалася са знаёмства з нашым героем.



Дырэктар Мікалай БАХАНЮК.

Мікалай Баханюк у 1988 годзе скончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі. Працоўную дзейнасць пачаў у калгасе імя Катоўскага на сваёй малой радзіме. З 1997-га працаваў на Пінскім мясакамбінаце, дзе на розных пасадах праслужыў 25 гадоў. У розны час Мікалай Мікалаевіч быў і галоўным механікам, і галоўным інжынерам, і нават дырэктарам прадпрыемства. У лютым 2023 года яму зрабілі прапанову, ад якой ён не змог адмовіцца: Мікалай Мікалаевіч узначаліў ААТ «Лунінецкі малочны завод». І першае, над чым стаў рупіцца новы дырэктар, — паляпшэнне ўмоў працы. «Да мяне сталі прыходзіць людзі з самымі рознымі просьбамі. Тады я стаў прымаць меры па паляпшэнні ўмоў працы, а таксама па аўтаматызацыі вытворчасці. У нас шчыруюць выдатныя людзі. Яны працавітыя і крэатыўныя. Мы не сядзім на месцы, заўсёды нешта вынаходзім, робім новае і для сябе, і для людзей. Для нас важна, каб чалавек прыходзіў на працу з задавальненнем», — адзначае Мікалай Баханюк.




Фота з архіва прадпрыемства.

# ЯКАСЦЬ ПРАДУКЦЫІ, АСАБЛІВЫ СМАК І НОВЫЯ ІДЭІ

**За што спажывец выбірае прадукцыю ААТ «Лунінецкі малочны завод»**

## У ПЛАНАХ — НОВАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ

Сёння ААТ «Лунінецкі малочны завод» — адно з найбольш развітых і эканамічна стабільных прадпрыемстваў Лунінецкага раёна. Завод спецыялізуецца на вытворчасці масла, сухога малака, натуральнамалочнай прадукцыі. Але не толькі гэтым адметнае прадпрыемства. ААТ «Лунінецкі малочны завод» — не проста шырокі асартымент тавараў, але і вялікія магутнасці па перапрацоўцы малака — да 300 тон за суткі. «Мы не стаім на месцы, развіваемся, плануем будаваць новы цэх для вытворчасці сухіх малочных прадуктаў. Дзякуючы гэтаму зможам перапрацоўваць да 400 тон малака за суткі. Акрамя таго, праводзім мадэрнізацыю вытворчасці, закупляем новае абсталяванне, паляпшаем умовы працы», — акцэнтаваў Мікалай Баханюк.



Галоўны тэхнолаг Наталля БАБКОВІЧ вывучае план праектавання па будаўніцтве цэха сухіх малочных прадуктаў.

Гаворачы аб будаўніцтве цэха для сушкі малочных прадуктаў, дырэктар Лунінецкага малочнага завода адзначыў, што гэта будзе новая ўнікальная вытворчасць. «Перадпраект ужо гатовы. Сам будаўнічы праект рэалізуем паралельна з пастаўкай абсталявання. У цэху будзем выпускаць чатыры новыя найменні прадукцыі. Акрамя таго, увод у эксплуатацыю новага цэха прадугледжвае з'яўленне 20 працоўных месцаў, а новыя плошчы дазволяць нам ствараць новыя прадукты».

Для таго каб узвесці новы будынак і наладзіць вытворчасць, на Лунінецкім малочным заводзе старанна вывучалі працэс вытворчасці. Ужо гатова і перадпраектнае рашэнне. Цяпер, па словах дырэктара, рыхтуецца тэхзаданне на правядзенне конкурсу па закупцы абсталявання для сушкі прадуктаў. Затым стартуе і будаўнічы праект.

## УВАГА ДА КОЖНАГА

Сёння на ААТ «Лунінецкі малочны завод» працуе 376 чалавек. Калектыў супрацоўнікаў тут даволі малады. Сярэдні ўзрост работніка — 44 гады. Прадпрыемства забяспечвае сваіх супрацоўнікаў годнай заработнай платай — каля 2800 рублёў. «Акрамя таго, для нашых людзей мы заўсёды робім дадатковыя выплаты да прафесійных і дзяржаўных свят. Таксама штогод выплачваецца 13-я заработная плата, — дадаў Мікалай Баханюк. — 20 снежня 2024 года мы адзначылі 55-гадовы юбілей. Найлепшыя супрацоўнікі прадпрыемства (а іх у нас шмат!) атрымалі граматы і каштоўныя прызы».

Не забываюць тут і пра пенсіянераў. Сёння на Лунінецкім малочным заводзе працуе 20 чалавек пенсіённага ўзросту, 49 работнікам застаецца менш як пяць гадоў да пенсіі. «Пенсіянераў, якія ўжо не працуюць у нас, мы таксама не забываем! Клапоцімся пра 120 чалавек, запрашаем іх на святы, самі прыходзім у госці. Дапамагаем нашым ветэранам матэрыяльна, а таксама дорым прадуктовыя наборы. Акрамя таго, нярэдка наведваем раённыя дамы састарэлых, дзе таксама стараемся стварыць атмасферу свята і цяпла», — адзначыў кіраўнік прадпрыемства.

Тут створаны ўсе ўмовы для камфортнай і ўдарнай працы: ёсць сталовая, медпункт, стаматалагічны кабінет. Рэгулярна арганізоўваюцца аздараўленне і санаторна-курортнае лячэнне работнікаў і іх дзяцей. У цэлым, тут створана сістэма матывацыі і падтрымкі супрацоўнікаў падраздзяленняў. «Перад намі стаіць задача зрабіць так, каб нашы людзі ішлі на працу з задавальненнем і сыходзілі адсюль з добрым настроем. Каб іх думкі былі пра тое, як можна яшчэ палепшыць дзейнасць роднага прадпрыемства», — падагульніў Мікалай Баханюк.

## СЭРЦА ПРАДПРЫЕМСТВА — ЛЮДЗІ

**Начальнік аддзела ідэалагічнай работы і аховы працы ААТ «Лунінецкі малочны завод» Аляксандр РЭБКАВЕЦ** на прадпрыемстве працуе ўжо 20 гадоў. Трапіў сюды яшчэ практыкантам. «Затым скончыў Пінскі мяса-малочны тэхнікум. Займаў розныя пасады, сярод якіх — слесар-рамонтнік, майстар цэха, інжынер па ахове працы, вядучы інжынер. Сем гадоў быў старшынёй нашага прафкама. А ў ідэалогію я трапіў у чэрвені 2024 года, — адзначыў Аляксандр Рэбкавец. — У нашым аддзеле працуюць чатыры чалавекі. Гэта сапраўдныя спецыялісты, майстры сваёй справы. У цэлым, у нас згуртаваны калектыў, з якім працуем ужо далёка не першы год».



Начальнік аддзела ідэалагічнай работы і аховы працы Аляксандр РЭБКАВЕЦ.

Па яго словах, паміж аддзелам ідэалагічнай работы і аховы працы і прафсаюзным камітэтам наладжана цеснае ўзаемадзеянне: «У нашы задачы ўваходзіць работа з людзьмі, з персаналам, з грамадскімі арганізацыямі.

Займаемся таксама падрыхтоўкай да свят і знакавых дат прадпрыемства. Актыўная работа вядзецца і падчас электаральнай кампаніі. Мы расказваем пра дасягненні нашай краіны за апошнія 30 гадоў, агітуем сваіх супрацоўнікаў зрабіць выбар на карысць моцнай і незалежнай Беларусі. Акрамя таго, на нашым прадпрыемстве дзейнічала ініцыятыўная група па зборы подпісаў у падтрымку дзеючага Прэзідэнта».

На Лунінецкім малочным заводзе падтрымліваюць сувязь з пенсіянерамі. «Мы ніколі не забываем пра нашых ветэранаў, пастаянна запрашаем іх на ўсе прафесійныя святы, заўсёды з задавальненнем дорым падарункі і прадуктовыя наборы. Таксама захвочваем людзей фінансава, праводзім экскурсіі. Пасля рамонту і мадэрнізацыі на нашым заводзе запрасілі ветэранаў працы на экскурсію. Яны былі прыемна здзіўлены, заўсёды ганарацца нашымі поспехамі», — падагульніў Аляксандр Рэбкавец.

**Начальнік участка асноўнай вытворчасці Кацярына РУСАК** працуе на прадпрыемстве з 2009 года. На Лунінецкі малочны завод дзяўчына трапіла адразу пасля заканчэння мяса-малочнага каледжа. «Свой працоўны шлях на прадпрыемстве пачала з апаратчыка вытворчасці сухіх малочных прадуктаў. Затым была майстрам САМ і ЗЦМ. З 2021 года працую ў якасці начальніка ўчастка асноўнай вытворчасці. У 2024 годзе скончыла Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт па спецыяльнасці «Інжынер-тэхнолаг». На вытворчасці ў цэху мы займаемся арганізацыяй тэхпрацэсу. Гэта значыць, усе прадукты, якія выпрацоўвае наша прадпрыемства, праходзяць праз нашы рукі. У маім падначаленні — 95 чалавек. На дадзены момант мы прымаем 285 тон малака ў змену.



Начальнік участка асноўнай вытворчасці Кацярына РУСАК.

У нас ёсць чатыры пасты прыёмкі, ёсць малако А2, якое прымаецца па асобнай лініі. Мае майстры размяркоўваюць гэтую сыравіну па ўчастках. У змену ў сярэднім выпрацоўваем 20 тон сухога абястлушчанага малака, чатыры тоны тварагу і столькі ж кефіру, разліваем 3,5 тоны смятаны. Вырабляем яшчэ і ёгурты. Усё залежыць ад заяўкі, якую дае наш камерцыйны аддзел. Рэшта сыравіны ідзе ў асноўным на масла і вытворчасць сухога абястлушчанага малака».

## ПРАЦОЎНЫЯ ДЫНАСТЫІ

Дарэчы, на ААТ «Лунінецкі малочны завод» працуюць цэлыя працоўныя дынастыі! Сярод іх — апаратчык пастэрызацыі Вольга Гусціновіч і яе сын вакуумшчык Андрэй Гусціновіч. Галоўны механік Фёдар Максімовіч — не толькі карміцель у сям'і, але і шчаслівы бацька. На Лунінецкім малочным заводзе ён працуе разам са сваім сынам Андрэем — аператарам кацельні і яго жонкай Святланай — апаратчыкам вытворчасці сухіх малочных прадуктаў.

З адной з працоўных сем'яў нам удалося пазнаёміцца. **Апаратчык упарвання Сяргей ГРЫНЕВІЧ** працуе на прадпрыемстве больш за 20 гадоў. Спачатку мужчына працаўладкаваўся сам, а затым прывёў свайго брата Віктара. Праз некаторы час Сяргей ажаніўся. Яго другая палавінка Таццяна таксама працуе на заводзе. «За час працы шмат што змянілася не толькі ў родным цэху, але і на прадпрыемстве ў цэлым. Пачынаў звычайным грузчыкам, а прыкладна праз 3-4 гады мне прапанавалі памяняць пасаду. На месцы навучылі ўсяму неабходнаму. З тых часоў і працую апаратчыкам упарвання на ўстаноўцы. Мой родны брат працаўладкаваўся сюды пазней. І ён таксама пачынаў грузчыкам. Потым, праз пэўны час, і яму прапанавалі стаць апаратчыкам упарвання. І сёння мы працуем на адным абсталяванні, у адным цэху. Мая жонка працавала ў сферы культуры. На нашым прадпрыемстве ёй прапанавалі годную заработную плату і добрую пасаду. З тых часоў мы і працуем разам на карысць нашага роднага прадпрыемства».



Сямейная пара ГРЫНЕВІЧАЎ разам працуе на прадпрыемстве. Сяргей і Таццяна — апаратчыкі ўпарвання.



Маслаі Яна ГОРГУН, Вольга ГУСЦІНОВІЧ, Таццяна АЛЬЦЫВАНОВІЧ, Ларыса СОБАЛЬ.



Майстар натуральнамалочнай і кісламалочнай прадукцыі Валянціна ЯФІМАВА.



Апаратчык пастэрызацыі Наталля ТРУХАНОВІЧ пастэрызуе вяршкі на масла.



Апаратчыкі пастэрызацыі Тамара БОГДАН і Наталля ІВАШКА за працай.

## МАДЭРНІЗАЦЫЯ ВЫТВОРЧАСЦІ

Прадпрыемства імкнецца ісці ў нагу з часам. Тут вырабляюць здаровую і якасную прадукцыю. Многія найменні прадукцыі Лунінецкага малочнага завода адзначаюцца знакавымі ўзнагародамі. «За апошнія гады праведзена вялікая работа па мадэрнізацыі прадпрыемства, што дазволіла не толькі павялічыць аб'ёмы вытворчасці, але і пачаць выпуск унікальнай серыі прадукцыі пад гандлёвай маркай «Асаблівае». Набыта тэхналагічная лінія фасоўкі сухіх малочных прадуктаў «Бестром-420». Мадэрнізаваны ўчастак па вытворчасці масла, што дазволіла павялічыць аб'ёмы выпуску прадукту, пашырыць асартымент і дыверсіфікаваць рынкі збыту. У лютым 2019-га запушчана ў эксплуатацыю аўтаматызаваная лінія Milking прадукцыйнасцю 5 тон у суткі з CIP-мыйкай для выпуску тварагу традыцыйнага класічнага. У выніку яго вытворчасць вырасла ў тры разы, а таксама тавар расфасоўваецца ва ўпакоўку розных відаў. У 2019-м завершана мадэрнізацыя лініі натуральнамалочнай прадукцыі з устаноўкай размеркавальнага грэбеня для ёмістасцяў кісламалочных вырабаў, дзякуючы чаму іх якасць вырасла па мікрабіялагічных паказчыках. Запушчаны ў эксплуатацыю новыя рэзервуары для захоўвання сырога малака, якія павялічылі ўмяшчальнасць гэтай сыравіны ўдвая», — падкрэсліў дырэктар ААТ «Лунінецкі малочны завод».

У 2019 годзе была праведзена мадэрнізацыя ўчастка па вытворчасці ёгуртаў. Дзякуючы гэтаму на прылаўках з'явіліся ёгурты з харчасмакавымі кампанентамі «Яблык-банан-мюслі», «Лясныя ягады», «Манга», крэм сметанкова-тварожны «Мара» з водарам ванілі, якія карыстаюцца вялікім попытам у спажыўцоў. З 2020-га вырабляюцца пітныя ёгурты з масавай доляй тлушчу 1,8 і 2,2 працэнта — «Груша-ваніль», «Лімон-лайм», «Суніцы», «Ківі-агрэст».

«Праз год увялі ў эксплуатацыю халадзільны склад умяшчальнасцю 600 тон. Пачалі выпуск сухіх сумесяў для малочнага марожанага з водарам ванілі. А ў 2023-м — масла салодкасметанковага з пажытнікам, што дадае прадукту асаблівы пікантны смак і водар грэцкага арэха. У гэтым жа годзе асвоены выпуск сумесяў для замарожаных дэсертаў. Пачалі вытворчасць сухога малочнага прадукту, прызначанага для кармлення жывёл. У 2024-м прадпрыемства выпусціла тры навінкі ёгуртаў А2 «Асаблівы»: «Лімон-чыа», «Журавіны», «Яблык са смакам карамелі», — падкрэсліў Мікалай Мікалаевіч.

Па яго словах, сёння на прадпрыемстве выпускаецца каля 300 тон масла, 83 працэнты якога ідзе на экспарт: «У цэлым, доля экспарту ўсёй прадукцыі, якая выпускаецца прадпрыемствам, складае каля 87 працэнтаў. Нашы тавары паступаюць у Расію, Казахстан, Узбекістан, Азербайджан, Грузію, Арменію. Мы сталі вядомыя і на кітайскім рынку. Акрамя таго, у канцы года прадукцыя вытворчасці ўпершыню адправілася на Кубу. Гэта сухое цэльнае малако ў аб'ёме 100 тон. Спадзяёмся, што, калі кубінцы пакаштуюць наша малако, зможам выйсці на новы ўзровень супрацоўніцтва, а таксама з'явяцца новыя запыты».

ААТ «Лунінецкі малочны завод» выпускае 300 тон масла, 600 тон сухога абястлушчанага малака, 800 тон натуральнамалочнай прадукцыі штомесяц. «Сюды ўваходзіць пітное малако, кефір, тварог, масла, ёгурты. Гэта асноўны наш кірунак. І змяншаць абароты не збіраемся», — падкрэсліў кіраўнік прадпрыемства.

## КАНТРОЛЬ ЯКАСЦІ І БЯСПЕКА

Кантролю якасці на ААТ «Лунінецкі малочны завод» удзяляецца вялікая ўвага. Яно і нядзіўна — сёння спажывец патрабуе здаровага ды якаснага прадукту. На дадзеным прадпрыемстве функцыянуе акрэдытаваная лабараторыя, якую ўзначальвае Іна Шостыр. Туды мы і завіталі.

Вось ужо тры гады на ААТ «Лунінецкі малочны завод» працуе **кантралёр харчовай прадукцыі Крысціна АЎЧАРУК.** Дзяўчына скончыла Слуцкі дзяржаўны каледж, пасля чаго трапіла на прадпрыемства ў якасці маладога спецыяліста: «Я кантралюю выпуск гатовай прадукцыі, адказваю за маркіроўку і ўпакоўку, а таксама за якасць прадуктаў, што выпускаюцца на нашым заводзе. У кожнага з работнікаў лабараторыі ёсць свой асобны ўчастак. Хтосьці займаецца малаком, хтосьці — маслам і гэтак далей. Прыйшла сюды як малады спецыяліст, а пасля заканчэння адпрацоўкі па размеркаванні вырашыла застацца. Тут выдатны калектыў, які заўсёды дапаможа ў цяжкую хвіліну, дастойная заработная плата і, што немалаважна, ёсць магчымасць кар'ернага росту. Канкрэтна ў лабараторыі я працую менш за год. Да гэтага працавала ў кісламалочным цэху. Асабліва прыемна, што на нашым прадпрыемстве добра ставяцца да моладзі. Акрамя таго, тут створаны ўсе ўмовы для камфортнай працы».



Вядучы спецыяліст Віталь РЫЛАЧ гарантуе бяспеку прадпрыемства, а таксама займаецца добраўпарадкоўваннем яго тэрыторыі.

**Вядучы спецыяліст Віталь РЫЛАЧ** працуе на прадпрыемстве з 2023 года. Да гэтага мужчына 27 гадоў адпрацаваў у органах унутраных спраў, перад сыходам на пенсію быў начальнікам аддзела ўнутраных спраў Лунінецкага райвыканкама: «Пасля сыходу на заслужаны адпачынак працаўладкаваўся на ААТ «Лунінецкі малочны завод», каб працягнуць працаваць на карысць нашай роднай Беларусі. У мае службовыя абавязкі ўваходзіць забеспячэнне кантрольна-прапускнога і кантрольна-аб'ектавага рэжыму, а таксама забеспячэнне харчовай бяспекі прадпрыемства. У маім падначаленні восем работнікаў, якія займаюцца вырашэннем гаспадарчых пытанняў на тэрыторыі завода. Вялікая работа вядзецца і па добраўпарадкаванні нашай тэрыторыі. У гэтым вельмі дапамагаюць усе работнікі прадпрыемства. Нашы людзі працавітыя, любяць парадак. Кожны на сваім месцы, як і наш дырэктар, адсюль і такая прыгажосць».



Кантралёры харчовай прадукцыі Наталля ГУСЦІНОВІЧ, Крысціна АЎЧАРУК, Святлана КАЧАНОЎСКАЯ вызначаюць масавую долю тлушчу ў цэхавай хімічнай лабараторыі.

Такім чынам, калі кожны на сваім месцы працуе адказна, самааддана і з любоўю, атрымліваюцца годныя вынікі. І калектыву ААТ «Лунінецкі малочны завод» такая схема работы і поспеху добра знаёмая. Тут клапоцяцца аб людзях, падтрымліваюць усе іх добрыя пачынанні, бо ў цэнтры ўвагі на прадпрыемстве заўсёды застаецца чалавек.

УНП 200106617

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Лізаветы ГОЛАД.**

## ААТ «Вулькаўскі світанак»:

# БЯСКОНЦЫ ПОШУК МАГЧЫМАСЦЯЎ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ

### Як справы ў адной з найлепшых гаспадарак на Палессі

ААТ «Вулькаўскі світанак», дзякуючы якому Вулька-2 атрымала статус аграгарадка, па праве лічыцца флагманам аграпрамысловага комплексу Лунінецкага раёна. У 2024 годзе гаспадарка адзначыла **75-гадовы юбілей.** Як за ўвесь гэты час тут удалося не толькі захаваць, але і прымножыць багацце роднай зямлі, як тут працуюць людзі і з якімі вынікамі прадпрыемства ўвайшло ў новы 2025 год?


Дырэктар Уладзімір СОЦ.

## ПАД ДОБРЫМ КІРАЎНІЦТВАМ

Дырэктар прадпрыемства — карэнны жыхар Вулькі-2. З дзяцінства ён бачыў работу калгаса, у якім бацька быў кладаўшчыком, а маці — жывёлаводам. Менавіта па гэтай прычыне Уладзімір Іванавіч у 17 гадоў свой шлях абраў без ваганняў — праца на зямлі. Пачынаў з трактарыста на збожжатоку, потым стаў памочнікам загадчыка жывёлагадоўчага комплексу, загадчыкам МТК, галоўным заатэхнікам гаспадаркі, а з 2006 года — на пасадзе дырэктара. Кіраўнік ён строгі, але справядлівы, адзначаюць работнікі гаспадаркі.

— З працай на зямлі справіцца толькі добрасумленны чалавек, які любіць сельскую гаспадарку. А яшчэ важна быць праўдзівым. Калі зрабіў памылку, лепш прыйсці і прызнацца. Часта дарую, асабліва калі гэта адзінкавы выпадак. Да людзей трэба ставіцца па-чалавечы. Аднак калі парушэнні становяцца сістэмнымі, то запрашаю кіраўніка падраздзялення, абмяркоўваю гэта з ім і прымаю адпаведнае рашэнне, — падзяліўся Уладзімір Соц.

Заслугі дырэктара гаспадаркі адзначаны важкімі ўзнагародамі. Ён тройчы станавіўся найлепшым кіраўніком сельскагаспадарчага прадпрыемства Брэсцкай вобласці, з 2009 года — старшыня Лунінецкага аграпрамысловага саюза. А ў лістападзе 2024 года ўказам Прэзідэнта ўзнагароджаны ганаровым медалём «За працоўныя заслугі».

Важнай часткай свайго жыцця Уладзімір Соц лічыць і палітычную дзейнасць. Ён дэпутат мясцовага, Лунінецкага раённага і Брэсцкага абласнога Саветаў дэпутатаў, таксама выбіраўся дэлегатам IV, V і VI Усебеларускіх народных сходаў.

### Заслужаныя працаўнікі

Кіроўца аўтамабіля **Андрэй ГАРАГЛЯД.**
Трактарыст-машыніст **Мікалай КАВАЛЬЧУК.**
Трактарыст-машыніст **Фёдар ЮРЦЭВІЧ.**
Загадчык цэнтральнага склада **Вольга НЕЎДАХ.**
Трактарыст-машыніст **Раман РАКОВІЧ.**
Трактарыст-машыніст **Міхаіл ГРУДЗЬКО.**
Лабарант хімічнага аналізу **Вольга ЯРАХОВІЧ.**
Тэхнік-нарміроўшчык **Сцяпан КНЫРЭВІЧ.**
Кіроўца аўтамабіля **Мікалай ЕВІЧ.**
Токар **Мікалай ВАНЮК.**
Вартаўнік **Міхаіл МАРДУХАЙ.**

## ВЕХІ ГІСТОРЫІ

Гаспадарка пачала працаваць 4 верасня 1949 года. Тады на сходзе жыхароў вёскі Вулька-2 было прынята рашэнне стварыць сельгасарцель імя Чапаева. Аднак, нягледзячы на масавую калектывізацыю, у калгас уступілі далёка не ўсе: з 590 жыхароў працаздольнага ўзросту толькі 90 аддалі ў агульнае карыстанне свае жывёлу і інвентар. У пачатку 1950-х працаваць на зямлі было нялёгка. Механізацыя адсутнічала: у палескай глыбінцы не было ні рухавікоў, ні лакамабіляў, ні аўтамашын для апрацоўкі зямлі, якой у карыстанні гаспадаркі налічвалася 620 гектараў. Адсутнічала нават электрычнасць.

З цягам часу сітуацыя палепшылася, сталі закупляць неабходную тэхніку. Аднак чакалі глабальныя перамены: праз 10 гадоў пасля ўтварэння калгас імя Чапаева аб'ядналі з калгасам «Чырвоны Кастрычнік». Але аб'яднаная гаспадарка праіснавала нядоўга — ужо ў 1965 годзе яны раздзяліліся. Пасля гэтага калгас з цэнтрам у вёсцы Вулька-2 атрымаў назву «Світанак».

Вялікі адбітак на гаспадарку ў свой час наклала Чарнобыльская катастрофа, пасля якой вёска Вулька-2 набыла статус населенага пункта з правам на адсяленне. Вядома, хтосьці з'ехаў, але большасць усё ж засталася ў родных мясцінах. Асаблівай увагі ў той час патрабавалі сельгасугоддзі з павышаным утрыманнем радыенуклідаў (на сёння гэтыя землі займаюць 461 гектар). Па рэкамендацыі навукоўцаў яны аддадзены пад кармавыя шматгадовыя травы. Пры гэтым вядзецца найстражэйшы кантроль за ўтрыманнем радыенуклідаў у малочнай прадукцыі як у лабараторыі самой гаспадаркі, так і на перапрацоўчых прадпрыемствах.

Нялёгкімі былі і 1990-я гады пасля распаду СССР. «Я дванаццаты кіраўнік гэтай гаспадаркі. Мае папярэднікі рабілі ўсё магчымае, каб захаваць «Вулькаўскі світанак» нават у вельмі цяжкія часы», — падзяліўся **дырэктар Уладзімір СОЦ.** Каб не быць галаслоўным, Уладзімір Іванавіч дастаў запісную кніжку тых гадоў і прывёў статыстычныя даныя 1990-х. У параўнанні з сённяшнімі яны ўражваюць.

— У 1995 годзе пагалоўе складала 3400 галоў, а сёння — 7387. Сярэдні надой на карову тады быў 1996 кілаграмаў, цяпер жа — больш за 7890. Цікава, што ў 1995 годзе прададзена за год усяго 1494 тоны малака ў заліковай вазе, а ў мінулым годзе гэтая лічба перавысіла 19 600 тон, — адзначыў ён.


Самая вялікая ферма — МТФ «Доўгае».


Намеснік дырэктара па жывёлагадоўлі Сяргей ПАЎЛОВІЧ.


Аператары машыннага даення Вольга ВЕРАС і Галіна ЧАРНЯКОВІЧ на вячэрняй дойцы.


Малочны блок на новай ферме.

## НА ПРАСТОРАХ ГАСПАДАРКІ

Сёння «Вулькаўскі світанак» — шматгаліновая гаспадарка, якая спецыялізуецца на вытворчасці малака, мяса, збожжа, бульбы, кармоў. У яе складзе — пяць ферм: тры малочнатаварныя і дзве таварныя. Самая вялікая — МТФ «Доўгае», а самая новая — МТФ «Любачын».

— У 2019 годзе да нас далучылі стратнае КСУП «Азярніца». Характэрна, што гэта не толькі не адбілася негатыўна на нашай эканоміцы, але і дало добрыя магчымасці для далейшага развіцця. На тэрыторыі той гаспадаркі мы літаральна з нуля ўзвялі новую ферму, — распавёў Уладзімір Іванавіч. — Будаўніцтва доўжылася каля двух гадоў. У выніку атрымалася ферма закрытага тыпу. Там ёсць два кароўнікі, малочна-даільны блок, цэх раздою, цялятнік на 167 галоў, два цёлачнікі, склад захоўвання камбікорму, траншэі для кармоў.

Кошт гэтай фермы склаў каля 21 млн 600 тыс. рублёў, што па мерках аб'екта такога маштабу даволі бюджэтна. У чым жа сакрэт?

— Многае рабілі сваімі сіламі, а не наймалі іншыя арганізацыі. Так сабекошт і памяншаўся, — падзяліўся дырэктар ААТ. — Больш за тое, мы 99 працэнтаў усіх работ, якія звязаны з сельскай гаспадаркай, выконваем самі. Сярод іх — унясенне ўгнаенняў і вапнаванне глебы. Нядаўна купілі экскаватар для меліярацыйных работ.

Сёння МТФ «Любачын» ужо запоўнена на 75 %. А ўсе астатнія даюць стабільна добрыя вынікі. За малако, прывагі, утрыманне і кармленне жывёлы ў «Вулькаўскім світанку» адказвае **намеснік дырэктара па жывёлагадоўлі Сяргей ПАЎЛОВІЧ,** які працуе ў гаспадарцы з 1994 года. Сам ён, дарэчы, з аграрнай дынастыі (бацька быў трактарыстам, а мама — паляводам). Жонка Сяргея Іванавіча, Наталля, таксама працуе ў гаспадарцы: яна бухгалтар.

— Мой працоўны дзень пачынаецца зімой у 7 раніцы з планёркі, а летам — у 6.30. Графік ненармаваны. Усё залежыць ад розных фактараў. У мае абавязкі ўваходзіць адказнасць за ўсю жывёлагадоўлю. Наша гаспадарка самая буйная ў раёне па колькасці зямель, па пагалоўі і нават па кадрах. Так, толькі маіх падначаленых — 130 чалавек. Большасць добрасумленныя і працавітыя, — адзначыў Сяргей Паўловіч.


Заатэхнік-селекцыянер Тамара ЯРАХОВІЧ вядзе базу буйной рагатай жывёлы.

Агульная плошча зямель гаспадаркі складае больш за 10 тысяч гектараў. Землі раскіданыя, нізкабальныя, і для іх апрацоўкі трэба прыкладаць шмат намаганняў. Аднак, нягледзячы на гэта, дынаміка заўсёды станоўчая. Пры апрацоўцы зямель выкарыстоўваецца сучасная тэхніка, якой гаспадарка забяспечана на ўсе 100 %. Немалаважны і правільны навуковы падыход. Па словах **намесніка дырэктара па раслінаводстве Сяргея БОГУША**, трэба рацыянальна выкарыстоўваць ворныя землі.

— Асноўнае месца ў структуры займаюць збожжавыя культуры. Найбольшая доля ў складзе азімых збожжавых адведзена пад жыта. Гэта тлумачыцца не толькі якаснымі характарыстыкамі збожжа, але і тым, што збажына ачышчае глебу ад шкоднікаў і пустазелля, — адзначыў Сяргей Баляслававіч.

А яшчэ важна выкарыстоўваць якасны насенны матэрыял.

— Мы выпрацоўваем элітнае насенне азімага рапсу, збожжавых культур і бульбы. Да таго ж штогод закупляем насенне разнастайных культур на суму каля 700 тысяч рублёў, — падзяліўся намеснік дырэктара па раслінаводстве.


Адкрыццё новай МТФ «Любачын».


Падчас тэхагляду.

## ПРАЦА Ў ЗАДАВАЛЬНЕННЕ

Вядома, самы каштоўны рэсурс гаспадаркі — людзі. Сёння тут працуе 357 чалавек. Па словах **галоўнага спецыяліста па ідэалагічнай рабоце Галіны СОЦ,** на прадпрыемстве вельмі добры сацыяльны пакет з вялікай колькасцю дадатковых выплат да свят. Клапоцяцца тут і пра ветэранаў працы, якім таксама аказваецца розная дапамога: збожжа, транспарт, падарункі да 75-годдзя гаспадаркі і гэтак далей.

Таксама ў ААТ заўсёды рады новым матываваным кадрам. Гатовы заахвочваць і дастойнай заработнай платай, і запаветнымі ўласнымі квадратнымі метрамі.

— У цяперашні час вядзецца будаўніцтва двух домікаў. Адзін рэканструіруем, а другі будуем з нуля, — падзялілася Галіна Мікалаеўна.

Атрымаць жыллё можа любы работнік, які стаіць на чарзе. Пасля года працы ён атрымлівае магчымасць набыць у сваю ўласнасць сядзібны дом, у якім пражывае. Людзям такі падыход падабаецца, і дамы на балансе гаспадаркі доўга не затрымліваюцца.

З вялікай радасцю Галіна Соц працуе з моладдзю: сустрэчы, экскурсіі, розныя конкурсы і спаборніцтвы.

— Велізарнае шчасце — бачыць у вачах нашых людзей радасць і захапленне, калі за ўдзел у тых ці іншых спаборніцтвах яны атрымліваюць узнагароды пераможцаў. Гэта вельмі важна, каб праца і талент былі ацэнены па заслугах. Да таго ж добрыя вынікі ўзнімаюць прэстыж спецыяліста аграрнай галіны і гаспадаркі ў цэлым, — адзначыла яна.

Важнай часткай грамадскага жыцця з'яўляецца і дабрачынная дзейнасць.

— Мы апошнім часам вельмі шмат дапамагаем школам, дзіцячым садкам і цэрквам, — падкрэсліў Уладзімір Соц. — Нядаўна Вулькаўскай школе падарылі пяць валейбольных мячоў і тэнісныя ракеткі. Старшакласнікі дапамагалі нашаму калектыву рыхтавацца да спаборніцтваў па валейболе ў рамках спартакіяды. Па 3-4 гадзіны займаліся. Паставіліся яны да свайго настаўніцтва вельмі адказна: нават паехалі падтрымліваць нашых спартсменаў.

У дзіцячыя садкі Уладзіміру Іванавічу падабаецца закупляць айчынныя цацкі. Як сапраўдны палешук, аддае перавагу сугучнай марцы «Палессе», а як захоплены аграрый, апроч класічных машынак і лялек, бярэ ў тым ліку і мініяцюрную сельскагаспадарчую тэхніку. Так бы мовіць, рыхтуе кадры «з пялюшак».

— Вулькаўскай школе мы таксама купілі два тэлевізары ў класы, стэнды і шмат іншага. Любачынскай школе аказалі спонсарскую дапамогу ў рамонце ганка. Адным словам, імкнёмся нікога не абдзяліць, — заключыў ён.


Каштоўныя падарункі ўручылі пенсіянерам на святкаванні 75-годдзя гаспадаркі.

**Лізавета ГОЛАД,**
**фота аўтара і з архіва прадпрыемства.**

УНП 200173067

АAТ «СПЕЦЖАЛЕЗАБЕТОН»:

# ЯК СПРАВЫ Ў ПРАМЫСЛОВАГА ГІГАНТА ПАЛЕССЯ

**ААТ «Спецжалезабетон» — передавое прадпрыемства, прадукцыя якога пад гандлёвай маркай «Мікабет» добра вядомая не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі. Да таго ж гэта найбуйнейшы вытворца жалезабетонных труб на тэрыторыі краін СНД. Мы прыехалі на прадпрыемства, каб даведацца, як удаецца трымаць такі высокі ўзровень, а таксама прыадкрыць заслону грамадскага жыцця работнікаў.**

## Пастаяннае развіццё

У далёкім 1984 годзе прадпрыемства «Спецжалезабетон» было спраектавана і пабудавана пад адзіны від вырабаў — жалезабетонныя трубы вялікага дыяметра. Магутнасць вытворчасці за год складала 60 тыс. м³. Дзіўна, бо да 2025 года аб'ём вытворчасці ў натуральным выражэнні склаў 130 тыс. м³, што перавысіла першапачатковую праектную магутнасць больш як у два разы. Як удалося гэтага дабіцца?

— У першую чаргу такі вынік атрымаўся дзякуючы нашым тром дыверсіфікацыйным кірункам. Сёння апроч жалезабетонных труб мы вырабляем таксама жалезабетонныя шпалы і элементы добраўпарадкавання. І развіваем гэтыя кірункі як у асартыменце, так і ў велічыні аб'ёмаў. А таксама за кошт інтэнсіўнасці. У нас вельмі высокая выпрацоўка. Мадэрнізацыя праведзена велізарная, — падзяліўся **дырэктар Анатоль НАСЕНЯ.**

Так, у 2024 годзе тут запусцілі новую тэхналагічную кітайскую лінію па выпуску тратуарнай пліткі.

— Гэта дазволіць павялічыць асартымент і аб'ём вытворчасці: у новай лініі крыху больш магчымасцяў. Адной з іх з'яўляецца выраб пліткі шматколернай «Коларміх». Таксама ў сувязі з гэтым з'явілася 10 высокапрадукцыйных працоўных месцаў, — дадаў Анатоль Васільевіч.

Паводле яго слоў, мадэрнізацыя на прадпрыемстве адбываецца пастаянна і гэта лінія — усяго толькі адзін з этапаў. У далейшым «Спецжалезабетон» плануе ўдзельнічаць у праграме развіцця Палесся.




Вось такая плітка ўпрыгожвае ўчастак каля абноўленага педыятрычнага аддзялення паліклінікі ў Мікашэвічах.



Добраўпарадкаванне дзіцячай пляцоўкі.

## Новыя гарызонты

ААТ «Спецжалезабетон» нездарма лічыцца экспартаарыентаваным прадпрыемствам. Так, каля 65 % прадукцыі адпраўляецца за мяжу.




— У нас высокая доля экспарту: больш за 14 млн долараў. Гэта рэкордная сума, улічваючы спецыфіку работы пад санкцыямі. У нас сышла Прыбалтыка, затое адкрыліся новыя гарызонты на абшарах Расійскай Федэрацыі. Дастаўляем прадукцыю па ўсёй яе тэрыторыі — аж да Сібіры і Інгушэціі. Таксама выходзім на новы рынак у Казахстане. Хоць раней гэта здавалася нечым фантастычным, — падзяліўся Анатоль Насеня.

Паводле яго слоў, у прадпрыемства вельмі добрая рэпутацыя на рынку, якая, нягледзячы на нявыгаднае геаграфічнае становішча, адыгрывае вырашальную ролю.

Дасягненні ААТ «Спецжалезабетон» за мінулы год былі адзначаны шэрагам значных узнагарод, сярод якіх «Экспарцёр года» ў рэспубліканскім конкурсе на найлепшыя дасягненні ў будаўнічай галіне «Будаўнічы Алімп — 2024» і «Лідар года — 2024» у IX Міжнароднай бізнес-прэміі.

## Цікавосткі грамадскага жыцця

Сёння на прадпрыемстве працуюць больш за 360 чалавек. Характэрна, што тут стапрацэнтнае замацаванне маладых кадраў. І сыходзяць людзі адсюль у асноўным на пенсію.

— Галоўнае, што нам удалося захаваць, — працаздольны калектыў. У нас вельмі шмат людзей, якія працуюць з моманту заснавання завода, цяпер яны паступова ідуць на заслужаны адпачынак. Аднак з новымі кадрамі праблем таксама няма, што дзіўна для завода на перыферыі. Моладзь застаецца і працуе з задавальненнем. Мы ў сваю чаргу забяспечваем іх сацыяльнымі гарантыямі і дастойнай заработнай платай, якая сёння адна з самых высокіх у будаўнічай галіне, — адзначыла **намеснік дырэктара па маркетынгу і ідэалагічнай рабоце Тамара МЕЛЯШКЕВІЧ.**

На прадпрыемстве функцыянуе БРСМ, Савет моладзі, таксама ў іх ёсць свой прадстаўнік у Маладзёжным парламенце пры Брэсцкім абласным Савеце дэпутатаў. Так, на чале з **памочнікам кіраўніка па карпаратыўным развіцці і рабоце з моладдзю Кацярынай ФІЦНЕР** актыўна вядзецца грамадскае жыццё і праводзяцца розныя мерапрыемствы.

— Стараемся зацікавіць. Праводзім акцыі, удзельнічаем усюды, сустракаемся ў калектывах, на месцах, цікавімся тым, што хоча моладзь, і, зыходзячы з запытаў, арганізоўваем вольны час , — патлумачыла яна.

Вядучыя актывісты прадпрыемства, сярод якіх **спецыяліст па маркетынгу, старшыня савета моладзі Анастасія ГАРАБІЕНКА і тэхнік па ахове працы, сакратар БРСМ Крысціна ПРАКАПОВІЧ** таксама рэгулярна ўдзельнічаюць у розных мерапрыемствах, у тым ліку і ў дабрачынных, напрыклад «У школу з добрым сэрцам», «Ёлка пажаданняў» і іншыя.




Актывісты прадпрыемства. Злева направа: спецыяліст па маркетынгу, старшыня савета моладзі Анастасія ГАРАБІЕНКА, вядучы спецыяліст па кіраванні інфармацыяй, карпаратыўным развіцці і справах моладзі Кацярына ФІЦНЕР, тэхнік па ахове працы, сакратар БРСМ Крысціна ПРАКАПОВІЧ.

— Стараемся дапамагаць сацыяльна-педагагічнаму цэнтру Лунінецкага раёна. Напярэдадні Новага года ездзілі туды да дзетак. Папярэдне яны зрабілі лісты-малюнкі Дзеду Марозу, дзе кожны ўказаў, якую садавіну хоча атрымаць на свята. І мы выканалі іх жаданні, — падзялілася Анастасія Гарабіенка.

Шмат мерапрыемстваў праводзіцца і для супрацоўнікаў «Спецжалезабетона» — іх усе чакаюць з нецярпеннем.

— Работнікі актыўна ўдзельнічаюць у штогадовым конкурсе па прафмайстэрстве. Зачаравальнае відовішча, ад якога немагчыма адарваць вачэй. Кожны паказвае ўменні ў сваім кірунку. Так, вадзіцелі пагрузчыка дэманструюць навыкі фігурнага ваджэння, а фармоўшчыкі на хуткасць разбіраюць шпалы, — адзначыла Крысціна Пракаповіч.

Вялікай папулярнасцю ў работнікаў карыстаецца валейбол. На прадпрыемстве ёсць свая каманда, якая нядаўна ў спаборніцтвах у Брэсце заняла прызавое месца.

— Таксама ў 2024 годзе мы ўпершыню ўзялі ўдзел у спаборніцтвах сярод санітарных дружын. Сярод дзявяці каманд занялі трэцяе месца, што для першага вопыту вельмі нядрэнны вынік, — дапоўніла сакратар БРСМ.

Для фізічнай актыўнасці работнікаў створаны максімальна камфортныя ўмовы. Прадпрыемства арандуе плавальную дарожку ў басейне і спартыўную залу ў школе № 2. Таксама тут даецца добрая медыцынская страхоўка, якая ў значнай ступені пакрывае выдаткі на абследаванне і лячэнне.

Варта адзначыць і тое, што на прадпрыемстве добра развіта настаўніцтва.

— За кожным маладым спецыялістам замацоўваецца больш вопытны работнік. А яшчэ актыўна праводзіцца прафарыентацыйная работа. Да нас прыязджаюць з экскурсіямі на прадпрыемствы вучні школ. Нашы работнікі расказваюць, як працуе вытворчасць, кансультуюць, якія вакансіі ёсць. Такім чынам мы імкнёмся вырошчваць будучыя кадры яшчэ са школы, — адзначыла Кацярына Фіцнер.



Фота з архіва прадпрыемства.

Акцыя «Ёлка жаданняў» у сацыяльна-педагагічным цэнтры Лунінецкага раёна.

**Лізавета ГОЛАД, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Лізаветы ГОЛАД.**

## «Я тут вырас»



Дырэктар Анатоль НАСЕНЯ.

Новы кіраўнік у прадпрыемства з'явіўся адносна нядаўна — у красавіку 2024 года. Анатоль Насеня скончыў Беларускую дзяржаўную сельскагаспадарчую акадэмію, а таксама бакалаўрыят і магістратуру ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

— Гэта маё першае і адзінае месца работы. Я тут вырас: прыйшоў працаваць бухгалтарам 23 гады таму і сышоў толькі ў сёмае скліканне парламента. Працаваў галоўным эканамістам і вось стаў кіраўніком, — успамінае Анатоль Васільевіч.

Таксама ён адзначыў, што досвед працы ў Палаце прадстаўнікоў вельмі дапамагае пры кіраўніцтве прадпрыемствам.

— Хто валодае інфармацыяй, той валодае светам, а я, атрымліваецца, ведаю ўсю заканадаўчую базу знутры і магу аператыўна рэагаваць на розныя сітуацыі і выклікі, а таксама выступаць з заканадаўчымі ініцыятывамі. Як сказаў Прэзідэнт, такой школы, як парламент, нідзе не пройдзеш. І гэта для кіраўніка важна, — растлумачыў Анатоль Насеня.



ААТ «СПЕЦЖАЛЕЗАБЕТОН»
225687, г. Мікашэвічы, Брэсцкая вобласць, Лунінецкі раён,
тэл.: (+3751647) 43-831, 43-887,
тэл./факс 43-806,
e-mail: info@mikabet.by
УНП 200173161

ВУЧЭБНЫ ЧАС

# ПА НОВЫЯ ВЕДЫ — У НОВУЮ ШКОЛУ!

## Найстарэйшая ўстанова адукацыі горада атрымае новы будынак



Корпус 1945 года.

Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа № 1 горада Лунінца» — месца з багатай гісторыяй і слаўнымі традыцыямі. Сярод выпускнікоў школы нямала знакамітых і паважаных людзей. Сёння яна па праве карыстаецца павагай і аўтарытэтам. Тут на якасным узроўні наладжаны ўвесь навучальны працэс, а школьнікі штогод прыносяць установе адукацыі новыя ўзнагароды. Дзякуючы сацыяльнай накіраванасці палітыкі нашай дзяржавы, падтрымцы кіраўніцтва Брэцкага аблвыканкама, Лунінецкага раёна было прынята рашэнне зрабіць прыбудову да будынка школы ў Лунінцы, каб забяспечыць выкананне ўсіх сацыяльных стандартаў, стварыць годныя ўмовы для ажыццяўлення якаснага вучэбнага працэсу. Будаўніцтва школ, дзіцячых садкоў, развіццё сацыяльнай інфраструктуры — менавіта на такую палітыку арыентуецца кіраўнік дзяржавы, бо гэта ўсё робіцца для людзей. Плануецца, што новы будынак школы адчыніць свае гасцінныя дзверы ўжо ў 2025 годзе. Больш падрабязна пра гэта карэспандэнтам «Звязды» расказала **дырэктар сярэдняй школы № 1 горада Лунінца Вольга Пятроўна КАПУСЦІЧ**.



Працэс рэканструкцыі.

«Нашы школьнікі заўсёды навучаліся ў двух асобных будынках. Першы быў узведзены ў 1945 годзе. У ім вучыліся дзеці 2—4 класаў, а першакласнікі — на базе дашкольных устаноў горада. Другі будынак, дзе вучыліся дзеці 5—11 класаў, з'явіўся ў 1960 годзе. Ён якраз і знаходзіцца на рэканструкцыі. Работы пачаліся з красавіка 2024 года, але яшчэ да гэтага мы пачалі прадумваць, як размясціць нашых дзяцей так, каб адукацыйны працэс не парушыўся. Тады было вырашана размясціць вучняў першай ступені ў іншых школах і дашкольных установах нашага горада, а вучняў 5—11 класаў пакінуць у будынку 1945 года. Нам удалося паспяхова вырашыць гэта пытанне. Дзеці паспяваюць на заняткі, своечасова заканчваюць іх. Таксама мы адкарэкціравалі рух гарадскога транспарту для таго, каб школьнікі маглі без праблем дабрацца дадому. Званкі да ўрокаў, званкі на наведванне сталовай — усё распісана, і дзеці спакойна паспяваюць на ўсе свае мерапрыемствы», — расказала Вольга Капусціч.

Па словах дырэктара, новы будынак школы разлічаны на 660 навучальных месцаў: «Усяго ў нашай школе вучыцца каля 600 чалавек. У гэтым навучальным годзе мы набралі два першыя класы. На базе ўстановы адукацыі створаны спецыяльны чыгуначны, або транспартны клас. У ім вучацца дзеці пачынаючы з восьмага класа. 310-га школьнікі маюць магчымасць выбіраць профілі. Сёняшнія адзінаццацікласнікі, напрыклад, абралі інжынерны. Ёсць таксама хімічны, біялагічны, эканамічны профілі. Мы заўсёды даём сваім вучням магчымасць выбраць той кірунак, які яны будуць вывучаць паглыблена».



Транспартны клас падчас заняткаў.

Раней у школы не было сваёй актавай залы і нават сталовай, а спартыўная зала была даволі невялікая па памерах: «Усе масавыя мерапрыемствы праводзілі альбо ў рэкрэацыях, альбо ў спартыўнай зале. Таксама ў будынку нашай школы не было сваёй сталовай, і дзеці вымушаны былі хадзіць у сталовую праз праезную частку. Цяпер у нас з'явіцца свая сталовая на 170 месцаў і актавая зала на 160 месцаў. Дарэчы, спартыўная зала была вельмі маленькая. У новым будынку школы будзе дзве новыя сучасныя спартыўныя залы, а таксама кабінет псіхалагічнай разгрузкі. Гэта вельмі важна для нашых дзяцей, бо сёння вучням сапраўды патрэбна дапамога псіхолага і сацыяльнага педагога. Якраз для гэтага і будзе створана новае памяшканне».

Вялікая ўвага — ваенна-патрыятычнаму выхаванню моладзі. «Кіраўнік па ваенна-патрыятычным выхаванні прывівае дзецям любоў да Радзімы. Разам яны наведваюць памятныя і знакавыя месцы. Штогод больш за 100 % нашых навучэнцаў выязджаюць на розныя экскурсіі. Кіраўнік па ваенна-патрыятычным выхаванні Мікалай Іванавіч Вячорка расказвае дзецям пра герояў Вялікай Айчыннай вайны, якія змагаліся за нашу Радзіму, пра генацыд беларускага народа. А гэта вельмі важна, — акцэнтавала Вольга Капусціч. — Акрамя таго, важнае месца ў жыцці школы займае спорт, а падтрыманню здаровага ладу жыцця тут удзяляецца вялікая ўвага. Для нас важна праз рэалізацыю рэспубліканскага праекта «Хакей ідзе да дзяцей» прывучыць адказна ставіцца да свайго здароўя, актыўна займацца спортам, развівацца фізічна».



Дырэктар Вольга КАПУСЦІЧ.

Ва ўстанове адукацыі згуртаваны калектыў. Вопытныя педагогі, якія адпрацавалі доўгі час, перадаюць вопыт маладым спецыялістам. А яшчэ тут дзейнічае ўзорны фальклорны ансамбль «Сунічка», які ўзначальваюць Уладзімір і Людміла Калянковічы. «І для гэтага ансамбля праекціроўшчыкі распрацавалі сваё месца — харэаграфічны клас. У ансамблі ўдзельнічаюць дзеці пачынаючы з другога класа. Яны з задавальненнем займаюцца там, прыносяць шмат дыпломаў з самых розных творчых конкурсаў. Штогод у творчых конкурсах школа заваёўвае каля 150 узнагарод. І гэта не мяжа магчымасцяў нашых таленавітых дзяцей», — падагульніла Вольга Капусціч.

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ. Фота Лізаветы ГОЛАД.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ООО «Химтэкинвест»** (организатор торгов) извещает о проведении второго повторного **аукциона** на повышение начальной цены со снижением цены первого аукциона на 20 % по реализации объектов недвижимости

| № лота | Наименование основных средств | Основные технические и эксплуатационные характеристики | |
|---|---|---|---|
| 1 | **Материальный склад** | Капитальное строение с инвентарным номером 252/С-64 общей площадью 863,2 кв. м. Назначение: Здание, специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (действующие договоры аренды). Расположено на земельном участке с кадастровым номером 241800000009000122 площадью 1,0085 га (право аренды по 31.12.2073, доля 1/2) в г. Новополоцке, ул. Промышленная, 11/1 | Начальная цена – 149 760 рублей сумма задатка – 14 976 рублей. Шаг торгов – 7 488 рублей. Цена без НДС (НДС сверху не начисляется п. 2.30.2 ст. 115 НК РБ). Данный лот находится в обременении в ипотеке и аренде |
| 2 | **Административное помещение № 1** | Капитальное строение общей площадью 467,7 кв. м с инвентарным номером 252/D-88547. Назначение: административное помещение. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 241800000006000045, площадь (га): право постоянного пользования 0,3556 в совместном пользовании, доля: 187/250. г. Новополоцк, ул. Молодёжная, 11А-1 | Начальная цена – 360 000 рублей Сумма задатка – 36 000 рублей. Шаг торгов – 18 000. Цена без НДС (НДС сверху не начисляется п. 2.30.2 ст. 115 НК РБ). Данный лот находится в обременении в ипотеке и аренде |

**Начало подачи заявок – 21 января 2025 года в 09.00.**

**Окончание подачи заявок – 31 января 2025 года в 09.00.**

Заявки на участие в торгах принимаются по адресу: 211443, Витебская обл., г. Новополоцк, ул. Молодежная, д. 11А, пом. 20. Организатор торгов – ООО «Химтэкинвест» УНП 191685984.

При необходимости ознакомиться с документами и предметом аукциона, направлять запрос на электронную почту producomob2016@mail.ru или по тел. 8 0339033614.

Начало торгов **03 февраля 2025 года в 10.00** по адресу: г. Новополоцк, ул. Молодежная, 11А, комн. 20.

Торги проводятся при наличии двух и более допущенных к торгам участников. Победителем торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.

К участию в торгах допускаются физические и юридические лица, подписавшие соглашение до начала торгов об ознакомлении с предметом торгов; зарегистрированные в журнале регистрации заявлений; предоставившие организатору торгов в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах, копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей; доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет руководитель); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Физическим лицам – предъявить паспорт, иной документ, подтверждающий личность.

Задаток перечисляется ЗАО БАНК ВТБ (БЕЛАРУСЬ) г. Минск, номер счета (IBAN): BY13SLAN 30124208400000100000, код банка (BIC): SLANBY22, УНП: 191685984, ООО «Химтэкинвест» до подачи заявки на участие в аукционе, назначение платежа: «Задаток за участие в торгах по капитальному строению с инвентарным номером (указать номер)».

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней после дня проведения торгов (физическим лицам – на карт-счет, указанный при регистрации; юридическим лицам, ИП – на расчетный счет). Участнику, выигравшему торги, задаток не возвращается и учитывается в счет оплаты предмета торгов по договору купли-продажи.

Победитель торгов (либо единственный участник, давший согласие на приобретение лота), т. е. покупатель, подписывает протокол по результатам торгов в день его проведения и в обязательном порядке возмещает затраты на организацию и проведение торгов в размере **408,24 бел. руб.** в течение 5 (пяти) календарных дней после проведения торгов, а также обязан заключить договор купли-продажи с собственником предмета торгов в течении 2 рабочих дней после проведения аукциона.

Срок оплаты предмета торгов: в соответствии с заключенным договором.

В случае если к участию в торгах был допущен только один участник, он может приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов (т. е. начальная цена + 5 % + затраты на организацию и проведение торгов) путем подтверждения приобретения в день торгов.

Продавцом предоставляется отсрочка оплаты предмета аукциона 60 дней с момента переоформления имущества на покупателя.

В случае отказа или уклонения победителя торгов (или единственного участника, давшего согласие на приобретение лота) от подписания протокола и (или) договора купли-продажи, возмещения затрат, связанных с организацией и проведением торгов, результаты торгов аннулируются, внесенный им задаток возврату не подлежит, а включается в состав имущества собственника предмета торгов.

Организатор оставляет за собой право отменить аукцион без объяснения причин не менее чем за трое суток до начала его проведения.

Организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнить у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), размеры арендной платы на землю или земельного налога, а также ознакомиться с договорами аренды имущества.

*Ранее опубликованные объявления о предыдущих торгах 21 ноября 2024 года и 28 декабря 2024 года в этом же издании.*

SINCE 1992 LEMT TRIED BY TIME & RUNNING TO EXCELLENCY

# АД НАВУКОВАЙ РАСПРАЦОЎКІ НАЙКАРАЦЕЙШЫ

## Як інавацыі ўкараняюцца ў вытворчасць

**Кіраўнік дзяржавы заўсёды патрабаваў ад навукі быць драйверам навукова-тэхнічнага развіцця краіны. Даследаванні павінны быць максімальна практыка-арыентаванымі і ўкараняцца ў вытворчасць. Паспяховым прыкладам такога вопыту з'яўляецца прадпрыемства, на якім сапраўды максімальна кароткі шлях ад навуковай распрацоўкі да прыкладнога іх выкарыстання. Гэта навукова-тэхнічны цэнтр «ЛЭМТ» БелОМА. Сувязь навукі і вытворчасці можна дакладна прасачыць на прыкладзе прадпрыемства.**

## ПРЫЯРЫТЭТ — НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БЯСПЕКА


Дырэктар Аляксей ШКАДАРЭВІЧ.

Навукова-тэхнічны цэнтр унікальны тым, што ўся прадукцыя — высокатэхналагічная, пабудаваная на новых тэхналогіях. У кампаніі працуюць доктар навук і 10 кандыдатаў навук, найлепшыя спецыялісты па оптыка-электроніцы, лазерных, інфармацыйных і камп'ютарных тэхналогіях. А ўзначальвае НТЦ «ЛЭМТ» акадэмік Нацыянальнай **акадэміі навук Беларусі, доктар фізіка-матэматычных навук, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Аляксей ШКАДАРЭВІЧ.** Аляксей Пятровіч, дарэчы, адзіны акадэмік НАН, які працуе ў сферы прамысловасці.

Паколькі ўся прадукцыя — высокатэхналагічная, выпрацоўка на аднаго працаўніка складае больш за 900 тысяч рублёў, а выручка набліжаецца да 400 мільёнаў рублёў.

Прадпрыемства арыентавана на нацыянальную бяспеку.

— Адна з асноўных задач, улічваючы сітуацыю, якая складваецца вакол нашых граніц, — пастаўляць складаную ўнікальную тэхніку для таго, каб забяспечваць нацыянальную бяспеку, — адзначае кіраўнік прадпрыемства.

«ЛЭМТ» вырабляе аптычныя прыцэлы, прыборы і сістэмы назірання, лазерна-аптычныя комплексы для розных сістэм, лазерныя дальнамеры і інш.

— Уласцівасці сучаснага свету — усесутачнасць і ўсепагоднасць. Працаваць трэба як удзень, так і ноччу, калі ўсё ажывае, акрамя таго, нельга залежаць ад кліматычных умоў. У снег, дождж, туман, дым вы павінны бачыць усё, што адбываецца. Да таго ж сённяшнія тэндэнцыі такія, што вялікую ролю адыгрываюць «бязлюдныя» тэхналогіі. Працуюць робататэхнічныя сістэмы, а чалавек знаходзіцца на бяспечнай адлегласці, — кажа Аляксей Шкадарэвіч.

## ЗА ГРАНІЦАЙ СОЧЫЦЬ ZORKI

Адной з ключавых пагроз як у свеце, так і на граніцах Беларусі, сёння з'яўляюцца беспілотныя лятальныя апараты. На прадпрыемстве распрацавана оптыка-электроннае абсталяванне, якое можа забяспечыць бяспеку ад падобных рызык.

— Беспілотнікі сёння — гэта сур'ёзны біч. Мы ўкараняем тэхналогіі, якія дазваляюць выяўляць на дальніх дыстанцыях — да пяці кіламетраў — БПЛА крайне малых памераў. Беспілотнік яшчэ не наносіць шкоды, а мы яго бачым. Для гэтага выкарыстоўваем прарыўную тэхналогію з камбінацыяй аптычнай і ЗВЧ-радыёлакацыі, — адзначае Аляксей Шкадарэвіч.

Сістэмы, распрацаваныя НТЦ «ЛЭМТ», сёння працуюць як на беларускай граніцы, так і пастаўляюцца ў многія краіны свету, напрыклад ахоўваюць палац


Мабільны комплекс ISKRA выкарыстоўваецца для кантролю за мясцовасцю і збудаваннямі.

кіраўніка Егіпта. Сярод іх камбінаваны оптыка-электронны комплекс разведкі ZORKI, які ўключае некалькі каналаў аптычнай разведкі, напрыклад цеплавізійныя і дзённыя відэакамеры, нізкаўзроўневыя камеры. У склад комплексу ўваходзіць дальнамерны канал, які таксама можа быць выраблены па розных тэхналогіях і працаваць на дыстанцыях ад 5 да 40 км. Сістэма модульная: у залежнасці ад пажаданняў заказчыка ўстанаўліваюцца розныя каналы.

Такія сістэмныя комплексы выкарыстоўваюцца для забеспячэння нацыянальнай бяспекі, у тым ліку на пагранічных пастах, для абароны крытычных аб'ектаў, выбудоўвання сістэмы бяспекі прамысловых прадпрыемстваў. Акрамя таго, у шэрагу інтэграцыйных праектаў убудаваны элементы, выробленыя на «ЛЭМТ», у прыватнасці некаторыя комплексы ўкамплектаваны сістэмамі «ZORKI O» і «ZORKI R», дзе яны выконваюць функцыі назірання і выяўлення пагроз.

Паколькі дроны могуць быць выкарыстаны ў гарадах, гэта накладвае пэўныя абмежаванні на спосабы ўздзеяння і процідзеяння. Для абароны ад такіх небяспек у многіх краінах свету разглядаюцца ў тым ліку і праекты лазернага ўзбраення. На «ЛЭМТ» пачыналі з асобных частак такіх сістэм, а з 2020 года запусцілі ў вытворчасць уласныя распрацоўкі паўнацэнных комплексаў, якія ўключаюць усе элементы.

На выстаўцы «Нацыянальная бяспека. Беларусь-2024» прадпрыемства прадставіла падобную лазерную ўстаноўку, якая базіруецца на ўласных распрацоўках. На дадзены момант створаны разнавіднасці магутнасцю 3 кВт і 10 кВт, размешчаныя на мабільным шасі. Падобная сістэма з'яўляецца лёгкай і транспартабельнай, што дазваляе выехаць на абараняльны аб'ект, забазіравацца, выканаць задачу і пры неабходнасці перамясціцца далей.

— Мы распрацоўваем сістэму, якая можа выкарыстоўвацца не толькі ў адным пункце, а з лёгкасцю перамяшчаецца, забяспечваючы магчымасць закрыць пэўны рубеж, — расказвае **начальнік бюро рэкламы і пратакола Аляксандр КАСЯНОК**.

Падобны комплекс з дапамогай радара выяўляе пэўны аб'ект, той жа БПЛА, даныя перадаюцца для цэлеўказання паваротнай платформе, дзе маецца оптыка, якая выкарыстоўваецца ў якасці прыцэла для навядзення. І на беспілотніку на працягу некалькіх хвілін утрымліваецца лазерны прамень. Гэтага дастаткова для таго, каб нанесці крытычныя пашкоджанні, дрон страціў кіраванне і ўпаў.

У якасці эксперыменту для тых жа мэт даследуецца альтэрнатыва — накіраванае электрамагнітнае выпраменьванне. Усё ж такі будучыня за сістэмамі бяспекі, якія ўяўляюць сабой комплекс з некалькіх тэхналогій, што перакрываюць недахопы адной сістэмы перавагамі іншай.

Ёсць на «ЛЭМТ» і ўнікальныя распрацоўкі для забеспячэння бяспекі найвышэйшых службовых асоб і дэлегацый. Такія сістэмы прызначаны для работы ў гарадской забудове, а асноўнымі іх задачамі з'яўляецца сканіраванне мясцовасці для выяўлення патэнцыяльных пагроз. У прыватнасці, пры наяўнасці інфармацыі пра магчымыя дыверсійныя ці іншыя супрацьзаконныя дзеянні, маюцца тэхналогіі, што дазваляюць праводзіць сканіраванне ў падобнай зоне. Гэтыя тэхналогіі адаптавання тэлевізійных і цеплавізійных камер прымяняюцца для таго, каб фіксаваць зменлівую абстаноўку і выяўляць пагрозы.

Сістэма ўкамплектавана блокам «антыснайпер», разлічаным на сканіраванне тэрыторыі для выяўлення сустрэчнага назірання. Такім чынам ёсць магчымасць адсачыць назіранне з бінокля, камеры, прыцэла і інш. Адмысловыя алгарытмы дазваляюць накіраваць лазернае выпраменьванне і па адлюстраваным сігнале не толькі вызначыць, дзе знаходзіцца патэнцыяльны назіральнік, але і характар пагрозы. Маюцца і спосабы супрацьдзеяння, у прыватнасці нелятальнае ўздзеянне і пастаноўка перашкод. Напрыклад, лазеры, якія могуць выклікаць часовае асляпленне.

Такімі тэхналогіямі валодае ўсяго некалькі краін. Беларусь стала адной з першых, хто ўдала выкарыстоўвае падобныя рашэнні.


Оптыка-электрычнае абсталяванне ZORKI ахоўвае нашы межы і важныя інфраструктурныя аб'екты.


Экспазіцыя лазернага дальнамера.


Начальнік бюро рэкламы і пратакола Аляксандр КАСЯНОК тлумачыць прынцып работы лазернага комплексу.

## ЛАБАРАТОРНЫ КАНТРОЛЬ

У аптычнай лабараторыі сабрана абсталяванне, якое дазваляе праводзіць кантроль як асобных кампанентаў для цеплавізійнай тэхнікі, так і гатовых вырабаў, якія серыйна выпускае прадпрыемства.

— Правяраем якасць аб'ектываў, робім настройкі. Каб выконваць свае функцыі, аптычны прыбор павінен быць вельмі дакладны. Як даследчыкі, мы робім юсціроўкі на спецыяльным абсталяванні, методыкі распрацоўваем самі, — расказвае **інжынер-даследчык Вячаслаў КІРЫКОВІЧ.** Ён, дарэчы, малады спецыяліст, летась закончыў БНТУ, але на прадпрыемстве працуе з трэцяга курса.


У працэсе вытворчасці валаконнага лазера.

Прадукцыя праходзіць шматэтапны шлях праверак: асобныя зборачныя элементы тэсціруюцца да ўбудоўвання ў выраб, пасля іх аддаюць на зборку, затым яшчэ адзін этап кантролю — у частцы сістэмы. Калі прыбор цалкам сабраны, ён праходзіць яшчэ адну, фінальную праверку.

Лабараторыя высокамагутных лазераў была створана на «ЛЭМТ», каб больш інтэнсіўна развіваць лазерную тэматыку, у прыватнасці распрацоўваць магутныя лазерныя сістэмы.

— У нас маецца «чысты» пакой, дзе ствараюцца высокамагутныя лазеры. Акцэнт зроблены на вырабе валаконных крыніц лазернага выпраменьвання: яны найбольш перспектыўныя і валодаюць цэлым шэрагам унікальных характарыстык у параўнанні з іншымі тыпамі лазераў, — расказвае **вядучы інжынер-даследчык Генадзь ТАТУР.**

Другая частка — памяшканне, дзе праводзяцца даследаванні па ўздзеянні лазернага выпраменьвання на розныя матэрыялы. Тут жа адбываюцца зборка і апрабаванне розных аптычных сістэм дастаўкі лазернага выпраменьвання на пэўныя аб'екты.


Тэлескоп для накіравання выпраменьвання ў лазернай лабараторыі.


Інжынер-даследчык Вячаслаў КІРЫКОВІЧ правярае параметры аб'ектываў.

# ДА ПРЫКЛАДНОГА ВЫКАРЫСТАННЯ — МАРШРУТ

## на НТЦ «ЛЭМТ»



## ПАД ПРЫЦЭЛАМ — ЯКАСЦЬ

Увесь жыццёвы цыкл — ад распрацоўкі да ўпакоўкі — прадукцыя прадпрыемства праходзіць праз аддзел кіравання якасцю. У зоне адказнасці яго спецыялістаў — сертыфікацыя, сістэмы менеджменту, метралогія, нормакантроль канструктарскай і тэхналагічнай дакументацыі, якая распрацоўваецца на прадпрыемстве, архіў канструктарскай дакументацыі.

На прадпрыемстве распрацавана, дакументальна аформлена, укаранёна і рэзультатыўна функцыянуе сістэма менеджменту якасці, якая адпавядае патрабаванням ISO 9001:2015.

Таксама на «ЛЭМТ» укаранёныя стандарты АСКД (Адзіная сістэма канструктарскай дакументацыі), АСТД (Адзіная сістэма тэхналагічнай дакументацыі), стандарты ў галіне забеспячэння адзінства вымярэнняў і шэраг іншых нарматыўных дакументаў, якія вызначаюць патрабаванні да працэсаў праектавання, распрацоўкі, вытворчасці і далейшага суправаджэння прадукцыі прадпрыемства.

Акрамя таго, дзейнічаюць «40 стандартаў арганізацыі» і інструкцыя па якасці, якія дапаўняюць патрабаванні міжнародных і дзяржаўных стандартаў.

Што датычыцца метралагічнага забеспячэння, вытворца штогод абнаўляе парк тэхналагічнага і выпрабавальнага абсталявання, сродкаў вымярэння і кантролю, бо ўкараненне найноўшых тэхналогій немагчымае ў тым ліку без забеспячэння дакладнасці вымярэння не толькі на вытворчым, але і на астатніх этапах.

Такая карпатлівая праца ў галіне якасці прыносіць свой плён на конкурсах. Неаднаразова прадпрыемства станавілася лаўрэатам Прэміі Урада Рэспублікі за дасягненні ў галіне якасці: у 2006-м, 2009-м, 2014-м і 2023-м, а таксама стала найлепшым экспарцёрам 2023-га года.

— Па маім меркаванні як кіраўніка аддзела кіравання якасцю, ключавым рэсурсам прадпрыемства з'яўляецца персанал. У нас праводзіцца і ўнутранае навучанне, і навучанне ў пабочных арганізацыях, бо павышэнне кампетэнтнасці важна і для выкарыстання ведаў на практыцы, і для перадачы іх сваім калегам, — дзеліцца **начальнік аддзела кіравання якасцю Аляксандра ДЗЕМІДОВІЧ.**



**Начальнік упраўлення аддзела кіравання якасцю Аляксандра ДЗЕМІДОВІЧ з узнагародай за дасягненні ў галіне якасці.**

Яна прыйшла на «ЛЭМТ» у 2014 годзе яшчэ студэнткай, пасля без адрыву ад вытворчасці скончыла магістратуру і ўжо некалькі гадоў узначальвае адно з важных падраздзяленняў прадпрыемства.

## З ДАПАМОГАЙ РОБАТАЎ



**Аператар аўтаматычных ліній Эдуард КАРПЕШ піша праграму зборкі платы.**

Прыкладам таго, як новыя тэхналогіі ўкараняюцца ў вытворчасць, а парой і замяняюць работу дзясяткаў людзей, з'яўляецца ўчастак аўтаматычных ліній «ЛЭМТ». Тут падрыхтавана ўводзіцца ў эксплуатацыю лінія па аўтаматычным вырабе друкаваных плат, якая дазволіць значна паскорыць працэсы. Калі раней гэтыя элементы выраблялі мантажнікі, на што трацілася шмат сродкаў і часу, то цяпер чалавечы фактар максімальна мінімізаваны, усё робяць робаты. Аператару дастаткова стварыць праграму — і платы будуць выраблены без удзелу чалавека.



**Чысцільшчык оптыкі Іна ДРОЗД падчас працы.**

## МАЛАІНВАЗІЎНАСЦЬ І ШТУЧНЫ ІНТЭЛЕКТ

Першапачаткова НТЦ «ЛЭМТ» пачынаў сваю работу ў 1992 годзе з распрацовак у галіне медыцыны, у прыватнасці лазерных тэхналогій. Сёння прадукцыя медыцынскага прызначэння трывала займае сваю нішу, у тым ліку лазерная медыцынская тэхніка.

— У медыцыне будучыня — за неінвазіўнасцю, каб пры лячэнні, нават хірургічным, умяшанне было мінімальным. Ужо сёння ўсё шырэй прымяняюцца лапараскапічныя аперацыі, калі робяцца маленькія разрэзы. Яшчэ адна сучасная тэндэнцыя — прымяненне штучнага інтэлекту, які выкарыстоўваецца для дыягностыкі, — адзначае Аляксей Шкадарэвіч.

У чэрвені мінулага года на базе прадпрыемства створана галіновая лабараторыя медыцынскай тэхнікі. Спецыялісты «ЛЭМТ» сумесна з міністэрствамі прамысловасці, аховы здароўя і адукацыі будуць праводзіць работу не толькі па распрацоўцы новых вырабаў, але і па падрыхтоўцы выкладчыкаў і студэнтаў, якія будуць вывучаць тэматыку прыбораў у медыцыне.

На прадпрыемстве частку лазернай медыцынскай тэхнікі ўдасканальваюць, распрацоўваючы яе абноўленыя версіі. Сярод такіх апарат для лазернага выдалення тканак, або папросту лазерны скальпель.

— Мы адсочваем актуальныя тэндэнцыі і імкнёмся, каб наша тэхніка ім цалкам адпавядала. Сёння яна змяншаецца ў памерах, становіцца больш кампактнай і зручнай, — расказвае **загадчык лабараторыі медыцынскай тэхнікі Дзмітрый ГОРБАЧ.**

Адзін з асноўных кірункаў, у якім працуюць спецыялісты лабараторыі, — барацьба з анкалагічнымі захворваннямі. Добра зарэкамендавала сябе прыстасаванне для фотадынамічнай тэрапіі, што працуе ў спалучэнні са спецыяльнымі хімічнымі прэпаратамі — фотасенсібілізатарамі. Гэтыя рэчывы дастаўляюцца ў пухліну і пад уздзеяннем прыбора актывіруюцца і разбураюць пухлінныя тканкі. Такія апараты маюцца ў РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава і іншых цэнтрах.

Пазней быў распрацаваны падобны апарат, які генерыруе выпраменьванне з той жа даўжынёй хвалі, але больш кампактны і з меншай магутнасцю. Яго спраектавалі для прымянення ў стаматалогіі.

Такая сістэма можа знішчаць не толькі анкалагічныя, але і іншыя біялагічныя клеткі і выкарыстоўваецца для дэзынфекцыі і зажыўлення ран. Прынцып работы той жа: наносіцца дапаможнае рэчыва, пад кантролем урача асвятляецца апаратам, у выніку чаго знішчаюцца адпаведныя клеткі. Без сенсібілізатара ўздзеянне такім апаратам здольнае стымуляваць генерацыю, знімаць болевыя адчуванні, садзейнічаць хуткаму зажыўленню.

Адзін з кірункаў лазернай медыцыны — нізкаінтэнсіўная лазерная тэрапія для рэабілітацыі і зніжэння болевых адчуванняў. Для гэтага на «ЛЭМТ» распрацаваны апарат магніта-лазернай тэрапіі для надвеннага апраменьвання крыві «Анлок». У цяперашні час завяршаюцца яго клінічныя выпрабаванні. Ён просты і бяспечны ў прымяненні і па рэкамендацыі ўрача можа выкарыстоўвацца нават у дамашніх умовах.



**Лазерная прылада для стаматалогіі.**

У канцы мінулага года прадпрыемства атрымала рэгістрацыйнае пасведчанне на фізіятэрапеўтычны апарат «Антыатыт», які выкарыстоўваецца для прагравання вушных ці насавых каналаў. Ён прымяняецца для паскарэння выздараўлення і зніжэння болевых адчуванняў.

Новай распрацоўкай з выкарыстаннем нейронных сетак з'яўляецца сістэма пярвічнай ацэнкі стану радзімых плям «Родинка».

— Меланома — адзін з самых распаўсюджаных і агрэсіўных відаў раку, які імкліва развіваецца і нярэдка прыводзіць да смерці. Урачы сыходзяцца ў меркаванні, што на пачатковай стадыі злаякаснае ўтварэнне абмежавана паверхневымі слаямі скуры і мае замкнёны аб'ём. Выдаленне яго, напрыклад выразанне скальпелем, часта прыводзіць да станоўчых вынікаў. Аднак, на жаль, часта меланому дыягнастуюць на позніх этапах, — адзначае Дзмітрый Горбач. — Праблема выяўлення раку на ранніх стадыях актуальная ва ўсім свеце, і існуюць розныя метады. Сёння назіраецца ўсплёск цікавасці да нейрасетак, яны дапамагаюць аналізаваць выявы, і ў гэтым трэндзе мы імкнёмся рэалізаваць уласную распрацоўку. Нашы спецыялісты стварылі ўстаноўку, навучылі яе пры дапамозе нейрасетак, і прыбор паказвае добрыя вынікі. Шчыльна кантактуем са спецыялістамі РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, каб пры дапамозе базы даных беларускіх пацыентаў развіць гэту сістэму і ўкараніць у нашых клініках.




**Апарат надвеннага лазернага апраменьвання крыві «АНЛОК».**




**Апарат лазерны хірургічны дыёдны.**



**Загадчык галіновай лабараторыі медыцынскай тэхнікі Дзмітрый ГОРБАЧ дэманструе лазерную прыладу для стаматалогіі.**

## МАЛАДОСЦЬ І ВОПЫТ — РАЗАМ



**Намеснік дырэктара па развіцці бізнесу — начальнік канструктарскага бюро перспектыўных распрацовак Уладзімір САФОНАЎ.**

Галоўным ключом да поспеху на «ЛЭМТ» лічаць калектыў прадпрыемства. Тут з павагай ставяцца да вопытных прафесіяналаў і рады маладым спецыялістам.

— Больш за 15 % работнікаў старэйшыя за 55 гадоў. Гэта азначае, што захоўваецца пераемнасць і ёсць у каго павучыцца. У пашпарт у нас глядзець не прынята: калі ў работніка ёсць жаданне і магчымасць працаваць, ён працуе і аддае свае вопыт і веды, навучае моладзь. Пры гэтым кожны трэці работнік маладзейшы за 30 гадоў, — дзеліцца Аляксей Шкадарэвіч.

Адметна, што моладзь мае добрыя перспектывы кар'ернага росту. Адзін з такіх прыкладаў — намеснік дырэктара па развіцці бізнесу — начальнік канструктарскага бюро перспектыўных распрацовак Уладзімір Сафонаў. На прадпрыемства ён прыйшоў у 2016 годзе тэхнікам, пасля працаваў інжынерам-даследчыкам у навукова-даследчым аддзеле, скончыў магістратуру. У 2020 годзе перайшоў на пасаду начальніка сектара цеплавізійных камбінаваных прыбораў і дальнамераў, а з красавіка 2023-га працуе намеснікам дырэктара па развіцці бізнесу.

— Наша практыка пабудавана так, што любы выраб, які мы распрацоўваем, праходзіць абавязковую апрабацыю. Апрабацыя нашай прадукцыі праводзіцца з мэтай ацэнкі яе якасці і эфектыўнасці. Вядучыя эксперты і практыкі, якія маюць значныя веды і вопыт у гэтай галіне, удзельнічаюць у дадзеным працэсе. У выпадку неабходнасці эксперты даюць рэкамендацыі па дапрацоўцы і паляпшэнні прадукцыі. Апрабацыя ажыццяўляецца на базе розных кампаній, што дае магчымасць атрымаць аб'ектыўныя вынікі і ўлічыць меркаванні практыкаў з розных сектараў. Толькі пасля таго як усе недахопы выпраўлены, мы запускаем выраб у серыю і прапануем заказчыкам — як беларускім, так і замежным, — расказвае Уладзімір Сафонаў.

Яшчэ адзін кірунак, які знаходзіцца пад увагай Уладзіміра Віктаравіча, — развіццё прадпрыемства ў сферы інфармацыйных тэхналогій. Нядаўна на прадпрыемстве арганізаваны сектар развіцця карпаратыўна-інфармацыйнай сістэмы, у планах на найбліжэйшыя гады — аўтаматызацыя кіравання прадпрыемствам.

**Алена КРАВЕЦ. Фота Лізаветы ГОЛАД.**

УНП 100230590



# Месяцавы пасяўны каляндар на 2025 год

**Месяцавы пасяўны каляндар — дзейсны працоўны інструмент садаводаў і агароднікаў.**

**Гравітацыйная сіла Месяца — адзін з фактараў, якія выклікаюць марскія прылівы і адлівы. Але сіла прыцягнення спадарожніка дзейнічае не толькі на марскую ваду, але і ўвогуле на любыя вадкасці. Ва ўсіх частках раслін вельмі шмат вільгаці, на якую ўплывае сіла прыцяжэння Месяца. Ад таго, наколькі большае ці меншае гэта ўздзеянне, залежыць развіццё раслін.**

**Калі Месяц расце, больш інтэнсіўна развіваецца надземная частка раслін. У гэты час варта саджаць агародніну, якая дае надземны ўраджай, суніцы, пладовыя дрэвы, ягадныя кусты.**

**Калі месяц меншае, сокі больш інтэнсіўна рухаюцца ў каранёвай сістэме. У такі час варта высаджваць бульбу, цыбульныя расліны, сеяць караняплоды. Можна абразаць і прывіваць расліны.**

**12 знакаў задыяка таксама ўплываюць на ўраджай. Самыя ўрадлівыя знакі — Цялец, Рак, Рыбы, Скарпіён, крыху менш — Казярог і Дзева. Непрадуктыўныя знакі — Леў і асабліва Вадаліў.**

**Расліны, пасеяныя або пасаджаныя ў той час, калі Месяц знаходзіўся ў пладавітым знаку, інтэнсіўна развіваюцца, адрозніваюцца добрым імунітэтам. Калі ж пасеў ці пасадку праводзіць у непладавітым знаку, насенне можа наогул не ўзысці, а расліны, якія ўзышлі, будуць кволымі, хваравітымі. Нават калі надвор'е здаецца прыдатным для пасеву ці высадкі расады, лепш выканаць гэтыя работы на пару дзён пазней, але ў пладавітым знаку.**

**Затое пустазелле трэба выполваць, калі Месяц знаходзіцца ў малапладавітых або непладавітых знаках.**

## Найлепшыя дні для сяўбы і пасадкі агароднінных культур

| Расліна | студзень | люты | сакавік | красавік | май | чэрвень | ліпень | жнівень | верасень | кастрычнік | лістапад | снежань |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Авёс, жыта, пшаніца, ячмень | 4-5, 12-13, 31 | 1, 8-10, 28 | 1, 8-9 | 4-5, 11-12 | 1-3, 8-11, 29-30 | 4-9, 26 | 2-6, 29-31 | 1-2, 25-30 | 7, 22-26 | 4-5, 22-23, 31 | 1-2, 28-29 | 25-26 |
| Агуркі | 4-5, 12-13, 31 | 1, 8-10, 28 | 1, 8-9 | 4-5 | 1-3, 11, 29-30 | 7-9, 26 | 4-6 | 1-2, 28-30 | 7, 24-26 | 4-5, 22-23, 31 | 1-2, 28-29 | 25-26 |
| Баклажаны | 4-5, 8-9, 12-13, 31 | 1, 4-5, 8-10, 28 | 1, 3-5, 8-9, 31 | 1, 4-5, 11-12, 28 | 1-3, 8-11, 29-30 | 4-9, 26 | 2-6, 29-31 | 1-2, 25-30 | 7, 22-26 | 4-5, 22-23, 31 | 1-2, 28-29 | 2-3, 25-26, 29-31 |
| Бульба, батат, тапінамбур | 19-21, 24-28 | 15-17, 20-24 | 15-16, 20-24 | 16-20, 27 | 13-17, 25-26 | 12-14, 21-22 | 18-20 | 14-16 | 11-12 | 8-9, 19-20 | 6, 15-17 | 13-14, 18-19 |
| Буракі сталовыя | 19-23, 26-28 | 15-20, 23-24 | 15-19, 22-24, 27-28 | 13-15, 18-20, 23-24, 27 | 13, 16-17, 20-22, 25-26 | 12-14, 17-18, 21-22 | 14-15, 18-20, 22-24 | 10-12, 14-16, 19-20 | 8, 11-12, 15-16 | 8-9, 12-14, 19-20 | 6, 9-10, 15-19 | 6-7, 13-17 |
| Буракі цукровыя | - | - | - | 25-26 | 23-24 | 19-20 | 16-18 | 12-14 | 9-10 | - | - | - |
| Гарох, фасоля, сачавіца, боб | 4-5, 8-13, 31 | 1, 4-10, 28 | 1, 3-9, 31 | 1-5, 11-12, 28-30 | 1-3, 8-11, 28-30 | 4-9, 26 | 2-6, 29-31 | 1-2, 25-30 | 7, 22-26 | 4-5, 22-23, 31 | 1-2, 28-29 | 2-4, 25-26, 29-31 |
| Гарчыца, рапс | 1, 4-7, 12-13, 31 | 1-3, 8-10, 28 | 1-3, 8-9, 30 | 4-5 | 1-3, 11, 29-30 | 7-10, 26 | 4-10 | 1-7, 28-31 | 1-4, 7, 24-30 | 1, 4-6, 22-28, 31 | 1-4, 21-25, 28-30 | 1, 21-22, 25-29 |
| Дайкон | 19-23, 26-28 | 15-20, 23-24 | 15-19, 22-24, 27-28 | 13-15, 18-20, 23-24, 27 | 13, 16-17, 20-22, 25-26 | 12-14, 17-18, 21-22 | 14-15, 18-20, 22-24 | 10-12, 14-16, 19-20 | 8, 11-12, 15-16 | 8-9, 12-14, 19-20 | 6, 9-10, 15-19 | 6-7, 13-17 |
| Кабачкі, патысоны | 4-5, 12-13, 31 | 1, 8-10, 28 | 1, 8-9 | 4-5 | 1-3, 11, 29-30 | 7-9, 26 | 4-6 | 1-2, 28-30 | 7, 24-26 | 4-5, 22-23, 31 | 1-2, 28-29 | 25-26 |
| Кавуны, дыні, гарбузы | 12-13 | 8-10 | 8-9 | 4-5, 11-12 | 1-3, 8-11, 29-30 | 4-9, 26 | 2-6, 29-31 | 1-2, 25-30 | 22-26 | 22-23 | - | - |
| Капуста белакачанная ранняя | 1, 4-5, 8-9, 12-13, 31 | 1, 4-5, 8-10, 28 | 1, 3-5, 8-9, 31 | 1, 4-5, 11-12, 28 | 1-3, 8-11, 29-30 | 4-9, 26 | 2-6, 9-10, 29-31 | 1-2, 6-7, 25-30 | 2-4, 7, 22-26, 29-30 | 1, 4-5, 22-23, 27-28, 31 | 1-2, 23-25, 28-29 | 2-3, 21-22, 25-26, 29-31 |
| Капуста белакачанная сярэдняспелая і позняя, чырвонакачанная, савойская | 1, 8-9 | 4-5 | 3-5, 31 | 1, 28 | 11 | 7-9 | 4-6, 9-10 | 1-2, 6-7, 28-30 | 2-4, 24-26, 29-30 | 1, 22-23, 27-28 | 23-25 | 2-3, 21-22, 29-31 |
| Капуста брокалі, квяцістая | 4-5, 8-9, 12-13, 31 | 1, 4-5, 8-10, 28 | 1, 3-5, 8-9, 31 | 1, 4-5, 11-12, 28 | 1-3, 8-11, 29-30 | 4-9, 26 | 2-6, 29-31 | 1-2, 25-30 | 7, 22-26 | 4-5, 22-23, 31 | 1-2, 28-29 | 2-3, 25-26, 29-31 |
| Капуста кальрабі, брусельская | 22-23 | 18-20 | 17-19 | 13-15 | 13 | - | - | - | - | - | 18-19 | 15-17 |
| Кроп, пятрушка ліставая, сільдэрэй ліставы, базілік, крэс-салата, кінза | 1, 4-5, 8-13, 31 | 1, 4-10, 28 | 1, 3-9, 31 | 1-5, 11-12, 28-30 | 1-3, 8-11, 28-30 | 4-9, 26 | 2-6, 9-10, 29-31 | 1-2, 6-7, 25-30 | 2-4, 7, 22-26, 29-30 | 1, 4-5, 22-23, 27-28, 31 | 1-2, 23-25, 28-19 | 2-4, 21-22, 25-26, 29-31 |
| Кукуруза, сланечнік | 4-5, 12-13, 31 | 1, 8-10, 28 | 1, 8-9 | 4-5, 11-12 | 1-3, 8-11, 29-30 | 4-9, 26 | 2-6, 29-31 | 1-2, 25-30 | 7, 22-26 | 4-5, 22-23, 31 | 1-2, 28-29 | 25-26 |
| Лекавыя расліны («вяршкі») | 1, 12-13 | 8-10 | 8-9 | 4-5 | 1-3, 11, 29-30 | 7-9, 26 | 4-6, 9-10 | 1-2, 6-7, 28-30 | 2-4, 24-26, 29-30 | 1, 22-23, 27-28 | 23-25 | 21-22 |
| Лекавыя расліны («карэньчыкі») | 22-23, 26-28 | 18-20, 23-24 | 17-19, 22-24 | 13-15, 18-20 | 13, 16-17 | 12-14 | 22-24 | 19-20 | 15-16 | 12-14 | 9-10, 18-19 | 6-7, 15-17 |
| Морква | 19-23 | 15-20 | 15-19, 27-28 | 13-15, 23-24, 27 | 13, 20-22, 25-26 | 17-18, 21-22 | 14-15, 18-20, 22-24 | 10-12, 14-16, 19-20 | 8, 11-12, 15-16 | 8-9, 12-14, 19-20 | 6, 9-10, 15-19 | 6-7, 13-17 |
| Салата, мангольд, шпінат | 1, 4-9, 12-13, 31 | 1-5, 8-10, 28 | 1-5, 8-9, 31 | 1, 4-5, 28 | 1-3, 11, 29-30 | 7-9, 26 | 4-6, 9-10 | 1-2, 6-7, 28-30 | 2-4, 7, 24-26, 29-30 | 1, 4-6, 22-23, 27-28, 31 | 1-4, 23-25, 28-30 | 1-3, 21-22, 25-31 |
| Памідоры, фізаліс | 4-7, 12-13, 31 | 1-3, 8-10, 28 | 1-3, 8-9, 30 | 4-5 | 1-3, 11, 29-30 | 7-10, 26 | 4-9 | 1-5, 28-31 | 1, 7, 24-29 | 4-6, 22-26, 31 | 1-4, 21-22, 28-30 | 1, 25-29 |
| Перац салодкі, горкі | 4-5, 12-13, 31 | 1, 8-10, 28 | 1, 8-9 | 4-5 | 1-3, 11, 29-30 | 7-10, 26 | 4-9 | 1-5, 28-31 | 1, 7, 24-29 | 4-5, 22-26, 31 | 1-2, 21-22, 28-29 | 25-26 |
| Пятрушка, сельдэрэй на корань, пастэрнак | 19-23, 26-28 | 15-20, 23-24 | 15-19, 22-24, 27-28 | 13-15, 18-20, 23-24, 27 | 13, 16-17, 20-22, 25-26 | 12-14, 17-18, 21-24 | 14-15, 18-24 | 10-12, 14-20 | 8, 11-16 | 8-14, 19-20 | 6-10, 15-19 | 5-7, 13-17 |
| Пятрушка, каляндра, аніс, кмен на насенне | 12-13 | 8-10 | 8-9 | 4-5 | 1-3, 29-30 | 26 | - | - | - | - | - | - |
| Радыска | 19-21, 24-28 | 15-17, 20-24 | 15-16, 20-24 | 16-20, 27 | 13-17, 25-26 | 12-14, 21-22 | 18-20 | 14-16 | 11-12 | 8-9, 19-20 | 6, 15-17 | 13-14, 18-19 |
| Рэдзька, рэпа, бручка | 19-23 | 15-20 | 15-19 | 13-15, 25-27 | 13, 23-26 | 19-22 | 16-20, 22-24 | 12-16, 19-20 | 9-12, 15-16 | 8-9, 12-14, 19-20 | 6, 9-10, 15-19 | 6-7, 13-17 |
| Травы | 4-5, 8-9, 31 | 1, 4-5, 28 | 1, 3-5, 31 | 1, 11-12, 28 | 8-11 | 4-9 | 2-6, 29-31 | 1-2, 25-30 | 7, 22-26 | 4-5, 22-23, 31 | 1-2, 28-29 | 2-3, 25-26, 29-31 |
| Фасоля | 1, 12-13 | 8-10 | 8-9 | 4-5 | 1-3, 29-30 | 26 | 9-10 | 6-7 | 2-4, 29-30 | 1, 27-28 | 23-25 | 21-22 |
| Цыбуля на пяро | 1, 6-7 | 2-3 | 1-3, 30 | - | 11 | 7-10 | 4-10 | 1-7, 28-31 | 1-4, 24-30 | 1, 6, 22-28 | 3-4, 21-25, 30 | 1, 21-22, 27-29 |
| Цыбуля на рэпку | 22-28 | 18-24 | 17-24 | 13-20, 25-26 | 13-17, 23-24 | 12-14, 19-20 | 16-18 | 12-14 | 9-10 | - | 18-19 | 15-19 |
| Цыбуля-чарнушка на сявок | 22-28 | 18-24 | 17-24 | 13-20, 27 | 13-17, 25-26 | 12-14, 21-24 | 18-22 | 14-18 | 11-14 | 8-11 | 6-8, 18-19 | 5, 15-19 |
| Часнок | 22-26 | 18-22 | 17-21 | 13-18, 25-26 | 13-15, 23-24 | 19-20 | 16-18 | 12-14 | 9-10 | - | 18-19 | 15-19 |

## Забароненыя дні для сяўбы, пасадкі і перасаджвання раслін

| студзень | люты | сакавік | красавік | май | чэрвень | ліпень | жнівень | верасень | кастрычнік | лістапад | снежань |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 14, 28–30 | 12, 27–28 | 1, 14, 28–30 | 13, 26–28 | 12, 26–28 | 11, 24–26 | 10, 23–25 | 9, 22–24 | 7, 20–22 | 7, 20–22 | 5, 19–21 | 5, 19–21 |

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** На гэтым тыдні ў вашым жыцці магчымы вельмі пазітыўныя змены, якія аднак прыйдуць вельмі маленькімі крокамі. Так што набярыцеся цярпення. У сераду выявіце асаблівую асцярожнасць: гэта неспрыяльны дзень для інтэнсіўных зносін і спроб прафесійнага росту. Прысвяціце пятніцу сустрэчам са сваякамі і сябрамі. Будзьце асцярожныя і стрыманыя, маючы зносіны з калегамі, каб не даць ім нагоды для плётак. У выхадныя дні вам проста неабходны адпачынак у адасобленым месцы.

**ЦЯЛЕЦ.** Ініцыятыва і актыўнасць могуць аказацца несвоечасовымі, асабліва ў пачатку тыдня. У сераду лепш не планаваць нічога сур'ёзнага. Калі паўстане пытанне аб звышурочнай рабоце, пажадана не адмаўляцца. Аднак і рэальна ацаніць свае магчымасці, перш чым даваць згоду, таксама нялішне. Чацвер можа прынесці важную інфармацыю, якая датычыцца асабістага жыцця. Старанна сачыце за развіццём сітуацыі — не выключана, што вас могуць падставіць. У выхадныя арганізуйце вечарынку.

**БЛІЗНЯТЫ.** Тыдзень цалкам бяспечны, роўны і спакойны. Вы зможаце шмат чаго змяніць, палепшыць і асвоіць. Можна чакаць пачатку паласы поспехаў у асабістай і прафесійнай сферах. Падарожжы і змена месца жыхарства пойдуць вам на карысць. На гэтым тыдні вельмі важна ўвесь час трымаць руку на пульсе.

**РАК.** З'явяцца задумы новых праектаў, жаданне і магчымасць іх ажыццявіць, толькі не забывайце пра разумную асцярожнасць. Каб умацаваць бюджэт і пашырыць кругагляд, бярыце ўдзел у сур'ёзных камерцыйных праектах. Невялікая мітусня пойдзе вам толькі на карысць, калі накіруеце падзеі ў пазітыўнае рэчышча. Галоўнае — не хваляваца і не апускаць рукі.

**ЛЕЎ.** Вашы энергія і напор акажуць вялікі ўплыў на ўсіх, з кім трэба будзе мець зносіны. Жаданне вылучыцца з натоўпу можа прывесці да даўняй мэты. Прапановы новай працы могуць пасыпацца на вас як з рога багацця. Пакідаць старое, звыклае месца пры гэтым не варта, але вось данесці да начальніка думку пра тое, якія вы бясцэнныя і таленавітыя, вельмі своечасова. У выхадныя займіцеся добраўпарадкаваннем дома.

**ДЗЕВА.** На гэтым тыдні вас чакаюць рамантычныя знаёмствы. Зусім нечакана можаце сустрэць свой лёс. Паспрабуйце быць сабранымі і акуратнымі, праяўляць цярпенне і разважлівасць. Толькі тады навакольныя змогуць па заслугах ацаніць вашы творчыя задумы і парывы. Уважліва пастаўцеся да нюансаў і дробязяў, якія будуць узнікаць на працягу ўсяго тыдня. Добры час для прасоўвання сваіх ідэй і дасягненняў.

**ШАЛІ.** Надыходзіць спрыяльны час для скасавання дагавораў, якія аджылі сваё, зняцця з сябе абцяжарвальных абавязацельстваў і заадно гарманізацыі навакольнай прасторы. Для прасоўвання наперад вам спатрэбяцца такія якасці, як рашучасць, дасведчанасць і прафесіяналізм. Паспрабуйце пазбягаць мітусні і верыць у найлепшае.

**СКАРПІЁН.** На гэтым тыдні вам будзе спрыяць поспех, чакайце прыемныя сюрпрызы. У панядзелак паступіць важная інфармацыя, якая дазволіць вам заняць больш выгадную пазіцыю. У аўторак магчымыя сямейныя звадкі, якія, вядома, не разбураць вашы адносіны цалкам, але запатрабуюць часу і сіл. Другая палова тыдня — выдатны час для падарожжаў.

**СТРАЛЕЦ.** На гэтым тыдні вы здолееце зрабіць шмат, хоць і не ўсё з таго, што было запланавана. У панядзелак не выключаны сутыкненні з канкурэнтамі. Камандзіроўкі і асабістыя паездкі пройдуць удала. У сераду можаце быць уцягнутыя ў канфлікт, паспрабуйце заняць нейтральную пазіцыю. У пятніцу магчымыя нечаканыя весткі ці няпрошаныя госці.

**КАЗЯРОГ.** Вам проста неабходна праявіць разважлівасць і стрыманасць у дзеяннях і словах. Пошук залатой сярэдзіны ўвогуле павінен стаць асноўным вашым заняткам у гэтыя дні. У сярэдзіне тыдня можа ўзрасці актыўнасць і з'явіцца магчымасць кіраваць сітуацыяй, якая склалася; уплываць на падзеі ў найбліжэйшай будучыні. Сустрэча з сябрамі ў пятніцу абяцае прыемныя моманты.

**ВАДАЛІЎ.** Час суму і пасіўнасці скончыўся. Наганяйце ўпушчанае, заваёўвайце новыя гарызонты. Не бойцеся работы, якая навалілася на вас, вы паспяхова справіцеся з ёй. Падумайце пра змены ў сваім доме, неабавязкова глабальныя, але істотныя. Навакольныя будуць удзячныя вам за клопат і ўвагу.

**РЫБЫ.** Надыходзіць зорная гадзіна для людзей творчых. Злучыўшы натхненне з зямнымі задачамі, вы зможаце забіць двух зайцоў адначасова, раскрыўшы свой творчы патэнцыял і ўмацаваўшы матэрыяльнае становішча. У асабістым жыцці магчымыя некаторыя ўскладненні і перашкоды. Набярыцеся цярпення.

## 18 СТУДЗЕНЯ Даты Падзеі Людзі

У краіне

**1882** год — нарадзіўся (м. Бельск Гродзенскай губерні) Іосіф Рыгоравіч Лангбард, беларускі савецкі архітэктар, педагог. У пачатку 1930-х Лангбард атрымлівае першыя буйныя замовы на будаўніцтва ў Беларусі. Першым праектам, рэалізаваным архітэктарам у Мінску, стала будаўніцтва каля 40 драўляных павільёнаў для Усебеларускай сельскагаспадарчай і прамысловай выстаўкі. Пасля гэтага яго запрашаюць да праектавання забудовы цэнтральнай часткі горада. Лангбард прапануе макеты трох будынкаў: Дома ўраду, Тэатра оперы і балету і Дома Чырвонай Арміі (сучасны Дом афіцэраў). Праект Дома ўраду быў падрыхтаваны і зацверджаны ў 1929 годзе, а з 1930 да 1934 года ён быў рэалізаваны. Перад ім быў пастаўлены помнік У. І. Леніну, распрацаваны Лангбардам разам з Ленінградскім скульптарам М. Манізерам. За гэты ансамбль Іосіф Лангбард атрымаў званне «Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР».

**1900** год — нарадзіўся (г. Мінск) Баркоўскі Віктар Іванавіч, мовазнавец, акадэмік АН СССР, доктар філалагічных навук, прафесар. Працаваў у Інстытуце мовазнаўства СССР (у 1954—1960-м — дырэктар). Даследаваў старажытнарускую пісьменнасць, гістарычную граматыку, сінтаксіс і дыялекталогію ўсходнеславянскіх моў, гісторыю айчыннага мовазнаўства. У 1930-х гадах выступаў па пытаннях рэформы беларускага правапісу. Аўтар манаграфіі «Сінтаксіс казак: Руска-беларускія паралелі», артыкулаў пра Я. Карскага і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

У свеце

**1654** год — Пераяслаўская рада (сход прадстаўнікоў украінскага народа скліканы гетманам Украіны Багданам Хмяльніцкім) выказалася за ўз'яднанне Украіны і Расіі.

**1689** год — нарадзіўся Шарль Луі дэ Мантэск'ё, французскі пісьменнік, правазнавец і філосаф. Аўтар рамана «Персідскія лісты», артыкулаў з «Энцыклапедыі, або Тлумачальнага слоўніка навук, мастацтваў і рамёстваў».



**1918** год — адкрылася першае і адзінае пасяджэнне Усерасійскага Устаноўчага сходу ў Петраградзе. Устаноўчы сход абвясціў Расію федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікай, тым самым адмовіўшыся ад манархічнай формы праўлення (пры гэтым яшчэ ў верасні 1917 года Часовы ўрад абвясціў Расію Расійскай рэспублікай), адмяніў уласнасць на зямлю, заклікаў да заключэння мірнага дагавору. Сход адмовіўся разглядаць Дэкларацыю правоў працоўнага і эксплуатуемага народа, якая надзяляла б Саветы рабочых і сялянскіх дэпутатаў дзяржаўнай уладай, тым самым спрабуючы зрабіць нелегітымнымі далейшыя дзеянні Саветаў. А таму і быў прымусова распушчаны 19 студзеня 1918 года УЦВК.


## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов
**в д. Прилепская Усяжка, ул. Подгорная (объект 67/2021),**
**д. Рудня, участок 1 (объект 155/2016)**
**и ведения личного подсобного хозяйства в д. Лужки, ул. Подгорная, 23Б**
Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области

**Организатор аукциона: Озерицко-Слободской сельский исполнительный комитет, 222215, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, д. 27, Смолевичский район, Минская область.**

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **д. Прилепская Усяжка, ул. Подгорная (объект 67/2021)** | 624883004 801000133 | 0,0937 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 – земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме)) | 25000 |
| 2 | **д. Рудня, участок 1 (объект 155/2016)** | 624883008 501000104 | 0,1498 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 – земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме)) | 15000 |
| 3 | **д. Лужки, ул. Подгорная, 23Б** | 624883005 601000210 | 0,05 | Для ведения личного подсобного хозяйства (1 02 00 – земельный участок для ведения личного подсобного хозяйства) | 5000 |

Аукцион состоится **20 февраля 2025 г. в 15.00** в Озерицко-Слободском сельском исполнительном комитете по адресу: аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Смолевичский район, Минская область, зал заседаний (тел.: 801776, 50066).

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах Государственного комитета по имуществу: **https://au.nca.by,** Минского областного исполнительного комитета: **https://info@minsk-region.gov.by,** Смолевичского райисполкома: **isp@smolevichi.gov.by.**

УНП 600046563






ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.Тыраж 12 781. Індэкс 63850. Зак. № 83.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 17 студзеня 2025 года.